Установа адукацыі
“Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр
“Зубронак”

ЗМЕНА

# “Я РОДНЫМ КРАЕМ ГАНАРУСЯ”

2015 г.

Рэкамендавана метадычным саветам НДЦ “Зубронак”
6 студзеня 2015 г., пратакол № 6

# УВОДЗІНЫ

Вельмі важнай выхаваўчай задачай для Беларусі ў сучаснай адукацыі з’яўляецца выхаванне ў дзяцей і навучэнцаў патрыятызму і грамадзянскасці, лепшых маральных якасцей. І гэта нармальная з’ява: любая дзяржава ў першую чаргу павінна клапаціцца пра такі накірунак выхавання, таму што любой дзяржаве патрэбныя адданыя ёй людзі, якія не толькі любяць той край, дзе нарадзіліся і жывуць, але і стараюцца зрабіць жыццё ў ім яшчэ лепшым, больш упарадкаваным і шчаслівым, і не горшым, чым у суседзяў.

Найбольш паспяхова гэтыя задачы могуць быць вырашаны шляхам прыцягнення  вучняў да ўдзелу ў краязнаўчай рабоце. Назіраючы за жыццём сваёй краіны, знаёмячыся з яе гісторыяй, прыродай і культурнымі асаблівасцямі, выконваючы асобныя краязнаўчыя заданні вучні вучацца па-сапраўднаму любіць сваю краіну, даражыць ёю.

Перад маладым, несфарміраваным яшчэ чалавекам паўстае пытанне: а для чаго мы жывём, дзе нашыя карані, што нас чакае ў будучыні? У пэўнай меры адказ на гэтае пытанне даў класік беларускай літаратуры Уладзімір Караткевіч: “У падзеях мінулага – нашы карані. А дрэва без карэння не можа ні існаваць, ні тым больш – прыносіць плады”. Вось чаму выхаванне нацыянальнай самасвядомасці патрэбна пачынаць з вывучэння сваёй малой радзімы, будзь то вёска, пасёлак ці горад. Каб вучні адчулі, што і іх родная зямля поўніцца талентамі, параджае герояў; што і тут стваралася гісторыя народа і краіны.

Значная частка краязнаўчай работы праходзіць праз музеі ўстаноў адукацыі, якія павінны з’яўляцца цэнтрамі грамадзянска-патрыятычнага і духоўна-маральнага выхавання моладзі.

Важнае месца ў выхаванні навучэнскай моладзі, забеспячэнні захаванасці каштоўнасцей гісторыі, культуры, прыроды, а таксама ў пашырэнні ведаў пра значныя падзеі мінуўшчыны і сучаснасці сярод дзяцей і моладзі належыць музеям устаноў адукацыі. Галоўнымі мэтамі іх стварэння з’яўляюцца выхаванне ў навучэнцаў нацыянальнай самасвядомасці, далучэнне іх да нацыянальнай і агульначалавечай спадчыны, павышэнне эфектыўнасці адукацыйнагаа працэсу. Праз удзел у стварэнні і папаўненні экспанатамі экспазіцый музея, распрацоўцы тэксту і правядзенні экскурсій вучні больш дэталёва знаёмяцца з гісторыяй і культурай сваёй краіны, жыццём людзей у ёй і, такім чынам, далучаюцца да агульнанацыянальных каштоўнасцей свайго народа, пачынаюць яшчэ больш любіць сваю краіну.

Змена “Я родным краем ганаруся” распрацавана на аснове праграмы выхавання дзяцей, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбнай і грамадскай

рабоце, Канцэпцыі бесперапыннага выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь, у адпаведнасці з інструктыўна-метадычным пісьмом Міністэрства адукацыі “Асаблівасці арганізацыі ідэялагічнай і выхаваўчай работы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі ў 2014/2015 навучальным годзе”.

Асноўным зместам змены “Я родным краем ганаруся” з’яўляецца краязнаўчая і музейная дзейнасць, яе рэалізацыя праз арганізацыю даследчай дзейнасці, удзел у рабоце часовых краязнаўчых аб’яднанняў, узаемадзеянне з партнёрамі, правядзенне фіналу конкурсу “Я родным краем ганаруся”, мерапрыемствах: акцыях, гульнях, святах, конкурсах і праектах.

Мэтай змены з’яўляецца стварэнне ўмоў для фарміравання ў падрастаючага пакалення паважлівых адносін да гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны нашай краіны, патрэбы ў захаванні і прапагандзе помнікаў гісторыі і культуры сродкамі краязнаўчай і музейнай дзейнасці.

Задачы:

сістэматызаваць і паглыбіць краязнаўчыя веды падлеткаў, падрыхтаваць іх да рэалізацыі асабістых арыгінальных краязнаўчых даследаванняў;

вывучыць гістарычныя змяненні, якія адбываюцца ў жыцці сваёй малой радзімы;

актывізаваць дзейнасць падлеткаў па ўсебаковаму вывучэнню сучаснасці і будучыні, культуры і прыроды сваёй малой радзімы;

забяспечыць удзел падлеткаў у розных формах грамадска карыснай краязнаўчай дзейнасці;

падтрымаць дзіцячы актыў, які здольны ажыццяўляць сістэматычную пошукавую, фондавую, экспазіцыйную, культурна-асветніцкую работу;

арганізаваць правядзенне фінальнага этапа конкурсу дзіцячых вучэбна-даследчых праектаў “Я родным краем ганаруся”.

# ІНФАРМАЦЫЙНАЯ КАРТА ЗМЕНЫ

| | | |
|---|---|---|
| 1. | Назва | Я родным краем ганаруся |
| 2. | Мэта | стварэнне ўмоў для фарміравання ў падрастаючага пакалення паважлівых адносін да гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны нашай краіны, патрэбы ў захаванні і прапагандзе помнікаў гісторыі і культуры сродкамі краязнаўчай і музейнай дзейнасці |
| 3. | Задачы | сістэматызаваць і паглыбіць краязнаўчыя веды падлеткаў, падрыхтаваць іх да рэалізацыі асабістых арыгінальных краязнаўчых даследаванняў;<br>вывучыць гістарычныя змяненні, якія адбываюцца ў жыцці сваёй малой радзімы;<br>актывізаваць дзейнасць падлеткаў па ўсебаковаму вывучэнню сучаснасці і будучыні, культуры і прыроды сваёй малой радзімы;<br>забяспечыць удзел падлеткаў у розных формах грамадска карыснай краязнаўчай дзейнасці;<br>падтрымаць дзіцячы актыў, які здольны ажыццяўляць сістэматычную пошукавую, фондавую, экспазіцыйную, культурна-асветніцкую работу;<br>арганізаваць правядзенне фінальнага этапа конкурсу дзіцячых вучэбна-даследчых праектаў “Я родным краем ганаруся” |
| 4. | Удзельнікі | Вучні, якія дасягнулі поспехаў у вучэбнай рабоце і з’яўляюцца членамі актыву музеяў, створаных на базе ўстаноў агульная сярэдняй адукацыі і ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, а таксама рэгіянальных краязнаўчых музеяў, фіналісты конкурсу дзіцячых вучэбна-даследчых праектаў “Я родным краем ганаруся” |
| 5. | Перыяды змены | ”Мы – часцінка народа, мы – часцінка Радзімы“ **(10.01 – 12.01)**<br>“Нашы карані – наша будучае” **(13.01 – 27.01)**<br>”Табе, Беларусь, нашы праца і талент“ **(28.01 – 30.01)** |
| 6. | Партнёры | Цэнтр дасследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства, Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Музей старажытнабеларускай культуры, газета “Переходный возраст”, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў |

| | | |
|---|---|---|
| 7. | Срокі | 10 студзеня – 30 студзеня 2015 года |
| 8. | Адрасат | Дзеці старэйшага школьнага ўзросту |
| 9. | Колькасць удзельнікаў | 163 чалавекі |
| 10. | Кароткая ідэя змены | Для рэалізацыі праграмы змены прапанаваны арганізацыйна-гульнёвы праект “Музей археалогіі”. Корпус на перыяд змены пераўтвараецца ў Музей археалогіі, якім кіруе Савет музея на чале са Старшынёй савета музея. Кантралюе работу Музея археалогіі Музейны нагляд, у састаў якога ўваходзяць: старшыня савета музея, педагог-арганізатар і вядучы метадыст змены.<br>Кожны атрад на перыяд змены пераўтвараецца ў археалагічную экспедыцыю, якая праводзіць археалагічныя раскопкі.<br>Гульнёвым полем для кожнай экспедыцыі з’яўляецца археалагічны аб’ект, які складаецца з трох (па колькасці гульнявых перыядаў) культурных слаёў. Акрамя таго, пры зняцці кожнага культурнага слоя ўдзельнікі экспедыцыі будут знаходзіць адлюстраванне розных прадметаў (рэліквій), нейкім чынам звязаных з гісторыяй Беларусі. Трэба правесці даследаванне гэтых прадметаў і прадставіць у Савет музея справаздачу. |
| 11. | Плануемы вынік | набыццё падлеткамі ведаў па музеязнаўству, павышэнне цікавасці да музейнай справы;<br>фарміраванне патрыятычнага светапогляду, актыўнай грамадзянскай пазіцыі, камунікатыўнай кампетэнтнасці;<br>выхаванне пачуцця гонару да гісторыі сваёй радзімы і яе традыцый;<br>наяўнасць асноўных уменняў і навыкаў на навукова-музейнай апрацоўцы, уліку, апісанню, класіфікацыі прадметаў музейнага значэння, правядзенню экскурсій па музеі;<br>развіццё творчых здольнасцей падлеткаў у працэсе стварэння і прэзентацыі работ па профілю музея. |

# АГУЛЬНАЯ ІДЭЯ ЗМЕНЫ

У аснову змены пакладзена ідэя выхавання патрыятызму і грамадзянскасці ў падлеткаў праз арганізацыю краязнаўчай дзейнасці, рэалізацыю арганізацыйна-гульнёвага праекта "Музей археалогіі", удзел у творчых конкурсах, узаемадзеянне з партнерамі змены.

Адукацыйны кампанент змены рэалізуецца праз правядзенне факультатываў "Краязнаўства" (7-9 класы) і "Беларуская традыцыйная культура ў люстэрку мовы" (10 клас), заняткаў аб'яднання па інтарэсах "Акадэмія музеязнаўства", удзел падлеткаў у рабоце дыскусійных пляцовак, выкананне вучэбна-даследчых работ па гісторыіі НДЦ "Зубронак", сустрэчы з прадстаўнікамі Цэнтра дасследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, газеты "Переходный возраст", наведванне музеяў краіны.

Асноўным адукацыйным элементам з'яўляецца падрыхтоўка і правядзенне фінальнага этапа конкурсу дзіцячых вучэбна-даследчых праектаў "Я родным краем ганаруся".

Арганізацыйна змена дзеліцца на тры перыяды, кожны з якіх вырашае пэўныя задачы выхавання патрыятызму і грамадзянскасці.

Першы перыяд "Мы часцінка народа – мы часцінка Радзімы" вырашае задачы актыўнага ўключэння падлеткаў у рэалізацыю праграмы змены. У гэты перыяд рэалізуюцца: адкрыцце змены, старт модульных праектаў "Скарбы роднай мовы", "Легенда на кожны дзень".

Другі перыяд змены "Нашы карані – наша будучае" напраўлены на вырашэнне задач пашырэння спецыяльных ведаў падлеткаў па дзейнасці музеяў, развіццё навыкаў даследчай і грамадска-карыснай дзейнасці. Гэтыя задачы будуць вырашацца праз навучанне ў Акадэміі музеязнаўства, абарону навукова-даследчых работ у рамках конкурсу "Я родным краем ганаруся", наведванне музеяў Беларусі, удзел у конкурсе "Легенда за легендай" і ў модульным праекце "Мы – маладыя" і г.д.

Вынікова перыяд змены "Табе, Беларусь, наша праца і талент" напраўлены на падвядзенне вынікаў змены, презентацыю практычнага прымянення атрыманых ведаў. У гэты перыяд праводзяцца: адукацыйны форум "Вектар на будучыню", метады асобаснага развіцця заключнага перыяду, развітальныя агеньчыкі і г.д.

# ПРАГРАМА ФАКУЛЬТАТЫЎНЫХ ЗАНЯТКАЎ «КРАЯЗНАЎСТВА»

## ДЛЯ VIII–IX КЛАСАЎ

(распрацавана на аснове праграммы факультатыўных заняткаў «Краязнаўства» для VI–IX класаў, рэкамендаванай навукова-метадычнай установай "Нацыянальны інстытут адукацыі")

### ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Важнейшым сродкам далучэння школьнікаў да грамадзянскай культуры з'яўляецца краязнаўчая дзейнасць. Школьнае краязнаўства – гэта педагагічны працэс арганізацыі дзейнасці навучэнцаў, які звязаны з вывучэннем імі роднага краю і выкарыстаннем атрыманых ведаў на практыцы. У працэсе краязнаўчай дзейнасці ў школьнікаў назапашваецца вопыт узаемадзеяння з прыродным і сацыяльным навакольным асяроддзем. Пад «краязнаўчай дзейнасцю» вучняў маецца на ўвазе не толькі пошукавая, але і любая дзейнасць пры ўмове асэнсавання яе сувязі з пазнаннем, зберажэннем і забеспячэннем развіцця свайго краю. Школьнае краязнаўства мае шэраг напрамкаў, якія адрозніваюцца па аб'екце і прадмеце вывучэння. Суадносна з асноўнымі аб'ектамі вывучэння вылучаюць экалагічнае, эканамічнае, геаграфічнае, гістарычнае, літаратурнае, мастацвазнаўчае, а таксама комплекснае краязнаўства, якое сінтэзуе ўсе названыя напрамкі.

Дадзеная праграма арыентавана менавіта на комплекснае краязнаўства. У аснову зместу факультатыўных заняткаў пакладзены комплексны подыход, які ўлічвае як розныя бакі пазнання роднага краю, так і розныя аспекты выхавання вучняў у працэсе краязнаўчай дзейнасці.

**Мэта** факультатыўных заняткаў – фарміраванне ў навучэнцаў ведаў аб родным краі ў агульнадзяржаўным і сусветным кантэксце; выхаванне грамадскасці і патрыятызму як вызначаючых якасцей асобы.

**Задачы:**

абудзіць цікавасць да роднага краю і паглыбіць веды аб ім;

фарміраваць каштоўнасныя адносіны да матэрыяльнай, культурнай і прыроднай спадчыны народа Беларусі;

выхоўваць нацыянальнаю самасвядомасць і ўменне жыць ў полікультурным асяроддзі;

фарміраваць пошукавыя уменні;

абудзіць ў навучэнцаў імкненне да самаўдасканалення.

Праграма арыентавана на вучняў VIII–IX класаў і разлічана на 5 заняткаў. Прадугледжвае паслядоўнае пашырэнне ведаў, уменняў і навыкаў, засвоеных навучэнцамі на ўроках, а таксама атрыманне новых ведаў, не прадугледжаных школьнай праграмай.

Асноўнымі напрамкамі работы з'яўляюцца тэарэтычная падрыхтоўка, практычныя заняткі.

Тэарэтычная падрыхтоўка ўяўляе сабой лекцыі настаўнікаў, якія вядуць факультатыўныя заняткі, і самастойную працу вучняў над рэкамендаванай літаратурай.

На практычных занятках навучэнцы знаёмяцца з прыёмамі работы з літаратурай, дакументамі, фатаграфіямі і г.д., апрацоўваюць сабраны матэрыял.

Вывучэнне зместу факультатыўных заняткаў адбываецца праз зварот да гісторыі, прыроды, культуры, сацыяльнага асяроддзя роднага краю, сваёй школы, сям'і.

## ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № п/п | Тэма | Колькасць гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | усяго | тэар. | практ. |
| 1. | Краязнаўства. Гісторыя краязнаўства ў Беларусі | 1 | 0,5 | 0,5 |
| 2. | Арганізацыя краязнаўчай работы | 1 | 1 | - |
| 3. | Насельніцтва краю | 1 | 0,5 | 0,5 |
| 4. | Мінулае нашага краю. Наш край у гады Вялікай Айчыннай вайны | 1 | 1 | - |
| 5. | Працоўныя будні краю. | 1 | 1 | - |
| | УСЯГО | 5 | 4 | 1 |

## ЗМЕСТ ПРАГРАМЫ

**Краязнаўства. Гісторыя краязнаўства ў Беларусі (1 г.)**

Паняцце аб гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыне. Краязнаўства як комплексны метад выяўлення і вывучэння спадчыны. Аб'екты краязнаўства: прырода, насельніцтва, гаспадарка, культура. Гісторыя краязнаўства ў Беларусі. Школьнае краязнаўства. Краязнаўчыя матэрыялы ў серыі раённых кніг «Памяць».

*Практычная работа* "Вывучэнне аб'ектаў краязнаўства".

**Арганізацыя краязнаўчай работы (1 г.)**

Арганізацыйныя формы краязнаўства. Асноўныя метады краязнаўчых даследаванняў (літаратурна-статыстычны метад, палявыя даследаванні, картаграфічнае вывучэнне, візуальнае вывучэнне, гутаркі з насельніцтвам, правядзенне анкет і інш.). Арганізацыя пошукава-даследчай дзейнасці. Дзяржаўныя архівы Беларусі і выкарыстанне іх фондаў у краязнаўчай рабоце.

**Насельніцтва (1 г.)**

Сучасныя дэмаграфічныя праблемы Беларусі. Колькасць і нацыянальны склад насельніцтва, асаблівасці быту, абрадаў, аддзення розных нацыянальнасцей краіны. Асаблівасці развіцця культуры, літаратуры і мастацтва. Узаемнае ўзбагачэнне культур розных народаў. Песні, танцы, народная музычная творчасць, вусная народная творчасць (прымаўкі, прыказкі і інш.). Народны каляндар. Найбольш распаўсюджаныя прозвішчы, іх тапаніміка. Знакамітыя землякі.

*Практычная работа.* Вывучэнне свайго прозвішча, складанне радавода. Падрыхтоўка і правядзенне аднаго са святаў народнага календара.

**Мінулае нашай краіны. Наш край у гады Вялікай Айчыннай вайны (1 г.)**

Асаблівасці арганізацыі пошукавай працы. Важнейшыя гістарычныя падзеі, якія адбываліся на тэрыторыі. Знакамітыя земляки. Знаёмства з літаратурай аб падзеях, якія адбываліся ў ваенныя гады ў краі. Партызанская барацьба мясцовага насельніцтва з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Знакамітыя земляки – удзельнікі падзей Вялікай Айчыннай вайны.

**Працоўныя будні краіны (1 г.)**

Сучасны стан народнай гаспадаркі. Важнейшыя прамысловыя і сельскагаспадарчыя прадпрыемствы і іх прадукцыя. Знакамітыя людзі працы. Ветэраны працы.

## ПРАГНАЗУЕМЫЯ ВЫНІКІ

У выніку засваення праграмы факультатыўных заняткаў «Краязнаўства» падлеткі павінны:

*ведаць*

асноўныя прыродныя, гісторыка-культурныя і іншыя падзеі і аб'екты сваёй краіны ў агульнадзяржаўным і сусветным кантэксце;

асаблівасці гаспадарчай, сельскагаспадарчай, творчай, спартыўнай і іншай дзейнасці сваіх землякоў;

*авалодаць навыкамі і ўменнямі*

працы з літаратурнымі і архіўнымі крыніцамі;

пошукавай дзейнасці;

апрацоўкі пісьмаў, фатаграфій, успамінаў;

складання радавода, летапісу школы;

працы асобна, у парах, у групах.

## ЛІТАРАТУРА ДЛЯ ПЕДАГОГА

1. Беларусь: Сучасныя этнакультурныя працэсы / Г.І.Каспяровіч [і інш.]; рэдкал.: А.І.Лакотка [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т

мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы. – Мінск: Беларус. навука, 2009. – 607 с.
2. Белорусы, прославившие Россию. Россияне, прославившие Белоруссию: биогр. справ. / авт. текста А.А.Звозников. – Минск: БЕЛТА, 2006. – 96 с.
3. *Борисов, Н.С.* Методика историко-краеведческой работы в школе / Н.С.Борисов, В.В.Дранишников, В.П.Иванов, Д.В.Кацуба. – М., 1989.
4. *Бялявіна, В.М.* Мужчынскі касцюм на Беларусі / В.М.Бялявіна, Л.В.Ракава. – Мінск: Беларусь, 2007. – 303 с.
5. *Бялявіна, В.М.* Жаночы касцюм на Беларусі / В.М.Бялявіна, Л.В.Ракава. – Мінск: Беларусь, 2007. – 351 с.
6. Верхнее Поднепровье и Белоруссия. Полное географическое описание нашего Отечества / сост.: В.П.Семёнов (Тян-Шанский), И.В.Довнар-Запольский, Д.З.Шендрик и др. – Минск: БелЭн., 2006. – 456 с.
7. Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя / С.В.Марцэлеў; рэдкал.: Г.П.Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн., 2005. Т. 2, кн. 2 (Гомельская вобласць). – 520 с.
8. *Долготович, Б.Г.* Почётные граждане белорусских городов: биограф. справ. / Б.Г.Долготович. – Минск: Беларусь, 2008. – 368 с.
9. Катовіч А.В. Летнія святы: у 2 кн. / А.Катовіч, Я.Крук. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2009. – Кн. 1. – 368 с. – Беларускі народны каляндар.
10. Катович, Н.К. Модели воспитания школьников / Н.К.Катович. – Минск, 2000.
11. *Конюшко, В.С.* Страницы экологического краеведения / В.С.Конюшко, А.А.Лешко, С.В.Чубаро. – Минск, 2000.
12. *Лабачэўская, В.А.* Повязь часоў – беларускі ручнік / В.А.Лабачэўская. – Мінск: Беларусь, 2009. – 293 с.
13. Регионы Беларуси: энциклопедия: в 7 т. / редкол.: Т.В.Белова (гл. ред.) [и др.]. – Минск: Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – Т. 1, кн. 1 (Брестская область). – 520 с.
14. Регионы Беларуси: энциклопедия: в 7 т. / редкол.: Т.В.Белова (гл. ред.) [и др.]. – Минск: Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – Т. 1, кн. 2 (Брестская область). – 520 с.
15. Регионы Беларуси: энциклопедия: в 7 т. / редкол.: Т.В.Белова (гл. ред.) [и др.]. – Минск: Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2010. – Т. 2, кн. 1 (Витебская область). – 536 с.
16. Современная Беларусь: энцикл. справ.: в 3 т. / редкол.: М.В.Мясникович [и др.]. – Минск: Белорус. наука, 2006. – Т. 1: Страна. Население. Внутренняя и внешняя политика. – 774 с.
17. Современная Беларусь: энцикл. справ.: в 3 т. / редкол.: М.В.Мясникович [и др.]. – Минск: Белорус. наука, 2007. – Т. 2: Экономический и научный потенциал. – 680 с.
18. Современная Беларусь: энцикл. справ.: в 3 т. / редкол.: М.В.Мясникович [и др.]. – Минск: Белорус. наука, 2007. – Т. 3: Культура и искусство. – 778 с.

19. *Торхова, А.В.* Художественное краеведение в воспитании школьников / А.В.Торхова.– Минск: Беларусь, 2000. – 128 с.
20. *Цітоў, А.К.* Геральдыка Беларусі / А.К.Цітоў. – Мінск: МФЦП, 2010. – 144 с.
21. *Чантурия, В.А.* Памятники и памятные места Беларуси / В.А.Чантурия, Ю.В.Чантурия. – Смоленск: Русич, 2010. – 416 с.

## ЛІТАРАТУРА ДЛЯ ВУЧНЯЎ

1. Адзінцоў, С. Займальная геаграфія Беларусі / С.Адзінцоў, С.Сідор. – Мінск, 1995.
2. Асветнікі зямлі беларускай. Х – пач. ХХ ст.: энцыкл. давед. – Мінск, 2001.
3. Баландин, Р.К. Глазами геолога / Р.К.Баландин. – Минск, 1973.
4. Баршчэўскі, Я. Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях / Я. Баршчэўскі. – Мінск, 1991.
5. Беларусы: у 8 т. / [В.К. Бандарчык]; НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск, 1999.
6. Гарады і гарадскія пасёлкі Беларусі: энцыкл. давед. – Мінск, 1981.
7. Гурскі, Б.М. Як збудаваны і чым багаты нетры Беларусі / Б.М.Гурскі. – Мінск, 1992.
8. Жучкевич, В.А. Происхождение географических названий Белоруссии / В.А.Жучкевич. – Минск, 1961.
9. Контор, Б.З. Коллекционирование минералов / Б.З.Контор. – М., 1982.
10. Лаптев, Ю.П. Рассказы о полезных растениях / Ю.П.Лаптев. – М., 1982.
11. Памятники природы Белоруссии. – Минск, 1987.
12. Пракопчык, Л.Ц. Адкуль у вёскі імя / Л.Ц.Пракопчык. – Мінск, 1981.
13. Соболевский, В.И. Занимательные минералы / В.И.Соболевский. – М., 1983.
14. *Татаринов, Ю.А.* По некоторым замечательным уголкам Беларуси / Ю.А.Татаринов. – Минск, 1995.
15. *Фядотаў, В.Л.* Мінералы, горныя пароды і глебы роднага краю / В.Л.Фядотаў, А.М.Цытленак. – Мінск, 1987.
16. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск, 2001.
17. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. – Мінск, 1984–1987.
18. Энцыклапедыя прыроды Беларусі: у 5 т. – Мінск, 1983–1986.
19. Я – гражданин Республики Беларусь / Г.А.Василевич, В.А.Мельник, В.В.Буткевич и др. – Минск: Пачатковая школа, 2009.
20. *Яршова Н.В.* Вызначальнік мінералаў і горных парод / Н.В.Яршова, Т.С.Шырко. – Мінск, 1975.

# ПРАГРАМА ФАКУЛЬТАТЫЎНЫХ ЗАНЯТКАЎ “БЕЛАРУСКАЯ ТРАДЫЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА Ў ЛЮСТЭРКУ МОВЫ”
## ДЛЯ X КЛАСАЎ

(распрацавана на аснове праграмы факультатыўных заняткаў **“Беларуская традыцыйная культура ў люстэрку мовы”** для X класаў, рэкамендаванай навукова-метадычнай установай “Нацыянальны інстытут адукацыі”)

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Уласцівасць мовы адлюстроўваць адметнасць культуры яе носьбітаў абумоўлена кумулятыўнай функцыяй мовы, якая заключаецца ў назапашванні і захаванні традыцый, гістарычных здабыткаў, нацыянальнай свядомасці народа.

Інтэграваны курс “Беларуская традыцыйная культура ў люстэрку мовы” раскрывае перад старшакласнікамі багацце і ўнікальнасць традыцыйнай культуры. Вывучэнне этнаграфічных тэм, уключаных у праграму курса, стварае ўмовы для асэнсавання падлеткамі самабытнасці, эстэтычнай каштоўнасці традыцыйнай матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага народа.

Мэтай дадзенага курса з’яўляецца культуралагічнае развіццё асобы падлетка сродкамі нацыянальна афарбаваных рэсурсаў беларускай мовы, у якіх знайшлі адбітак рэаліі традыцыйнай этнакультуры.

Дасягненне ўказанай мэты прадугледжвае вырашэнне наступных задач:

узбагаціць веды вучняў пра традыцыйную, матэрыяльную і духоўную культуру беларускага народа;

фарміраваць навык лінгвакультурнага аналізу навуковых, публіцыстычных, мастацкіх тэкстаў культуразнаўчага зместу;

удасканальваць уменне правільна ўжываць у маўленні нацыянальна маркіраваную лексіку;

выхоўваць пачуццё павагі да культурных каштоўнасцей беларускага і іншых народаў.

У выніку вывучэння прапанаванага курса старшакласнікі не толькі атрымліваюць культуразнаўчаю інфармацыю этнаграфічнага і лінгвакультаралагічнага характару, але і набываюць уменні карыстацца ёю з мэтай забеспячэння паўнацэннай камунікацыі, фарміруюць уласнае культурнае аблічча.

## ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № п/п | Тэма | Колькасць гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | усяго | тэар. | практ. |
| 1. | Мова як крыніца звестак пра культуру народа – яе носьбіта | 1 | 1 | - |
| 2. | Выяўленне ў беларускай мове самабытнасці традыцыйнай матэрыяльнай культуры | 1 | 1 | - |
| 3-4. | Выяўленне ў беларускай мове самабытнасці традыцыйнай духоўнай культуры | 2 | 2 | - |
| 5. | Народныя веды, увасобленыя ў мове | 1 | 1 | - |
| | УСЯГО | 5 | 5 | - |

## ЗМЕСТ ПРАГРАМЫ

**Мова як крыніца звестак пра культуру народа – яе носьбіта (1 г.)**

Беларуская мова як кампанент нацыянальнай культуры. Праяўленне нацыянальнай самабытнасці мовы ў яе ідыяматыцы. Адлюстраванне беларускіх звычаяў і традыцый у моўных адзінках з нацыянальна-культурным кампанентам значэння (безэквівалентнай лексіцы, фразеалагізмах, прыказках, прымаўках і інш.). Сімвалічнасць мовы традыцыйнай культуры.

**Выяўленне ў беларускай мове самабытнасці традыцыйнай матэрыяльнай культуры (1 г.)**

Традыцыйныя гаспадарчыя заняткі беларусаў. Нацыянальна-гістарычная афарбоўка моўных адзінак - назваў прылад працы. Праявы асаблівасцей беларускага нацыянальнага характару ў фразеалагізмах, прыказках і прымаўках на тэму працы.

Нацыянальная спецыфіка традыцыйных форм паселішчаў беларусаў. Моўныя адзінкі-назвы жыллёвых і гаспадарчых пабудоў як носьбіты этнакультуразнаўчай інфармацыі пра народны побыт.

Назвы беларускага традыцыйнага адзення, дэкаратыўных элементаў для аздаблення адзення, іх роля ў стварэнні нацыянальнага каларыту мовы.

Безэквівалентныя найменні нацыянальных страў як крыніца звестак пра традыцыйную кухню беларусаў. Назвы нацыянальных страў народаў свету ў сучаснай беларускай мове.

**Выяўленне ў беларускай мове самабытнасці традыцыйнай духоўнай культуры (2 г.)**

Сімволіка прадметаў і дзеянняў у каляндарных абрадах, функцыі і асноўныя рысы іх вербальных кампанентаў. Сямейная абраднасць як крыніца інфармацыі пра калектыўны жыццёвы вопыт, лад жыцця народа.

Праявы народнага характару ў мове фальклорных твораў. Разнастайнасць малых фальклорных жанраў. Трапнасць, вобразнасць мовы народных выслоўяў (жартаў, вітанняў, зычэнняў, ветлівых і ласкавых зваротаў, праклёнаў, параўнанняў і інш.).

Народнае музычнае мастацтва і харэаграфія праз прызму мовы. Моўныя адзінкі-назвы традыцыйных беларускіх танцаў, карагодаў як носьбіты культуразнаўчай інфармацыі аб народнай харэаграфічнай творчасці.

**Народныя веды, увасобленыя ў мове (1 г.)**

Адлюстраванне ў беларускай мове багатага жыццёвага вопыту народа, яго псіхалогіі, маральна-этычных і эстэтычных ідэалаў і каштоўнасцей.

Сістэма метэаралагічных назіранняў беларусаў. Беларускі народны каляндар, этымалогія назваў месяцаў у беларускай мове, сімволіка дзён тыдня. Народная метралогія.

## ПРАГНАЗУЕМЫЯ ВЫНІКІ

У выніку засваення праграмы факультатыўных заняткаў «Беларуская традыцыйная культура ў люстэрку мовы» падлеткі павінны ўмець:

выяўляць у фальклорных творах, тэкстах мастацкай літаратуры, публіцыстыкі нацыянальна афарбаваныя адзінкі мовы;

раскрываць унутраную форму слоў, якія абазначаюць з’явы матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага народа;

раскрываць сэнс сімвалаў нацыянальнай культуры;

правільна ўжываць у маўленчай дзейнасці нацыянальна афарбаваную лексіку;

выкарыстоўваць факты беларускай і іншых моў для ацэнкі з’яў традыцыйнай культуры.

# ПРАГРАМА ЗАНЯТКАЎ
# АБ’ЯДНАННЯ ПА ІНТАРЭСАХ
# “АКАДЭМІЯ МУЗЕЯЗНАЎСТВА”

Сярод мноства фактараў, якія вызначаюць захаванне каштоўнасцей сусветнай і айчыннай культуры, фарміраванне гістарычнай памяці, асаблівае месца належыць музеям. З году ў год яны адыгрываюць усе большую ролю ў духоўным жыцці грамадства, асвеце, адукацыі і патрыятычным выхаванні падрастаючага пакалення.

Музей – установа, якая займаецца збіраннем, вывучэннем, захоўваннем і паказам прадметаў і дакументаў, якія характарызуюць развіццё прыроды, чалавечага грамадства і маюць гістарычную, навуковую або мастацкую каштоўнасць.

Асобую ролю ў выхаванні падрастаючага пакалення адыгрываюць музеі ўстаноў адукацыі, якія ствараюцца як вынік пошукава-збіральніцкай і даследчай дзейнасці вучняў і педагогаў, у ходзе якой дзеці займаюцца пошукам, захаваннем, вывучэннем і сістэматызацыяй сапраўдных помнікаў гісторыі, культуры, прыроды роднага краю, розных прадметаў і дакументаў.

Мэта музейнай дзейнасці – фарміраванне пачуцця адказнасці за захаванне прыродных багаццяў, мастацкай культуры краю, гонару за сваю Айчыну, школу, сям’ю.

Авалодванне асновамі музейнай справы, знаёмства са спецыфікай розных прафесій, рамёстваў у працэсе краязнаўчых пошукаў аказваюць пэўны ўплыў на прафесійную арыентацыю вучняў.

Прапануемая праграма заняткаў аб’яднання па інтарэсах “Акадэмія музеязнаўства” разлічана на 8 гадзін і прадугледжвае навучанне дзяцей асновам музейнай справы. Праграма вызначае асноўны круг музеязнаўчых пытанняў і прапануе іх як прадмет спецыяльнага вывучэння для актывістаў музеяў.

**Мэта праграмы:** пашырэнне ведаў навучэнцаў па асновах музеязнаўства, фарміраванне сацыяльна актыўнай асобы шляхам уключэння іх у пошукава-даследчую дзейнасць праз разнастайныя формы музейнай работы.

**Задачы праграмы:**

пазнаёміць навучэнцаў з гісторыяй музеяў, тыпамі і відамі сучасных музеяў, тэорыяй і практыкай музейнай работы;

фарміраваць першасныя навыкі сучасных музейных тэхналогій;

развіваць практычныя навыкі музейнай работы;

развіваць інтэлектуальна-творчы патэнцыял асобы падлетка, яе сацыяльную актыўнасць;

фарміраваць ў падлеткаў навуковыя інтарэсы і прафесійныя схільнасці, навыкі грамадска-карыснай дзейнасці.

Спецыфіка арганізацыі заняткаў па праграме заключаецца ва ўзаемазвязанасці краязнаўчага і музеязнаўчага кампанентаў курса.

Ажыццяўленне такога падыхода стварае ўмовы для комплекснага вывучэння гісторыі, культуры і прыроды краю музейна-краязнаўчымі сродкамі.

Праграма "Акадэмія музеязнаўства" ажыццяўляецца як вучэбна-дзейнасная і прадугледжвае не толькі навучанне дзяцей тэарэтычным асновам краязнаўства і музеязнаўства, але і ўключэнне іх у канкрэтную музейна-краязнаўчую дзейнасць – выкананне даследчай работы.

У працэссе навучання па праграме вучні атрымліваюць магчымасць спецыялізацыі ў выкананні розных ролевых функцый і ў тэматыцы музейна-краязнаўчых даследаванняў. Для гэтага ў праграме выдзяляюцца інварыянтная і варыятыўная частка.

## ВУЧЭБНА-ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № п\п | Тэма | Колькасць гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | **Усяго** | **Тэорыя** | **Прак-тыка** |
| 1. | Музеязнаўства. Музей як сацыякультурны інстытут | 1 | 0,7 | 0,3 |
| 2. | Музей установы адукацыі | 1 | 0,7 | 0,3 |
| 3. | Структура работы ў музеі. Фондавая работа музеяў. Экспазіцыйна-выставачная работа музеяў | 1 | 0,7 | 0,3 |
| 4. | Навукова-даследчая дзейнасць музеяў. Культурна-асветніцкая работа музеяў | 1 | 0,6 | 0,4 |
| 5. | Музей – цэнтр краязнаўчай работы. Гістарычнае краязнаўства. Прырода як аб'ект краязнаўства | 1 | 0,7 | 0,3 |
| 6. | Тапаніміка – крыніца вывучэння прыроды, насельніцтва, культуры краю. Помнікі архітэктуры | 1 | 0,7 | 0,3 |
| 7. | Этнакультурная спадчына. Насельніцтва краю як аб'ект краязнаўства | 1 | 0,7 | 0,3 |
| 8. | Гаспадарчая дзейнасць як аб'ект краязнаўства. Выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій у краязнаўчай і музеязнаўчай рабоце | 1 | 1 | - |
| 9. | Адукацыйны форум «Вектар на будучыню» | 1 | - | 1 |
| **УСЯГО** | | **9** | **5,8** | **3,2** |

## ЗМЕСТ ПРАГРАМЫ

**Тэма 1. Музеязнаўства. Музей як сацыякультурны інстытут (1 г.)**

Паняцці "музей", "музеязнаўства". Музеязнаўства як комплексная навука. Паняцце "музей". Заканадаўства, якое рэгламентуе музейную дзейнасць. Класіфікацыя музеяў па масштабу, тыпу і профілю. Музейны фонд Рэспублікі Беларусь.

**Пр. раб.** "Гульня-практыкум "Музей аднаго экспаната".

**Тэма 2. Музей установы адукацыі (1 г.)**

Музей установы адукацыі як грамадскае вучэбна-даследчае аб'яднанне вучняў. Профіль музея. Актыў музея ўстановы адукацыі.

**Пр. раб.** "Прэзентацыя музеяў устаноў адукацыі".

**Тэма 3. Структура работы ў музеі. Фондавая работа музеяў. Экспазіцыйна-выставачная работа музеяў (1 г.)**

Структура работы ў музеі. Паняцце фондаў музеяў. Навуковая класіфікацыя фондавых матэрыялаў. Асноўны і дапаможны фонды. Камплектаванне фондаў. Прадмет музейнага значэння – музейны прадмет – экспанат.

Экспазіцыі і выставы як галоўны вынік музейнай работы. Асноўныя прыёмы экспанавання музейных экспанатаў. Асаблівасці экспазіцый і выстаў, прынцыпы іх пабудовы.

Віды экспазіцый. Матэрыялы экспазіцый і выстаў. Навуковае і мастацкае праектаванне экспазіцый і выстаў.

**Пр.раб.** "Праектаванне выставы".

**Тэма 4. Навукова-даследчая дзейнасць музеяў. Культурна-асветніцкая работа музеяў (1 г.)**

Музей як навукова-даследчая ўстанова. Вывучэнне музейных матэрыялаў. Музеязнаўчыя пошукі.

Роля культурна-асветніцкай работы музея ў яго сацыякультурнай дзейнасці. Асноўныя формы культурна-асветніцкай работы музея. Экскурсія як форма папулярызацыі гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны музейнымі сродкамі. Музейнае свята, яго падрыхтоўка і правядзенне.

Музеі НДЦ "Зубронак".

**Пр. раб.** "Складанне пашпарта музея" (работа ў музеях НДЦ "Зубронак")

**<u>Тэма 5.</u> Музей – цэнтр краязнаўчай работы. Гістарычнае краязнаўства. Прырода як аб'ект краязнаўства (1 г.)**

Музей – цэнтр краязнаўчай работы.

Паняцце "гістарычнага краязнаўства", яго прадмет і аб'ект даследаванняў, асноўныя метады і прынцыпы.

Асноўныя крыніцы ў гістарычным краязнаўстве: рэчавыя крыніцы (помнікі матэрыяльнай культуры), вусныя крыніцы, пісьмовыя крыніцы.

Аб'екты прыроднай спадчыны роднага краю, іх выяўленне, ахова і музеефікацыя. Схема вывучэння прыроды роднага краю. Ахова і рацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў.

**Пр. раб.** "Прэзентацыя музеяў устаноў адукацыі".

**<u>Тэма 6.</u> Тапаніміка – крыніца вывучэння прыроды, насельніцтва, культуры краю. Помнікі архітэктуры (1 г.)**

Тапаніміка як інтэгральная навуковая дысцыпліна. Тапанімічныя класы (клас тапонімаў, тапанімічныя групы). Віды класіфікацый тапонімаў. Метады тапанімічных даследаванняў. Асаблівасці тапанімікі населеных пунктаў.

Архітэктура як навука. Асноўныя галіны архітэктуры. Архітэктурныя стылі. Апісанне помнікаў архітэктуры.

**Пр. раб.** "Прэзентацыя музеяў устаноў адукацыі".

**<u>Тэма 7.</u> Этнакультурная спадчына. Насельніцтва краю як аб'ект краязнаўства (1 г.)**

Этнакультурная спадчына і яе роля ў краязнаўстве. Этнаграфія. Метады збору этнаграфічнага матэрыялу.

Насельніцтва краю як аб'ект краязнаўства. Сацыяльна-дэмаграфічная структура насельніцтва. Размяшчэнне насельніцтва, рассяленне насельніцтва. Сучасныя дэмаграфічныя праблемы Беларусі.

**Пр. раб.** "Сучасныя дэмаграфічныя праблемы Беларусі".

**<u>Тэма 8.</u> Гаспадарчая дзейнасць як аб'ект краязнаўства. Выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій у краязнаўчай і музеязнаўчай рабоце (1 г.)**

Краязнаўчае вывучэнне гаспадаркі. Эканоміка-геаграфічная характарыстыка мясцовасці.

Паняцце інфармацыйных тэхналогій. Краязнаўчыя электронныя і музейныя рэсурсы.

**<u>Тэма 9.</u> Адукацыйны форум "Вектар на будучыню" (1 г.)**

**Пр.раб.** Презентацыя даследчых работ па краязнаўству і музеязнаўству, выкананых у НДЦ "Зубронак".

**Тэматыка даследчых работ**

1. Гістарычная адметнасць мясцін, на якіх размешчаны НДЦ "Зубронак".
2. Мікратапаніміка НДЦ "Зубронак".
3. Моўныя асаблівасці супрацоўнікаў НДЦ "Зубронак" і дзяцей, якія тут адпачываюць.
4. Гісторыя НДЦ "Зубронак" у асобах (кіраўніцтва НДЦ "Зубронак", ганаровыя госці НДЦ "Зубронак").
5. НДЦ "Зубронак" – установа адукацыі, якая дынамічна развіваецца.
6. Важаты – прафесія-птушка.
7. Дзіцячая форма і форма важатых у розныя перыяды дзейнасці цэнтра.
8. Гісторыя НДЦ "Зубронак" у дакументах.
9. Рэакрэацыйныя магчымасці Мядзельскага раёна.
10. Мядзельшчына – партызанскі край.
11. Незвычайнае ў звычайным – прырода нарачанскага краю.
12. Знакамітыя людзі нарачанскага краю.
13. Легенды і паданні НДЦ "Зубронак".
14. Помнікі Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Мядзельшчыны.

## ПРАГНАЗУЕМЫЯ ВЫНІКІ

У ходзе рэалізацыі праграмы падлеткі атрымаюць веды і набудуць пэўныя ўменні.

**Павінны ведаць:**

*асноўную музейную тэрміналогію;*
*гісторыю музейнай справы;*
*асновы тэорыі арганізацыі музейнай справы;*
*асаблівасці музея ўстановы адукацыі;*
*структуру работы ў музеі;*
*асаблівасці правядзення пошукавай работы;*
*асаблівасці захоўвання і экспанавання музейных прадметаў;*
*правілы напісання, падрыхтоўкі і правядзення экскурсій у музеі;*
*музейны фонд Рэспублікі Беларусь.*

**Павінны ўмець:**

*працаваць з рознымі крыніцамі, асноўнай дакументацыяй музея, музейнымі фондамі;*

*арганізоўваць пошук матэрыялаў для фарміравання і папаўнення музейнага фонда;*

*атрыбутыраваць матэрыялы для выставы;*

*ствараць выставачныя экспазіцыі ў адпаведнасці з тэматыкай і правіламі афармлення выстаў і экспазіцый;*

*рыхтаваць і праводзіць экскурсію па музею.*

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Метадычныя рэкамендацыі аб дзейнасці музеяў устаноў адукацыі.
2. Музееведение  учеб. пособие для студентов специальности 031502 – музеология / Л. Г. Гужова [и др.]; под. ред. доц. Н. В. Мягтиной; Владим. гос. ун-т. – Владимир : Изд-во Владим. гос. ун-та, 2010. –  116 с.
3. Александров, Ю. Н. Подготовка и проведение экскурсий: Метод. рекомендации / Ю. Н. Александров. - М.: Турист, 1974.
4. Дуяльски, Д. Ю. Музейные коллекции и предметный мир культуры / Д. Ю. Дуяльски. - М.: 1987.
5. Вансалова,  Е. Г. Музейный всеобуч: Метод рекомендации / Е. Г. Вансалова. - М.: Для детей, 1988

# МЕХАНІЗМ РЭАЛІЗАЦЫІ ЗМЕНЫ

## ДЗІЦЯЧАЕ САМАКІРАВАННЕ

**1. Задачы дзіцячых органаў самакіравання НДЦ “Зубронак” “Асацыяцыя дзіцячых ініцыятыў” па рэалізацыі змены “Я родным краем ганаруся”**

| № | Орган самакіравання | Задачы па рэалізацыі змены |
|---|---|---|
| 1 | Савет асацыяцыі дзіцячых ініцыятыў | Дапамога ў падрыхтоўцы, арганізацыі і правядзенні фіналу конкурса дзіцячых вучэбна-даследчых праектаў “Я родным краем ганаруся” |
| 2 | Мэрыя Горада спазнання | Дапамога ў арганізацыі і правядзенні факультатыўных заняткаў “Краязнаўства” і “Беларуская традыцыйная культура ў люстэрку мовы” |
| 3 | СОЗВЕЗДИЕ | Дапамога ў арганізацыіі і правядзенні мультыпарка “Маю слова” |
| 4 | АЛМАЗ | Арганізацыя і правядзенне прэзентацыі ГА “Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі” |
| 5 | ПЛАМЯ | Арганізацыя і правядзенне прэзентацыі ГА “Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя” |
| 6 | Савет СОЮЗ | Арганізацыя і правядзенне спартландыі |
| 7 | Савет СаЛюТ | Арганізацыя і правядзенне мультыпарка “Навучы сябра” |
| 8 | ПАЗЛ | Дапамога ў арганізацыі і правядзенні гульнёвага мультыпарка |
| 9 | БИС | Дапамога ў падрыхтоўцы конкурсу “Легенда за легендай” |
| 10 | Юпитер-Д | Арганізацыя трэнінгаў на развіцце камунікатыўных навыкаў |
| 11 | ГЛОБУСИК | Дапамога ў стварэнні экскурсійных маршрутаў па тэрыторыі цэнтра |

**2. Сістэма дзіцячага самакіравання на ўзроўні корпуса “Савет музея”**

Сістэма дзіцячага самакіравання на ўзроўні корпуса ўяўляе сабой калегіяльны орган – **Савет музея**, які вызначае асноўныя напрамкі рэалізацыі арганізацыйна-гульнёвага праекта **“Музей археалогіі”**. У састаў савета музея ўваходзіць па аднаму прадстаўніку ад кожнай экспедыцыі – **галоўны даследчык**. Арганізоўвае і кантралюе работу вучонага савета **Музейны нагляд**, які складаецца з педагога-арганізатара, вядучага метадыста змены і аднаго прадстаўніка вучонага савета **(Старшыня Савета музея).** Старшыня вучонага савета выбіраецца на першым пасяджэнні.




**3. Сістэма атраднага самакіравання “Савет экспедыцыі”**

**Мэта:** фарміраванне актыўнай, самастойнай асобы падлетка праз стварэнне мадэлі дзіцячага атраднага самакіравання.

**Задачы:**

выявіць лідараў у часовым дзіцячым аб’яднанні;

сфарміраваць органы атраднага самакіравання;

арганізаваць работу атраднага самакіравання;

пазнаёміць з арганізацыяй дзейнасці па сістэме чаргавання творчых даручэнняў

спрыяць праяўленню і развіццю дзіцячай ініцыятывы.

**Рэалізацыя сістэмы атраднага самакіравання.**

На час змены кожнае часовае дзіцячае аб’яднанне (атрад) арганізуе сваю жыццядзейнасць у адпаведнасці з дзейнасцю археалагічнай экспедыцыі, дзе ў кожнага ёсць свае абавязкі. Выконваць пэўную ролю ў атрадзе можа некалькі чалавек, якія ўваходзяць у тую або іншую групу. Абавязкі размяркоўваюцца ў пачатку змены і змяняюцца на працягу зменны па сістэме чаргавання творчых даручэнняў. Кіраваць дзейнасцю экспедыцыі будзе **Савет экспедыцыі**, які фарміруецца ў час правядзення дзелавой гульні “Перспектыва”. Узначальвае Савет экспедыцыі **галоўны даследчык**.




**Абавязкі членаў атрада:**

| | |
|---|---|
| **Галоўны даследчык** | Арганізуе дзейнасць “Савета экспедыцыі”, размяркоўвае даручэнні паміж аддзеламі, кантралюе іх выкананне. Прадстаўляе экспедыцыю ў “Вучоным савеце” |
| **Старэйшы археолаг** | З’яўляецца намеснікам галоўнага даследчыка, выконвае яго функцыі ў час яго адсутнасц, займаецца арганізацыяй работы па вывучэнню археалагічнага аб’екта |
| **Інфармацыйны аддзел** | Займаецца інфармаваннем у атрадзе аб падзеях у свеце, краіне, цэнтры. Рыхтуе інфармацыю для галоўнага даследчыка аб дзейнасці атрада. |
| **Гаспадарчы аддзел** | Адказвае за чысціню і парадак у атрадзе: пакоях, атрадным месцы, арганізуе ўборку атраднага месца і тэрыторыі, дзяжурстваў. Сочыць за рацыянальным выкарыстаннем рэсурсаў |
| **Творчы аддзел** | Займаецца падрыхтоўкай і правядзеннем атрадных мерапрыемстваў, арганізоўвае вольны час у атрадзе |
| **Мастацкі аддзел** | Займаецца афармленнем атраднага месца, рыхтуе неабходнае афармленне для правядзення розных мерапрыемстваў |
| **Спартыўны аддзел** | Арганізоўвае і дапамагае ў арганізацыі спартыўных мерапрыемстваў, зарадак, займаецца прапагандай здаровага ладу жыцця. Арганізуе работу па методыцы “Бюлетэнь на кожны дзень”. |

# АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГУЛЬНЁВЫ ПРАЕКТ "МУЗЕЙ АРХЕАЛОГІІ"

**Мэта:**

стварэнне умовы для арганізацыі гульні-спаборніцтва паміж атрадамі з мэтай падтрымкі пастаяннай цікавасці да ідэі змены.

**Задачы:**

стварыць арганізацыйныя ўмовы для рэалізацыі гульнёвай ідэі змены;

змадэліраваць праблемна-пошукавыя сітуацыі, якія патрабуюць актывізацыі лідарскага патэнцыялу дзяцей;

выкарыстаць гульнёвую ідэю змены для рэгулявання жыццядзейнасці падлеткаў у адпаведнасці з нормамі і патрабаваннямі цэнтра.

**Гульнёвая ідэя.**

Корпус на перыд змены ператвараецца ў Музей археалогіі, якім кіруе Савет музея на чале са Старшынёй савета музея. Кантралюе работу Музея археалогіі **Музейны нагляд**, у састаў якога уваходзяць: старшыня савета музея, педагог-арганізатар і вядучы метадыст змены.

Кожны атрад на перыяд змены ператвараецца ў археалагічную экспедыцыю, якая праводзіць археалагічныя раскопкі з мэтай папаўнення фондаў музея новымі экспанатамі.

Гульнёвым полем для кожнай экспедыцыі з'яўляецца **археалагічны аб'ект**, які складаецца з трох (па колькасці гульнёвых перыядаў (13.01 – 17.01, 18.01 – 22.01, 23.01 – 27.01)) **культурных слаёў**. Культурны слой уяўляе сабой схематычнае адлюстраванне археалагічнага помніка, які складаецца з **15 элементаў**. Для таго каб вывучыць кожны культурны слой, патрэбна запоўніць усе элементы (па 1-5 элементаў у кожнай намінацыі). Элементы можна атрымаць, дасягнуўшы поспехаў у намінацыях:

**чысціня і парадак** (адзнакі за пакоі не ніжэй за "4" - "5") – 5 элементаў за перыяд;

**перамога** (перамога ў мерапрыемствах не ніжэй корпуснага ўзроўню) – 1 элемент за перыяд;

**актыўнасць** (удзел ва усіх мерапрыемствах змены) – 5 элементаў за перыяд;

**ініцыятыва** (самастойная падрыхтоўка і правядзенне мерапрыемства для свайго атрада) – 1 элемент за перыяд;

**праца** (правядзенне працоўных дэсантаў, пасільная дапамога супрацоўнікам цэнтра (акрамя сваіх выхавацеляў) – 3 элементы за перыяд.

Пры гэтым, пры вывучэнні кожнага слоя трэба выконваць наступныя ўмовы:

**1 слой** – падыходзяць элементы любых намінацый;

**2 слой** – абавязкова павінны быць элементы трох любых намінацый;

**3 слой** - абавязкова павінны быць элементы пяці любых намінацый.

Выдача элементаў адбываецца ў канцы дня пры правядзенні пасяджэння Савета музея.

На вывучэнне кожнага культурнага слоя адводзіцца 5 дзён. Калі атрад не вывучыў культурны слой за адведзены срок, ён можа набыць нехапаючыя элементы, выкарыстаўшы “зубрыкі”.

Пры парушэнні норм і патрабаванняў цэнтра, атрыманні адзнак за пакоі “3” і ніжэй на культурным слаі можа з’явіцца **наскальны малюнак.** Для яго выдалення атрад павінен заплаціць штраф.

Акрамя таго, пры зняцці кожнага культурнага слоя ўдзельнікі экспедыцыі будуць знаходзіць адлюстраванне розных прадметаў **(рэліквій)**, нейкім чынам звязаных з гісторыяй Беларусі. Трэба правесці даследаванне гэтых прадметаў і прадставіць у вучоны савет справаздачу.

**Культурны слой**



# СІСТЭМА ІНДЫВІДУАЛЬНАГА РОСТУ “МЛЫН”

**Мэта:**

стварэнне ўмоў для фарміравання навыкаў рэфлексіі падлеткамі і педагогамі развіцця асобы кожнага ўдзельніка змены.

**Задачи:**

стымуляваць індывідуальную актыўнасць удзельнікаў змены;

выпрацаваць крытычныя адносіны да ўласнай дзейнасці.

**Гульнёвая ідэя сістэмы індывідуальнага росту.**

Для беларусаў заўсёды пачэсным з’яўлялася праца. Праца дазваляла беларусам павышаць свой узровень жыцця, рабіць родны кут прыгажэйшым. Працавітыя людзі заўсёды былі ў пашане.

Большасць беларусаў займалася земляробствам, галоўным вынікам якога з’яўлялася атрыманне хлеба. А каб атрымаць хлеб, трэба было зерне змалоць на муку. Таму працуючы млын быў сімвалам дастатку, адзнакай таго, што цяжкая земляробчая праца дала свой вынік.

Паказаць вынікі сваёй дзейнасці могуць і ўдзельнікі змены, запусціўшы млын. А запусціць млын можна актыўным удзелам у рэалізацыі праграмы змены.

Гульнёвае поле ўяўляе сабой схематычнае адлюстраванне 6 крылаў млына, кожнае з якіх разбіта на 15 сектараў. Крыло млына абазначае той або іншы від дзейнасці.

Штодня вечарам удзельнікі змены на сваім гульнёвым табло абазначаюць свае дасягненні, зафарбоўваючы адзін з сектараў на тым крыле, якое адпавядае віду дзейнасці, у якім ёсць дасягненні за мінулы дзень і ўказваючы дату.

Адпаведнасць колеру відам дзейнасці:

чырвоны колер – творчасць;

сіні колер – арганізацыйная дзейнасць;

зялёны колер – спорт, здароўе;

аранжавы – праца;

жоўты колер – інтэлект;

фіялетавы колер – лідэрства.



У канцы змены падводзяцца вынікі, аналізуецца ступень актыўнасці кожнага ўдзельніка.

## ТЭХНАЛОГІЯ ЭМАЦЫЯНАЛЬНА-СІМВАЛІЧНАЙ АНАЛОГІІ “НУМІЗМАТ”

**Мэта:**

стварэнне ўмоў для развіцця ў падлеткаў навыкаў рэфлексіі.

**Задачы:**

фіксаваць дынаміку настрою ў падлеткаў на працягу змены;

фарміраваць навыкі самааналізу ў падлеткаў;

аналізаваць прычыны рознага настрою падлеткаў.

**Гульнёвая ідэя метада эмацыянальна-сімвалічнай аналогіі.**

Вельмі часта пры правядзенні археалагічных раскопак знаходзяць манеты. Некаторыя з іх захаваліся вельмі добра, а некоторыя амаль разбураны часам. Дапаможная навука, якая займаецца вывучэннем грошай, гісторыяй грашовага абароту, біцця манет, называецца **нумізматыка**. Такую назву мае і калекцыяніраванне манет, банкнотаў, заменнікаў грошай.

Кожны з удзельнікаў экспедыцыі можа таксама стаць і сабраць сваю калекцыю манет. Якой яна будзе – залежыць выключна ад настрою ўдзельнікаў.

Гульнёвае поле ўяўляе сабой картку з нанесенымі контурамі манет з указаннем даты (**можна прапанаваць кожнаму ўдзельніку зрабіць сабе гульнёвае поле на свой густ**). Кожная манета адпавядае аднаму дню, праведзенаму ў цэнтры. Кожны дзень удзельнікі змены на сваіх манетах пры дапамозе розных колераў фіксуюць свой эмацыянальны стан (настрой) за дзень.

Адпаведнасць колеру эмацыянальнаму стану ўдзельнікаў змены:

выдатны – жоўты;

добры – аранжавы;

нармальны – чырвоны;

закаханы – ружовы;

мне камфортна – зялёны;

зменлівы – фіялетавы;

я смуткую – шэры.

Аналіз метада сістэмы эмацыянальна-сімвалічнай аналогіі праводзіцца адзін раз у два-тры дні на вячэрнім агеньчыку.

## МОДУЛЬНЫ ПРАЕКТ «ЛЕГЕНДА НА КОЖНЫ ДЗЕНЬ»

**Мэта:** стварэнне ўмоў для пашырэння ведаў удзельнікаў змены аб легендах як адным з відаў вуснай народнай творчасці.

**Задачы:**

пазнаёміць падлеткаў з легендамі роднага краю рознай тэматыкі;

садзейнічаць раскрыццю творчага патэнцыялу падлеткаў;

пашырыць банк дадзеных легенд аб НДЦ “Зубронак”.

**Ідэя праекта.**

На працягу змены кожны дзень удзельнікі змены на вячэрнім агеньчыку знаёмяцца з беларускімі народнымі і аўтарскімі легендамі. Акрамя таго, у некаторыя з дзён удзельнікам змены будзе прапанавана прыдумаць свае легенды пра розныя мясціны НДЦ “Зубронак”.

Вынікам дадзенага праекта стане творчы конкурс “Легенда за легендай” на лепшую тэатралізацыю легенды (з прапанаваных або прыдуманых).

## МОДУЛЬНЫ ПРАЕКТ «СКАРБЫ РОДНАЙ МОВЫ»

**Мэта:** садзейнічанне папулярызацыі сярод падлеткаў беларускай мовы як адной з дзяржаўных моў нашай краіны.

**Задачы:**

пазнаёміць падлеткаў з некаторымі элементамі безэквівалентнай лексікі беларускай мовы;

садзейнічаць раскрыццю творчага патэнцыялу падлеткаў.

**Ідэя праекта.**

У рамках дадзенага праекта ўдзельнікі змены кожны дзень пашыраюць свае веды па роднай мове, а таксама атрымліваюць якое-небудзь заданне: зрабіць пераклад, знайсці эквівалент фразеалагізму, прыдумаць назву на беларускай мове і г.д.

За час рэалізацыі праекта ўдзельнікі змены таксама павінны паўдзельнічаць у конкурсе агучкі “Новае гучанне”

## МОДУЛЬНЫ ПРАЕКТ «МЫ - МАЛАДЫЯ» (З 23.01.2015 ГОДА)

**Мэта:** стварэнне ўмоў для паглыблення ведаў удзельнікаў змены аб гісторыі і сучаснасці маладзёжнагна руху ў Беларусі.

**Задачы:**

пазнаёміць падлеткаў з гісторыяй маладзёжнага руху ў Беларусі;

паглыбіць веды падлеткаў аб дзейнасці дзіцячых і маладзёжных грамадскіх аб’яднанняў;

акцэнтаваць увагу на дзейнасці дзяржавы па падтрымцы дзяцей і моладзі.

**Ідэя праекта.**

У рамках Года моладзі пашырыць веды ўдзельнікаў змены па розных аспектах дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь.

## МЕРАПРЫЕМСТВЫ ЗМЕНЫ

Метад асобаснага развіцця арганізацыйнага перыяду “7 Я“

Тэст-анкета “Ведаю  - не ведаю”

Гульня “Падрыхтоўка да экспедыцыі”

Дзелавая гульня “Перспектыва”

Важацкі вечар “Чароўнае пяро Цуд-птушкі”

Свята адкрыцця змены

Фінал конкурсу “Я родным краем ганаруся” (па намінацыях)

Конкурс “Новае гучанне”

Конкурс “Дойлідства”

Метады асобаснага развіцця асноўнага перыяду “Акіян жаданняў” і “Прабач за… Дзякуй за…”

Фестываль мастацтваў

Творчае заданне “Сімвалы «Зубронка”

Творчае заданне “Зямля пад белымі крыламі”

Творчы конкурс “Легенда за легендай”

Шоу-праграма “Міс Зубронак”

Экскурсіі ў Нацыянальны гістарычны музей і Музей Вялікай Айчыннай вайны

Творчая сустрэча з супрацоўнікамі Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, газеты “Переходный возраст”, Нацыянальнага парку “Нарачанскі”, біялагічнай станцыі БДУ і інш.

Метад асобаснага развіцця выніковага перыяду “Ліст самому сабе”

Адукацыйны форум “Вектар на будучыню”

Урачыстае закрыццё змены

## ДАДАТАК 1

# ЗМЕНА ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ

### ДЗЕНЬ ПЕРШЫ (10 студзеня)

**Гэты дзень у календары**

**1909 г.** Нарадзіўся Міхаіл Казлоў, гідрагеолаг, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі. Аўтар работ па праблемах гідрагеалогіі Прыпяцкага Палесся, рэжыму падземных вод і мінеральных водах Беларусі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі.

**1914 г.** У Асіповічах нарадзілася Ніна Каменская, гісторык, заслужаны дзеяч навукі. Працавала намеснікам дырэктара Інстытута гісторыі АН БССР, прарэктарам Мінскага педінстытута. Адзін з аўтараў і рэдактараў «Гісторыі Мінска», «Гісторыі Беларускай ССР».

**1919 г.** У вёсцы Захарычы Мінскага раёна нарадзіўся Іван Кардаш, вучоны ў галіне гігіены і санітарыі. У 1949 - 1974 гадах намеснік міністра аховы здароўя, у 1970 - 1991-м загадчык кафедры Беларускага інстытута ўдасканалення ўрачоў. Памёр у 1993 годзе.

**1929 г.** У вёсцы Межная Слабада Клецкага раёна нарадзіўся Міхась Яраш, літаратуразнаўца і крытык. Даследаваў праблемы развіцця беларускай драматургіі, паэзіі, традыцый і наватарства, творчай індывідуальнасці. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі.

**Задачы:**

пазнаёміць выхаванцаў паміж сабой, з умовамі пражывання, распарадкам, правіламі пражывання ў цэнтры, з законамі, традыцыямі і рытуаламі "Зубронка", прадставіць адзіныя патрабаванні да выканання рэжымных момантаў;

стварыць пазітыўную, камфортную атмасферу;

пачаць вядзенне неабходнай педагагічнай дакументацыі;

правесці навучанне правілам бяспечных паводзін.

**У гэты дзень праводзіцца:**

заезд;

гаспадарчы збор;

гульні на знаёмства;

экскурсія па корпусу;

тэст-анкета "Ведаю – не ведаю";

МАР "7 Я";

модульны праект "Легенда на кожны дзень";

агеньчык знаёмстваў.

## Метад асобаснага развіцця “7Я”

**Задачы метаду:**

выяўляць эмацыянальны стан дзяцей ;

аналізаваць меркаванне дзяцей аб сабе;

выяўляць ўзровень самаацэнкі дзяцей.

**Матэрыялы:** лічбы “7”, выразаныя з паперы (памер лічбы - чвэрць ліста А4) , ручкі і каляровыя алоўкі.

**Алгарытм рэалізацыі метаду:**

***уводзіны (значэнне займенніка Я ў псіхалогіі)***

Пералік пытанняў для размовы: у якім значэнні можа ўжывацца займеннік “Я” (маё “эга” ); што ўключаецца ў паняцце “Я”; для чаго нам трэба ведаць з чаго складаецца наша “Я” і г.д.

***заданне “7- “Я”***

Педагог прапануе кожнаму падлетку зазірнуць у сябе і паспрабаваць вызначыць 7 асноўных якасцей свайго “Я” (сваёй індывідуальнасці) . Напрыклад: я - спакойны, я - вясёлы, я - таленавіты і г.д. Гэтыя якасці падлетак выпісвае на “лічбу 7”.

***аналіз вынікаў***

Педагог пытаецца ў падлеткаў , якія з тых якасцяў , якія яны напісалі, ім падабаюцца і чаму, якія не падабаюцца і чаму. Педагог прапануе дзецям падумаць і адказаць, як пазбавіцца ад таго, што не падабаецца і развіць тое, што падабаецца.

***рэфлексія***

Выхавальнік пазнае ў падлеткаў, ці даведаліся яны што-небудзь новае, ці збіраюцца распачаць штосьці для самаўдасканалення.

***Метадычныя рэкамендацыі:*** Няма неабходнасці прымушаць падлеткаў гаварыць, калі яны не жадаюць гэтага. Няхай паглядзяць на ўдзел іншых і паступова жаданне выказацца прыйдзе само. Галоўнае не забываць пра іх і перыядычна прапаноўваць ім выказацца.

## Тэст-анкета “Ведаю – не ведаю”

**Задача:** вызначыць веданне ўдзельнікамі змены асноўных паняццяў музеязнаўства

**Механізм рэалізацыі**. Дадзены метад праводзіцца ў два этапы:

**Першы этап.** Удзельнікі метаду пісьмова адказваюць на пытанні, звязаныя з музеязнаўчай тэрміналогіяй.

**Другі этап**: Пасля правядзення першага этапа на наступны дзень на атрадным месцы вывешваецца табліца з правільнымі азначэннямі і найбольш “крэатыўнымі” адказамі дзяцей.

| **Тэрмін** | **Думалі (адказы дзяцей)** | **Аказалася** |
|---|---|---|
| Музей | | Музей (ад грэч μουσεον -. Дом Муз) - установа, якая займаецца збіраннем, вывучэннем, захоўваннем і экспанаваннем прадметаў - помнікаў натуральнай гісторыі, матэрыяльнай і духоўнай культуры, а таксама асветніцкай і папулярызатарскай дзейнасцю. |
| Прадмет музейнага значэння | | Помнікі гісторыі, якія прадстаўляюць інтарэс для музея і якія **могуць увайсці** ў яго збор, але знаходзяцца ў сваім асяроддзі бытавання, што функцыяніруюць у жыцці або якія захоўваюцца ў уладальнікаў |
| Музейны прадмет | | Помнік гісторыі, забраны з асяроддзя існавання і **ўключаны** ў склад музейнага збору пасля яго навуковай апрацоўкі |
| Музейны экспанат | | Музейны прадмет, выстаўлены для агляду |
| Экспазіцыя | | Размяшчэнне ў музейных і выставачных залах або на адкрытым паветры па пэўнай сістэме помнікаў гісторыі, мастацкіх твораў і розных дапаможных матэрыялаў |
| Рарытэт | | Рэдкі, унікальны прадмет |
| Рэліквія | | Музейны прадмет, асабліва шануемы як памяць аб гістарычна значнай падзеі ці знакамітым чалавеку |
| Макет | | Аб’ёмная мадэль, якая адлюстроўвае знешні выгляд аб'екта і выкананая ва ўмоўным маштабе |
| Муляж | | Аб’ёмнае адлюстраванне вонкавага выгляду музейнага прадмета, якое дакладна перадае яго форму, памер і колер |
| Дыярама | | Экспазіцыйны комплекс, які спалучае твор жывапісу з аб’ёмным пярэднім планам (з размяшчэннем арыгіналаў або адлюстраванняў) |

**Модульны праект “Легенда на кожны дзень”**

У час прагулкі па беразе возера Нарач расказаць дзецям адну з легенд пра яго.

**ДЗЕНЬ ДРУГІ** (11 студзеня)

**Гэты дзень у календары**

**1699 г.** Пачаў выдавецкую дзейнасць Ілля Капіевіч (Капіеўскі), беларускі асветнік і кнігавыдавец, энцыклапедыст. Ім было складзена, перакладзена і выдадзена каля 20 кніг па гуманітарных, прыродазнаўчых, тэхнічных і ваенных абласцях ведаў. Ён з'яўляецца аўтарам першай на рускай мове зорнай карты.

**1944 г.** У ходзе Калінкавіцка-Мазырскай аперацыі быў вызвалены Ельскі раён. У вызваленні ўдзельнічалі: 415-я стралковая дывізія 61-й арміі Беларускага фронту і 37-я Ельская партызанская брыгада.

11 студзеня адзначаецца **міжнародны дзень “Дзякуй!”** (International Thank You Day)

*Усе мы добра ўсведамляем значэнне добрых манер, іх неабходнасць у паўсядзённым жыцці, але большую частку падзяк мы выказваем не задумваючыся аб іх сэнсе. Аднак, словы падзякі валодаюць магічнымі ўласцівасцямі – з дапамогай іх людзі дараць радасць адзін аднаму, выказваюць павагу і перадаюць станоўчыя эмоцыі – тое, без чаго наша жыццё стала б змрочным.*

*Нездарма ў многіх турыстычных даведніках для турыстаў часта рэкамендуецца слова “дзякуй”, вымаўленае нават з акцэнтам на мове краіны знаходжання, павышае хуткасць, якасць абслугоўвання і дапамагае наладзіць спакойны і прыемны адпачынак.*

*Псіхолагі ўпэўнены, што словы падзякі - гэта «вусныя пагладжванні», якія здольныя супакоіць і сагрэць сваёй цеплынёй. Галоўнае, каб словы падзякі прамаўляліся ад чыстага сэрца! Невыпадкова здаўна ў народзе існавала вельмі мудрае павер’е - не вымаўляй словы падзякі ў стане раздражнення* ( http://www.calend.ru).

**Задачы:**

стварацьумовы для адаптацыі падлеткаў у атрадзе, корпусе, цэнтры;

выяўляць схільнасці дзяцей, ступень зацікаўленасці зменай;

пазнаёміць выхаванцаў з праграмай змены, яе асноўнымі перыядамі, гульнёвай ідэяй, асноўнымі мерапрыемствамі змены;

вызначыць ступень зацікаўленасці падлеткаў ідэяй змены;

стварыць умовы для праяўлення лідарскіх якасцей у дзяцей.

**У гэты дзень праводзіцца:**

навучальная гульня “Х-фактар”;

экскурсія “Прывітанне, Зубронак”

мультыпарк “Гульня на любы густ”;

гульні на згуртаванне атрада і выяўленне лідараў;

навучальная гульня “Падрыхтоўка да экспедыцыі”;

модульны праект “Легенда на кожны дзень” (у час правядзення навучальнай гульні “Падрыхтоўка да экспедыцыі”;

дыскатэка.

### Навучальная гульня “Падрыхтоўка да экспедыцыі”

**Мэта:**

азнаямленне дзяцей з ідэяй і зместам змены “Я родным краем ганаруся”

**Задачы:**

пазнаёміць выхаванцаў з праграмай змены, яе асноўнымі перыядамі, гульнёвай ідэяй, асноўнымі мерапрыемствамі;

стварыць умовы для выўлення лідарскіх якасцей у дзяцей.

**Форма правядзення:** гульня па станцыях.

**Абсталяванне:** маршрутныя лісты, узор афармлення гульнёвага поля сістэмы індывідуальнага росту “Млын”, узор афармлення гульнёвага поля тэхналогіі эмацыянальна-сімвалічнай аналогіі “Нумізмат”, узор афармлення гульнёвага поля арганізацыйна-гульнёвага праекта “Музей археалогіі”.

**Парадак правядзення гульні**

Гульня праводзіцца па станцыях, на кожнай з якіх выхавацелі расказваюць пра той або іншы кампанет змены ў творчай або гульнёвой форме. Атрады перамяшчаюцца ад адной станцыі да другой у адпаведнасці з маршрутнымі лістамі. На кожнай станцыі выхавацель ацэньвае работу атрада і адзначае аднаго-двух найбольш актыўных удзельнікаў.

Час на правядзенне адной станцыі 5 хвілін.

Пасля таго як усе атрады пройдуць усе станцыі, адбываецца падвядзенне вынікаў на агульным зборы.

**Этапы гульні**

**1. Агульны збор**

**2. Гульня па станцыях**

**Станцыя 1 “Я родным краем ганаруся”** (тэматыка змены, перыяды змены, даследчая дзейнасць, конкурс “Я родным краем ганаруся”, мерапрыемствы змены)

*Заданне: Разбіваем дзяцей на чатыры групы і кожнай прапануем зрабіць інсцэніроўку адной з прыказак:*

Баба з калёс, а каня як чорт панёс.

За дурной галавой нагам неспакой.

Вырас пад неба, а дурань як трэба.

Не глядзі, каб скора, а глядзі, каб добра.

**Станцыя 2 “Ні хвіліны без справы”** (арганізацыйна-гульнёвы праект “Музей археалогіі”, модульныя праекты “Скарбы роднай мовы”, “Легенда на кожны дзень”)

***Заданне:*** *Складаем легенду пра гісторыю “Зубронка” ўсім атрадам. Для гэтага становімся ў круг і па чарзе кожны дапаўняе папярэдняга расказчыка адным сказам. Пачатак легенды: “Калісьці даўным-даўно на месцы, дзе зараз знаходзіцца “Зубронак” ...”*

**Станцыя 3 “Млын меле – мука будзе”** (сістэма індывідуальнага росту)

**Заданне:** (на ўвагу)

Вядучы , нічога не каментуючы, пяці жадаючым выдае лісток, на якім напісана наступнае:

*Памятайце, у вас ёсць толькі 40 секунд!*

*За гэты час паспрабуйце выканаць усе ніжэй прыведзеныя дзеянні :*

*1 . Прысядзьце 2 разы.*
*2 . Падскочце на левай назе 5 разоў.*
*3 . Падыміце ўверх абедзве рукі 2 разы.*
*4 . Уважліва прачытайце ўсе заданні.*
*5 . Гучна крыкніце сваё імя.*
*6 . Двойчы гучна мяўкніце.*
*7 . Пацалуйце любых 3 чалавекі.*
*8 . Павярніцеся вакол сваёй восі 3 разы.*
*9 . Гучна пасмяіцеся над вядучым гульні.*
*10 . Краніце рукой любых тры чалавекі.*
*11 . Падскочце на правай назе 5 разоў.*
*12 . Пасля таго, як вы прачыталі ўсе заданні, выканайце толькі заданні 13 і 14 .*
*13 . Прысядзьце на кукішкі.*
*14 . Пакладзіце ліст перад сабой на падлогу.*

**Станцыя 4 “Нумізмат”** (тэхналогія эмацыянальна-сімвалічнай аналогіі)

**Заданне:** *Гульня «Палічы да 15»*

*Для ўдзелу ў гульні ўсе садзяцца ў круг і заплюшчваюць вочы. Вядучы прапануе заданне: палічыць да 15, пры гэтым кожны лік называе хтосьці адзін (не дамаўляючыся паміж сабой). Калі адначасова назвалі адзін і той жа лік некалькі чалавек, то лік пачынаецца спачатку.*

**Станцыя 5 “Акадэмія музеязнаўства”** (аб’яднанне па інтарэсах)

**Заданне:** *Гульня на знаёмства*

*Гульня “Хто? Дзе? Калі? або КАРУСЕЛЬ”*

*Усе дзеці становяцца ў круг. Па сігналу выхавальніка ўдзельнікі перабудоўваюцца:*

*так, каб імёны размяшчаліся ў алфавітным парадку;*

*па месяцах нараджэння;*

*па знаках задыяку;*
*па захапленнях;*
*па колеру вачэй (ад самых светлых да цёмных);*
*па даўжыні валасоў;*
*па памеры рукі і іншых параметрах.*

**Станцыя 6 "Хачу пакіраваць"** (дзіцячае самакіраванне на ўзроўні атрада, корпуса, лагера)

*Тэст 2 «Прыкметы лідара» (За кожны адказ «так» пастаўце сабе па аднаму балу і падлічыце агульную суму)*

*1. Я не губляюся і не адыходжу ў цяжкіх сітуацыях.*
*2. Лёгка магу пераканаць у чымсьці маіх сяброў.*
*3. Мне звычайна атрымоўваецца дамагчыся, каб усе вакол добра працавалі.*
*4. Арганізуючы нейкую справу, імкнуся зацікавіць яго ўдзельнікаў.*
*5. Я рэгулярна ацэньваю сваю працу і свае поспехі.*
*6. Добра адчуваю настрой сваіх сяброў.*
*7. Звычайна я дасягаю таго, да чаго імкнуся.*
*8. Прымаючы рашэнне, я перабіраю некалькі варыянтаў.*
*9. Вырашаючы праблемы, выкарыстоўваю веды іншых.*
*10. Я гатовы рызыкаваць, каб атрымаць патрэбны вынік.*

***Ключ да тэста***

***1-3 балы.*** *У вас невялікі лідарскі патэнцыял. Хутчэй за ўсё, вы проста яшчэ не працавалі над яго актуалізацыяй. Вам варта задумацца над сваімі звычайнымі паводзінамі, натуральна, калі вы хочаце стаць лідарам, вызначаючым свой лёс.*
***4-6 балаў.*** *Ваш лад жыцця сведчыць аб тым, што вы ў асноўным самі вызначаеце ход вашага жыцця. Але вам ёсць яшчэ над чым папрацаваць, каб у яшчэ большай ступені кантраляваць падзеі, якія адбываюцца з вамі.*
***7-10 балаў.*** *Вы практычна цалкам кантралюеце жыццёвую сітуацыю. Відавочныя лідарскія схільнасці прыцягваюць да вас людзей. Вы атрымліваеце задавальненне ад сваёй дзейнасці. У вас у наяўнасці лідарскія якасці і здольнасці. Рабіце іх далей.*

**3. Падвядзенне вынікаў гульні.**

## ДЗЕНЬ ТРЭЦІ (12 студзеня)

### Гэты дзень у календары

**1989 г.** Прайшоў усесаюзны перапіс насельніцтва: у Беларусі – 10 151 800 чалавек (для параўнання: перапіс 1999 г. - 10 045 200 чалавек, перапіс 2009 г. - 9 503 800 чалавек).

**1999 г.** Аўтобусны філіял Мінскага аўтазавода выпусціў першы камфартабельны аўтобус "МАЗ" для міжнародных перавозак.

**Задачы:**
падвесці вынікі арганізацыйнага перыяду;
сфарміраваць органы атраднага самакіравання;
стварыць ўмовы для лідарскай і творчай рэалізацыі падлеткаў.

**У гэты дзень праводзіцца:**
прэзентацыя школы;
класныя гадзіны;
"Акадэмія музеязнаўства";
ДГ "Перспектыва;
модульны праект "Легенда на кожны дзень".

**Легенда "Адкуль пайшлі буслы"**

*(модульны праект "Легенда на кожны дзень")*

*Было гэта вельмі даўно. На зямлі развялося такое мноства гадаў, што не стала ад іх жыцця ні людзям, ні жывёле. І вырашыў адзін чараўнік знішчыць гадаў, патапіць у якойсьці бяздонніцы. Сабраў ён іх у вялізны скураны мяшок, завязаў, узваліў на плечы аднаму неразумнаму чалавеку і загадаў укінуць у паказанае прадонне. Як толькі чалавек рушыў з месца, то ўсе гады, якія былі ў мяшку, заварушыліся, засіпелі, засвісталі. І ўзяла чалавека цікаўнасць, што ён такое прэ.*

*Чалавек развязаў торбу ды і аслупянеў ад жаху. Гады ж тым часам вылезлі і распаўзліся ізноў па зямлі.*

*Разгневаны чараўнік не захацеў другі раз збіраць гэтую дрэнь і, накінуўшы на чалавека парожні мяшок, ператварыў яго ў бусла і загадаў збіраць гадаў-уцекачоў усё яго жыццё аж да самай смерці.*

*І ходзіць гэты ператвораны ў бусла чалавек з накінутым на плечы мяшком па лугах, палях, балотах ды збірае гадаў, але да гэтае пары ніяк сабраць не можа. З прычыны сваёй роднасці да чалавека гэты пярэварацень не адыходзіць далёка ад людскіх сяліб і мала баіцца людзей.*

## ДЗЕНЬ ЧАЦВЁРТЫ (13 студзеня)

**Гэты дзень у календары**

**1899 г.** Нарадзіўся Корж Васіль Захаравіч (1899-1967, Салігор. р-н), ваенны дзеяч, генерал-маёр, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1944 г.). У гады Вялікай Айчыннай вайны сфарміраваў і ўзначаліў у Пінскім раёне адзін з першых у Беларусі партызанскіх атрадаў, які з ліпеня 1941 вёў баі з фашыстамі.

**1939 г.** Нарадзіўся Ермашкевіч Васіль Мікітавіч, беларускі вучоны ў галіне ядзернай і нетрадыцыйнай энергетыкі, доктар тэхнічных навук (1991).

Аўтар навуковых прац па працэсах гарэння паліва ў вадкасных ракетных рухавіках, стварэнню ядзерных энергетычных установак, выкарыстанню аднаўляльных крыніц энергіі ў Беларусі.

**1939 г.** Нарадзіўся Кавалёў Анатоль Анатольевіч, беларускі навуковец, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (1989), доктар фізіка-матэматычных навук (1988), прафесар (1991). Аўтар больш за 220 навуковых прац і 34 вынаходак. Навуковыя даследаванні ў галіне лазернай фізікі і аптычнай апрацоўкі інфармацыі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1985) і Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1996).

**У ноч з 13 на 14 студзеня** адзначаюць *стары Новы год (Васільеў вечар, Калядныя святкі).* Васільеў вечар лічыцца самым лепшым часам для варажбы. Шчодры стол у гэты дзень - дастатак на працягу ўсяго года. Садоўнікі у поўнач стрэсваюць снег з яблынь - для ўраджаю. Прыкмячалі, калі ў ноч вецер дзьме з поўдня - год будзе гарачым і добрым, з захаду - да багацця малака і рыбы, з усходу - чакай ўраджаю садавіны.

**Задачы:**

арганізаваць работу па рэалізацыіі арганізацыйна-гульнёвага праекта “Музей археалогіі”;

стварыць умовы для рэалізацыі спартыўнага патэнцыялу дзяцей;

садзейнічаць развіццю цікавасці да беларускай мовы і гісторыі роднага краю;

стварыць святочную атмасферу.

**У гэты дзень праводзіцца:**

свята адкрыцця змены;
старт арганізацыйна-гульнёвага праекта “Музей археалогіі”;
модульны праект “Скарбы роднай мовы”;
спаборніцтвы па шашках і шахматах;
модульны праект “Легенда на кожны дзень”;
дыскатэка.

### Арганізацыйна-гульнёвы праект “Інстытут археалогіі”

З сённяшняга дня археалагічная экспедыцыя распачыная раскопкі. На ранішняй размове вам патрэбна зняць першы культурны слой, за якім вы знойдзеце фрагменты нейкіх рэліквій, якія звязаны с гісторыяй Беларусі. Ваша задача: трэба правесці даследаванне гэтых прадметаў і прадставіць у вучоны савет справаздачу, а таксама пачаць вывучэнне наступнага культурнага слоя.

### Модульны праект “Скарбы роднай мовы”

Адным з самых ёмістых увасабленняў народнага рацыянальнага пачатку з’яўляюцца прыказкі і прымаўкі. Невыпадкова іх называюць практычнай філасофіяй народа.

Ваша задача: знайсці эквівалент у рускай мове прыведзеных ніжэй прыказак і прымавак:

*Трэба нахіліцца, каб з ручая напіцца.*
*Бачыў Бог, што не даў свінні рог, бо ўвесь свет спарола б.*
*Прыйдзе, тата, і наша свята.*
*Калі даўся запрэгчы, то дайся й паганяць.*
*Сядзь, няхай полы не вісяць.*
*Баючыся ваўкоў, застанешся без грыбоў.*
*Цесна сядзець, ды добра глядзець.*
*Ціхая свіння глыбока рые.*
*Звыш лобу вочы не ходзяць.*
*Перш папрацуй, а тады й патанцуй.*

**Легенда пра Белавежскую пушчу**

*(модульны праект "Легенда на кожны дзень")*

*Са старажытных часоў Белавежская пушча славіцца як унікальны прыродны комплекс у Еўропе. З 14 стагоддзя яна была месцам, дзе палявалі польскія каралі, а з канца 18 — царская сям'я і набліжаная да яе шляхта.*

*Прыгожай была Белавежская пушча ў мінулым. Статкі ласёў, дзікіх коз, дзікоў хадзілі па лясах. Зайцоў – процьма. Паветра напоўнена водарам кветак, саснова-яловай смалы, папараці, чабору, шыпшыны, пахам лясных ягад, грыбоў.*

*Многіх людзей, якія бываюць у Белавежскай пушчы і якія жывуць тут, цікавіць пытанне: адкуль пайшла такая назва? Некаторыя лічаць, што гэта па вялося з лёгкай рукі краязнаўцаў 14 стагоддзя, якія памылкова лічылі, што назва пайшла ад Белай вежы. Камянецкую вежу нярэдка называюць Белай. Збудаванні тыпу Камянецкай вежы называюцца данжонамі. У старажытнасці данжоны бялілі. Адсюль і пайшла назва Белавежскай пушчы. Па сутнасці ж, Камянецкая вежа ніколі белай не была. Бяліліся толькі нішы, што размешчаны на ўзроўні пятага яруса. Аднак аб назве Белавежскай пушчы і яе наваколля ў народзе бытуюць легенды, паданні, народныя выдумкі, казкі з адлюстраваннем рэальных падзей, сведкамі якіх былі нашы далёкія продкі. Адной з такіх легенд і з'яўляецца вось гэтая.*

*На працягу амаль стагоддзя Камянец і Белавежская пушча служылі апорным пунктам ва ўзброеных сутычках паміж Літоўскай дзяржавай і Польшчай. З 1366 года Каменец у ВКЛ быў ва ўдзеле князя Кейстута, потым (з 1392 года) князя Вітаўта. Князь Вітаўт падараваў сваёй дачцэ ўгоддзі пушчы, бо яна любіла прыроду: розныя кветачкі, кусточкі, лісточкі, шчэбет розных птушак, размову звяроў. Яна разумела, якая жыўнасць на што жаліцца, якая дапамога ёй патрэбна. Любіла наведваць запаведныя мясціны пушчы. Часта аглядала свае ўгоддзі з самага верху Камянецкай вежы. Гэта была самая прыгожая дзяўчына на ўсю ваколіцу: доўгая белая каса, чорныя бровы. Яна вельмі любіла ўборы белага колеру. Узімку насіла футра з белага меху. Улетку –*

*белую сукенку і белы капялюш. Людзі называлі яе белай княжной. Яна была настолькі прывабнай, што ніхто не мог прайсці міма, каб не палюбавацца яе красой. Жаночая краса – адзін з цудаў прыроды. Яна неаддзельная ад кахання, а каханне злучаецца з вечнасцю. Разам з тым яна і чароўная агалёнасць, і часцінка быцця і свету чалавечнасці. І пакахаў гэтую прыгажуню сын польскага князя Ягайлы. Цудоўнае каханне было ў маладых. Яны абое любілі прыроду з яе лясамі і жыўнасцю. Вельмі часта марылі, як захаваць для нашчадкаў гэтую прыгажосць. У 1383 годзе князь Януш Мазавецкі, выкарыстаўшы міжусобную барацьбу вялікага князя Ягайлы з Вітаўтам, захапіў Камянец і ўгоддзі пушчы. Каханне маладых людзей было такое вялікае, што яны не маглі жыць адзін без аднаго. Нягледзячы на тое, што бацькі не былі ў згодзе, вырашылі пажаніцца. Дзяўчына чакала свайго каханага ля сцен Камянецкай вежы. Адсюль яны прыехалі ў горад, які цяпер называецца Беласток. Але праз год Ягайла пасля тыднёвай асады ўзяў штурмам Камянец з яго ўгоддзямі. Памірыўшыся з Ягайлам (1384г.), Вітаўт далучыў Камянец да сваіх зямель. Вось тут і вырашылі бацькі ўзаконіць шлюб сваіх дзяцей. Шлюбны рытуал правялі ў Камянцы. Адсюль на белых конях, у белай калясніцы, у белым убранні жаніх і нявеста, аб'ехаўшы тры разы Камянецкую вежу, накіраваліся ў горад, які зараз называецца Белавеж. Тут маладыя пасяліліся. Дарога, па якой ехалі, была ўсланая белым палатном, якое ткалі з ільну жанчыны пушчанскіх вёсак, затым адбельвалі ў рэчцы. На паверсе замка, дзе жылі маладыя, былі вежы, пафарбаваныя ў белы колер. Усё, што было звязана з белай княжной, атрымала адпаведныя назвы: на польскім баку - гарады Бяла-Падляска, Беласток, Белавеж, а ў Камянецкім раёне – Белая вежа, Белавежская пушча, вёскі Падбела, Падбельскія Агароднікі, Белая і рака Белая. (http://www.usebelarusy.by)*

## ДЗЕНЬ ПЯТЫ (14 студзеня)

**Гэты дзень у календары**

**1894 г.** Дата нараджэння мовазнаўца Пятра Юргялевіча. Даследаваў сучасную беларускую літаратурную мову, народныя гаворкі і іх асаблівасці, гісторыю беларускай мовы. Выдаў «Нарысы Сучаснай беларускай мовы з гістарычнымі каментарыямі», «Курс Сучаснай беларускай мовы з гістарычнымі каментарыямі».

**1904 г.** Нарадзіўся Васіль Севярдзенка, вучоны ў галіне металазнаўства. Акадэмік НАН. Аўтар больш за 700 навуковых прац. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**1934 г.** Нарадзіўся Лазоўскі Уладзімір Міхайлавіч (Навагруд. р-н 1934 - 2007), мовазнаўца, педагога, які ўнёс значны ўклад у развіццё тэарэтычных праблем беларускай мовы і беларускай лінгвадыдактыкі;

**1939 г.** Нарадзіўся Шаранговіч Васіль Пятровіч (Мядзел. р-н), графік, педагог, народны мастак Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, заслужаны дзеяч культуры Польшчы, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1986 г.);

**Стары Новы год.**

**Задачы:**

пашырыць веды ўдзельнікаў змены па краязнаўству і музеязнаўству;

забяспечыць арганізацыю абароны конкурсных праектаў у намінацыі “Прыродная спадчына” і “Табе, Беларусь, нашы праца і талент”;

спрыяць фарміраванню дабразычлівых адносін у калектыве;

паглыбіць веды падлеткаў па гісторыі НДЦ “Зубронак”.

**У гэты дзень праводзіцца:**

“Акадэмія музеязнаўства”;

абарона конкурсных праектаў у намінацыях “Прыродная спадчына” і “Табе, Беларусь, нашы праца і талент”;

метад асобаснага развіцця “Падары ўсмешку”;

конкурс-агляд атрадных месцаў;

модульны праект “Скарбы роднай мовы”;

модульны праект “Легенда на кожны дзень”;

важацкі вечар “Чароўнае пяро Цуд-птушкі”

## Модульны праект “Скарбы роднай мове”

У першы дзень змены вас пазнаёмілі з законамі і традыцыямі нашага цэнтра. А як бы гэта гучала на беларускай мове? Ваша задача: ажыццявіць пераклад на беларускую мову законаў і традыцый цэнтра.

## Метад асобаснага развіцця “Падары ўсмешку”

**Задачы метаду:**

ствараць сітуацыю поспеху;

ствараць умовы для згуртавання часовага дзіцячага аб’яднання;

развіваць камунікатыўныя здольнасці падлеткаў.

**Матэрыялы:** лісты паперы, нажніцы, каляровыя алоўкі, фламастары.

**Алгарытм рэалізацыі метаду:**

***увядзенне ў метад***

*Гутарка «Вялікая сіла ўсмешкі».* Педагог з дзецьмі абмяркоўвае значэнне ўсмешкі для чалавека. Якой сілай валодае ўсмешка? Якія выпадкі вядомыя дзецям, дзе важную ролю адыграла ўсмешка ў жыцці чалавека?

***рэалізацыя метаду***

Дзецям прапануецца вырабіць з паперы “ўсмешку”. Затым кожны падлетак уручае ўсмешку таму, хто, на яго думку, мае патрэбу ў гэтым. Пры гэтым абавязкова трэба сказаць нешта прыемнае, добрае, ласкавае.

***рэфлексія***

Педагог абмяркоўвае з дзецьмі, ці спадабалася ім дарыць усмешкі. Чаму? Атрымліваць усмешкі? Чаму? Ці трэба дарыць усмешкі? У якіх выпадках? Каму?

**Метадычныя рэкамендацыі:** чалавек, якому уручылі ўсмешку, мае права распараджацца ёю па ўласным жаданні: можа пакінуць у сябе або прымацаваць на сваю гульнявую тэрыторыю.

**Легенда “Чаму конь ніколі не пад’есць”**

*(модульны праект “Легенда на кожны дзень”)*

*Вядома, што вол паесць трохі і ляжа, а конь есць-есць і ніколі не пад’есць. А чаму гэта так? Таму што калісьці хадзілі па свеце вандроўнікі-чараўнікі, і трэба было аднаму такому падарожнаму перайсці цераз раку.*

*Спачатку ён папрасіў каня:*

*— Перавязі мяне.*

*А конь кажа:*

*— Я яшчэ не пад’еў.*

*Тады падарожны — да вала:*

*— Перавязі мяне, волiку, цераз ваду.*

*Волік:*

*— Сядай, зараз перавязу.*

*Сеў падарожны на вала, і той перавёз яго на другі бок. Вось за тое вол хутка пад’есць і адпачывае, а конь есць дзень і ноч і не можа наесціся.*

## ДЗЕНЬ ШОСТЫ (15 студзеня)

**Гэты дзень у календары**

**Дзень нараджэння Вікіпедыі**

**1894 г.** Нарадзіўся Васіль Нямчынаў, вучоны-эканаміст. Акадэмік НАН Беларусі, АН СССР, УАСГНІЛ, доктар эканамічных навук, прафесар. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі. Аўтар 330 навуковых прац.

**1909 г.** У вёсцы Калкі Віцебскага павета нарадзіўся палкавы камісар Яфім Фамін, адзін з кіраўнікоў абароны Брэсцкай крэпасці. 22 чэрвеня 1941 арганізаваў і ўзначаліў абарону ля Холмскіх варот цытадэлі. Цяжкапаранены Фамін трапіў у палон, расстраляны немцамі 30 чэрвеня 1941.

**1924 г.** Нарадзіўся Міхаіл Курбат, удзельнік вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, Герой Савецкага Саюза. Памочнік камандзіра ўзвода малодшы сяржант Курбат асабліва вызначыўся падчас прарыву абароны

працiўнiка на рацэ Проня i вызвалення Магiлёва. Загiнуў ў 1944 годзе пры фарсiраваннi Нёмана. Яго iмем названа вулiца ў Гродне.

**1929 г.** Пачалося выданне Койданаўскай (цяпер Дзяржынскай) раённай газеты «Чырвоны койданавец» - адной з першых раённых газет у Беларусі.

**1934 г.** У Клецку нарадзіўся Якуб Аляксандравіч, вучоны-эканаміст, доктар эканамічных навук, прафесар. Аўтар навуковых прац па праблемах прагназавання сацыяльна-эканамічнага развіцця, інтэнсіфікацыі нацыянальнай эканомікі.

**1938 г.** У Беларусі створаны першыя вобласці: Віцебская, Гомельская, Мінская, Магілёўская і Палеская (існавала да 1954 года). Да гэтага тэрыторыя дзялілася на губерні, а з 1924 года на акругі.

**Задачы:**

забяспечыць арганізацыю абароны конкурсных праектаў у намінацыі “Тапаніміка родных мясцін” і “Скарбы роднай мовы”;

пашырыць веды падлеткаў па гісторыі беларускай дзяржавы;

пазнаёміць удзельнікаў змены з асновамі дзяржаўнай маладзежнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь;

арганізаваць падрыхтоўку да “Стартынэйджара”;

падвесці вынікі гульнёвага перыяду “Прыродная спадчына”;

садзейнічаць раскрыццю творчага патэнцыялу дзяцей.

**У гэты дзень праводзіцца:**

абарона конкурсных праектаў у намінацыях “Тапаніміка родных мясцін” і “Скарбы роднай мовы”;

падрыхтоўка да “Стартынэйджара”;

пазнавальна-забаўляльная гульня “Што павінен ведаць кожны беларус?”

модульны праект “Скарбы роднай мовы”;

модульны праект “Легенда на кожны дзень”;

агеньчык “Легенды і паданні роднага краю”.

## Пазнавальна-забаўляльная гульня “Што павінен ведаць кожны беларус”

Для ўдзелу ў гульні кожны атрад выстаўляе каманду з 6 чалавек. Кожная каманда павінна падрыхтаваць візітку, у якой прадставіць: назву каманды, капітана, дэвіз (улічваецца адпаведнасць тэме змены гульні). Працягласць – не больш за 1 хвіліну.

Этапы гульні:

1 этап – “Візітка”;

2 этап – “Тэст на беларуса” (веданне гісторыі, культуры, геаграфіі Беларусі);

3 этап – “Дзяржаўныя сімвалы Беларусі”;

4 этап – “Моладзь Беларусі” (дзіцячыя і маладзёжныя грамадскія аб’яднанні);

5 этап – “Што яшчэ павінен ведаць кожны беларус?”.

**Модульны праект “Скарбы роднай мовы”**

З кожным годам у беларускай мове ўсё больш з’яўляецца запазычаных з іншых моў слоў. Ці заўсёды маецца патрэба ў такой замене? Ваша задача: да запазычаных слоў падбярыце беларускамоўныя сінонімы.

*Максімальны, лаканічны, эталон, аморфны, эмоцыя, гіпотэза, карэкцыя, баланс, ін’екцыя, гіпербала, дэфект, вібрацыя, ілюзорны, альянс, рэзюме, сурагат, селекцыя, інтэлект, фантом, вердыкт, рэанімацыя, прыярытэт, дыскусія, пранонс, фрагмент, аргумент.*

**Модульны праект “Легенда на кожны дзень”**

А легендай сённяшняга дня стане легенда пра свой родны край, якую вы павінны будзеце расказаць на агеньчыку “Легенды і паданні роднага краю”.

**Агеньчык “Легенды і паданні роднага краю”**

Як адзін з варыянтаў правядзення – прапанаваць кожнаму выхаванцу падрыхтаваць і расказаць легенду пра свой родны край. На агеньчыку таксама можна абраць і абмеркаваць легенду для інсцэніроўкі на конкурс “Легенда за легендай”.

## ДЗЕНЬ СЁМЫ (16 студзеня)

**Гэты дзень у календары**

**1919 г.** Нарадзіўся Алоўнікаў Уладзімір Уладзіміравіч (г.Бабруйск 1919 - 1996), кампазітар, грамадскі дзеяч, Народны артыст Беларусі, Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. Аўтар сімфанічных твораў “Партызанская быль”, “Нарач”, музыкі да спектакляў і кінафільмаў («Дзяўчынка шукае бацьку», «Балада пра маці»), шырока вядомай песні «Радзіма мая дарагая».

**1919 г.** ЦК РКП (б) прыняў рашэнне аб стварэнні Літоўска-Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (ЛітБел) у складзе Віленскай, Мінскай, часткі Ковенскай і Гродзенскай губерняў. Пасля падпісання мірнага дагавору паміж РСФСР і Літвой (1920/07/12) і абвяшчэння незалежнасці БССР ЛітБел юрыдычна спыніла існаванне.

**1924 г.** Дата нараджэння Пятра Зюлькова, Героя Савецкага Саюза. У гады Вялікай Айчыннай вайны камандзір узвода кіравання батарэі мінамётнага палка вызначыўся пры вызваленні Магілёўскай вобласці. 27 чэрвеня 1944 года ў баі за вёску Трылесіна сваім целам закрыў амбразуру варожага дзота.

**Задачы:**

забяспечыць арганізацыю абароны конкурсных праектаў у намінацыі “Родныя даты” і “Знакамітыя землякі”;

арганізаваць падрыхтоўку да “Стартынэйджара”;

садзейнічаць раскрыццю творчага патэнцыялу дзяцей.

**У гэты дзень праводзіцца:**

майдадыр;

“Акадэмія музеязнаўства”;

абарона конкурсных праектаў у намінацыях “Родныя даты” і “Знакамітыя земляকі”;

модульны праект “Скарбы роднай мовы”;

модульны праект “Легенда на кожны дзень”;

дыскатэка “Стартынэйджар”.

## Модульны праект “Скарбы роднай мовы”

*Карысная інфармацыя “Моўны этыкет і культура зносін”*

Амаль любая прафесія цесна звязана з пастаянным кантактаваннем з рознымі людзьмі, з пэўным уздзеяннем на іх унутраны свет, з маральнымі ўзаемаадносінамі, што вымагае высокай культуры моўных зносін. Узровень моўных зносін сведчыць пра агульную культуру чалавека, яго адукаванасць і выхаванасць. Моўны этыкет, які з’яўляецца неадлучнай часткай моўнай культуры, - гэта ўсталяваныя грамадствам правілы моўных паводзін, якія рэалізуюцца ў сістэме ўстойлівых формул і выразаў. У моўным этыкеце кожнага народа праяўляецца яго нацыянальная спецыфіка, адметнасць ладу жыцця, звычаі і традыцыі. Веданне моўнага этыкету свайго народа, уменне карыстацца ім у розных жыццёвых

сітуацыях – адзін са складальнікаў прафесійнай этыкі.

У беларускім маўленчым этыкеце існуе цэлы шэраг выразаў, формул вітання : *Добры дзень! Дзень добры!Добры вечар! Вечар добры! Маё шанаванне! Здарова! Вітаю!*

Звычайна пасля прывітання ўжываюцца пытанні-звароты ветлівасці : *Што чуваць? Як маешся (маецеся)? Што новага? Як працуецца? Як жыццё? Як здароўе?*

У адказ пасля слоў падзякі ў залежнасці ад удзельнікаў гаворкі і абставін (*Дзякуй! Або Дзякуй за памяць! Дзякуй за добрае слова Дзякуй на добрым слове!*) могуць прагучаць наступныя словы або выразы: *Нічога сабе! Так сабе! Добра! Някепска! Памаленьку!*

Асобная роля ў моўным этыкеце надаецца развітанню. Выказаныя з непадробнай шчырасцю, цеплынёй і добразычлівасцю словы развітання падразумявалі далейшыя прыязныя дачыненні і наступныя сустрэчы: *Бывай! Бывайце! Бывайце здаровы! Да сустрэчы! Усяго Вам добрага! Усяго*

*найлепшага! Даруйце (выбачайце), калі што не так! Да пабачэння! Да новага спаткання! Пабачымся! Да заўтра! Шчасліва! Шчаслівай дарогі! Дазвольце з Вамі развітацца!*

Пры просьбе зрабіць якую-небудзь паслугу звычайна гучаць наступныя ветлівыя словы: *Калі ласка! Будзьце ласкавы!*

У адказа за паслугу выкарыстоўваюцца словы падзякі: *Дзякую вам! Вельмі ўдзячны вам! Шчыры дзякуй вам! Шчыра дзякую! Вельмі дзякую!*

Як форма падзякі за гасцінец, падарунак або нейкую рэч найчасцей ужываецца: *Вялікі дзякуй! Дзякуй!*

У адказ на падзяку ў залежнасці ад сітуацыі можна адказаць: *Няма за што! Еш на здароўе! (за яблык) Насі здаровы! (за адзенне, абутак) Пі на здароўе (за сок). Спажывай на здароўе! На спажытак Вам!*

Папрасіць прабачэння ў таго, каму зрабілі непрыемнасць, сказалі рэзкія, але справядлівыя словы, можна выкарыстоўваць наступныя выразы моўнага этыкету: *Прабачце! Даруйце, калі ласка! Выбачайце! Не крыўдуйце!*

Пэўнай увагі патрабуе разгляд формаў-звароткаў да асобы. Самай распаўсюджанай формай звароткy ў савецкія часы была форма “таварыш”, якую вымаўлялі, звяртаючыся як да мужчыны, так і да жанчыны. Сёння гэтая форма найбольш ужывальная ў асяродку вайскоўцаў (таварыш генерал, таварышы афіцэры).

У наш час у беларускі моўны этыкет вернутыя да жыцця старабеларускія словы-звароты, такія як *спадар, спадарыня, спадары, спадарства, шаноўны спадар*. На захадзе Беларусі яшчэ і сёння бытуюць звароткі *шаноўная спадарыня, шаноўнае спадарства, пан, пані, паненка, панове.*

У беларускай народнай традыцыі захоўваеццца і такая неафіцыйная форма звароткy: *Цётка! Дзядзька! Бабуля! Дзядуля!* Гэтыя словы ўжываюцца разам з імем або прозвішчам: *цётка Ганна, дзядзька Іван, бабуля Маня.*

Пры звароце да маладзейшай асобы шырока ўжываецца наступная неафіцыйная форма: *Сынок! Дачушка! Унучак!*

Нацыянальная спецыфіка моўнага этыкету праяўляецца ва ўжыванні клічных формаў звароткy ( назоўнікі м.р.): *Алесю! Браце! Сыне! Дзеду! Іване!*

**Ваша заданне:** перакладзіце на беларускую мову наступныя словазлучэнні:

Неудивительно
На этих днях
В другой раз
Становиться тише
Жениться на ней
Удивляться чему-то
Извините меня
Дом в пять этажей

Несколько раз в неделю
По этой причине

**Легенда пра Месяц**

*(модульны праект "Легенда на кожны дзень")*

*Былі ў бацькі два сыны, два ўдалыя малойцы. Не захацелі яны жыць дома, рабіць чорную мужыцкую работу, а пайшлі ў свет шукаць лёгкага хлеба ды добрага жыцця. Выйшлі яны з дому разам дый пайшлі па адной дарозе, але хутка падышлі да раздарожжа. От большы і кажа:*

*— Чаго нам хадзіць разам? Разам мы знойдзем толькі адно дабро, а як пойдзем асобна, то можам трапіць на два.*

*— Хадзем асобна,— пагадзіўся малодшы брат,— але калі хто на што-небудзь натрапіць, што дабудзе, то тое будзе яго, тое зробіць яму славу.*

*Як сказалі яны, так і зрабілі. Большы пайшоў направа, а меншы — налева.*

*Свет вялікі. Доўга яны хадзілі, доўга шукалі шчасця; кожны па-свойму шукаў тое, што яму падабалася. Большы брат прыйшоў у чужое царства, наняўся там на службу да аднаго багатага і знакамітага пана. А той пан ездзіў аж да самога цара дый браў з сабою свайго вернага ды лоўкага слугу. Пабачыў раз яго цар, упадабаў дый забраў да сябе. Жыве большы брат у цара пан панам, усяго яму даволі, хіба ж птушынага малака не хапае. Жыве, ніякай бяды не ведае.*

*Доўга хадзіў і малодшы брат па ўсім свеце, шмат бачыў і добрага і ліхога, але ліхога больш, чым добрага. Яму не хацелася сядзець ды спажываць тое дабро, якое меў, але хацелася ўсё ўбачыць, усё паспрабаваць, ці то салодкае, ці то горкае. От так ён хадзіў як непрыкаяны, пакуль натрапіў і сам туды, дзе быў большы брат.*

*І пачаў ён там вучыць людзей, як на свеце жыць, каб усім было добра, каб усе былі шчаслівыя. Пайшлі пра яго гаварыць вакол, пачалі да яго збірацца людзі ды слухаць разумныя рэчы.*

*Дачуўся большы брат, пайшоў і ён паглядзець, які такі з'явіўся мудрэц, што вучыць ды бунтуе людзей. Прыйшоў, але не пазнаў брата, паслухаў дый данёс цару, што з'явіўся такі-сякі чалавек, які бунтуе народ. Узлаваўся цар дый загадаў схапіць бунтара. Захацеў большы брат яшчэ лепей выслужыцца перад царом, сабраў хеўру царскіх слуг, пайшоў ды забіў меншага брата. Але яму стала так прыкра і страшна, што не ведаў, куды дзецца.*

*От бяжыць ён аб ноч праз лес, зірне на Месяц, аж і той бяжыць, пераймае яго. Ён стане, дык і Месяц стане. Ён пабяжыць, дык і Месяц пабяжыць. Бег ён, бег, пакуль не выбіўся з сілы ды не ўпаў. Ляжыць ён ды пазірае на Месяц. Прыгледзеўся, аж там і бачыць, як брат забівае брата. Тады ён і здагадаўся, каго гэта забіў сваімі рукамі. Але тут і дух з яго далоў.*

*От з тых часоў заўсёды відаць, што на Месяцы стаіць брат над забітым братам. (http://bellib.org)*

## ДЗЕНЬ ВОСЬМЫ (17 студзеня)

**Гэты дзень у календары**

**1904 г.** Нарадзіўся Якімовіч Алесь (Аляксандр Іванавіч; Уздз. р-н, 1904-1979,) пісьменнік, адзін з заснавальнікаў беларускай дзіцячай літаратуры, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1974 г.).

**1971 г.** У Мінску пастаноўкай героічнай музычнай камедыі Ю.Семянякі "Спявае "Жаваранак" адкрыты Дзяржаўны тэатр музычнай камедыі (з 1999 года - Беларускі дзяржаўны музычны тэатр).

**1999 г.** У вёсцы Бездзеж Драгічынскага раёна адкрыты музей народнай творчасці "Бездзежскі фартушок". Экспазіцыя размешчана ў шасці залах. Сабраны багаты матэрыял ткацтва і вышыўкі майстрых Бездзеж і прылеглых вёсак.

**Дзень дзіцячых вынаходак**

*Спачатку пытанне. Ці ведаеце вы, што аб'ядноўвае водныя лыжы, футравыя навушнікі, фруктовае марозіва на палачцы і шрыфт Брайля? Так, усе гэтыя відавочныя сёння прадметы былі вынайдзены дзецьмі.*

*Штогод больш за 500 тысяч дзяцей і падлеткаў вынаходзяць розныя гаджэты і гульні, ствараюць і мадыфікуюць робатаў і тэхніку. Усе дзіцячыя вынаходкі, несумненна, робяць наша жыццё зручней і цікавей. І сёння менавіта той дзень, у які трэба парадавацца вынаходлівасці юных геніяў, ацаніць значнасць іх шматлікіх вынаходстваў і заахвоціць рознабаковыя дзіцячыя таленты.*

*Сёння ва ўсім свеце адзначаецца* ***Дзень дзіцячых вынаходак*** *або, у іншым перакладзе, Дзень дзяцей- вынаходнікаў ( Kid Inventors  Day) . Сімвалічна, што датай Дня абраны дзень нараджэння аднаго з знакамітых амерыканцаў - дзяржаўнага дзеяча, дыпламата, вучонага, вынаходніка, журналіста Бенджаміна Франкліна (Benjamin Franklin). Выдатна, што сваё першае вынаходства - пару ласт для плавання, якія апраналіся на рукі, - Бэн Франклін вынайшаў ва ўзросце 12 гадоў.*

*Сцяг Аляскі – таксама дзіцячае вынаходства. Юны суайчыннік Франкліна, 13-гадовы Бенні Бенсон ў 1926 годзе адправіў свой эскіз на конкурс Дзяржаўнага сцяга Аляскі. Сіні колер, які сімвалізуе неба і афіцыйную кветку штата – незабудку, малюнак сузор'я Вялікай Мядзведзіцы і Палярнай зоркі прывялі хлопчыка да перамогі. Несумненна, сцяг Аляскі і сёння выглядае вельмі стыльна.*

*А батут? Ідэя яго стварэння, здавалася б, ляжала на паверхні. І вось у 1930 годзе, назіраючы за спаборніцтвамі паветраных гімнастаў, нейкі Джордж Нісэн звярнуў увагу на тое, як гімнасты ў канцы свайго выступлення скачуць на страхавачную сетку. 16-гадовы падлетак задумаўся і вырашыў змайстраваць «падскокваючую ўстаноўку» , на якой можна было б  падскокваць і выконваць розныя трукі ў паветры.*

*Можна пералічваць дзіцячыя вынаходкі бясконца, успамінаючы і пальчаткі без пальцаў, і папяровы пакет з квадратным дном, і калькулятар - усё гэта прынеслі ў наша жыццё геніяльныя розумы юных вынаходнікаў.*

**Задачы:**

забяспечыць арганізацыю абароны конкурсных праектаў у намінацыях “Маўклівыя сведкі гісторыі” і “Невычэрпныя крыніцы гісторыі”;

садзейнічаць інтэлектуальнаму развіццю дзяцей;

стварыць умовы для рэалізацыі творчага патэнцыялу падлеткаў;

падтрымаць пазітыўны настрой дзяцей;

арганізаваць аздараўленне дзяцей з выкарыстаннем прыродна-кліматычных фактараў.

**У гэты дзень праводзіцца:**

абарона конкурсных праектаў у намінацыі “Скарбы роднай мовы”;

шосты школьны дзень;

конкурс малюнкаў “Сімвалы “Зубронка”;

модульны праект “Скарбы роднай мовы”;

модульны праект “Легенда на кожны дзень”;

<u>падвядзенне вынікаў першага гульнявога перыяду “Музея археалогіі”;</u>

дыскатэка.

**Конкурс малюнкаў “Сімвалы “Зубронка”**

Конкурс праводзіцца паміж атрадамі. На працягу дня ў любой тэхніцы робіцца малюнак (фармат А4) таго, што атрад лічыць сімвалам НДЦ “Зубронак”. Работы размяшчаюцца на атрадным месцы, дзе іх ацэньвае Музейны нагляд. Атрад можа прадставіць на конкурс некалькі работ.

**Модульны праект “Скарбы роднай мовы”**

У кожнага корпуса ў НДЦ “Зубронак” ёсць свой слоган. Ваша задача: зрабіць пераклад на беларускую мову корпусных слоганаў усіх карпусоў цэнтра (прыгожы творчы пераклад).

**Легенда “Чым болей хто мае, тым болей жадае, або адкуль мядзведзі на свет узяліся”**

*(модульны праект “Легенда на кожны дзень)*

*Жыў сабе чалавек бедны ўдваіх з жонкаю. Паехаў гэта ён у лес па дровы і, аблюбаваўшы старую ліпу, прыгатаваўся ссячы яе. Але як толькі сакануў у ліпу, дык ліпа і загаварыла.*

*— Чаго табе трэба? — пытае. Мужык азірнуўся сюды-туды ды ізноў сячэ.*

*— Чаго табе трэба? — пытае ізноў ліпа.*

*Мужык, дужа спалохаўшыся, хутчэй на сані ды наўцёкі, дадому. Расказаў ён гэта жонцы, а жонка як накінецца на яго: «Дурны ты! Чаму не сказаў, чаго нам трэба?» — «А чаго ж нам трэба?» — запытаў мужык. «Едзь і скажы, каб ты быў панам, а я пані». Той хоць нехаця, але паехаў. Прыехаў у лес, падышоў да ліпы дый стук у яе сякераю. «Чаго табе трэба?» — пытае ліпа. «Каб я быў панам, а мая жонка пані»,— кажа той са страхам. «Едзь дамоў!» — кажа ліпа. Мужык паехаў і скора панам стаў. Жывуць яны часу колькі, а далей падумала баба, што калі маглі стацца панамі, то маглі б стацца і чым большым. Кліча яна мужа і кажа: «Едзь ты, мой дзядулька, да ліпы і скажы, каб ты быў ваяводаю, а я ваяводзіхаю». Той, прыехаўшы ў лес, стук у ліпу. «Чаго табе трэба?» — «Каб я быў ваяводаю, а мая баба ваяводзіхаю».— «Едзь дамоў!» Прыехаў — так яго зараз і ваяводаю зрабілі.*

*Пажылі так трохі, а баба і кажа: «Дурны ты, дзядулька! Чаму адразу не сказаў, каб ты быў князем, а я княгіняю?!»*

*Паехаў мужык у лес ды стук у ліпу. «Чаго табе трэба?» — пытае ліпа. «Каб я быў князем, мая баба княгіняю».— «Едзь дамоў!» Так скора і князем зрабілі. А баба і кажа раз: «Чаму гэта мы не дагадаліся ў цары папрасіцца! Нечага б тады нікому не кланяліся. Паедзь ты яшчэ ў лес!»*

*Той, прыехаўшы, стук у ліпу. «Чаго табе трэба?» — «Каб я быў царом, а мая баба царыцаю».— «Едзь дамоў!» Стаў скора і царом. Але бабе ўсё мала, і кажа: «Слухай, дзядулечка! Купіў — не купіў, а патаргавацца можна. Папрасі ты ў ліпы, каб ты быў богам, а я бажыцаю, бо ўсё ж такі хоць і царом, а паміраць трэба будзе, а богам, дык ніколі». Яшчэ паехаў ды стук у ліпу. «Чаго табе трэба?» — «Каб я быў богам, а мая баба бажыцаю!» — «Вота ж ідзі ты мядзведзем, а твая баба — мядзведзіцаю!» Пайшоў ён да воза, каб дадому ехаць, а конь як убачыў яго, ды як кінецца наўцёкі, так толькі яго і бачыў. Няма чаго рабіць, пайшоў пехатою. Толькі на нагах ісці яму штось няспраўна паказалася, усё як бы да зямлі хіліць. Ён паспытаў ракам ісці, аж шмат лепей, і пайшоў ён так, аж бачыць: звер ідзе яму насустрач, а падышоў бліжэй — пазнаў сваю бабу. Тады, зароўшы з жалю, пайшлі яны ў лес на векі вечныя.* (http://bellib.org)

## ДЗЕНЬ ДЗЯВЯТЫ (18 студзеня)

**Гэты дзень у календары**

**1664 г.** Са з'яўленнем у Мінску мноства юрыдык (адміністрацыйна і юрыдычна адасобленых частак горада) граматай караля Рэчы Паспалітай прадпісвалася ў Мінску і іншых гарадах жыхарам з ліку рамеснікаў абавязкова ўваходзіць у склад цэхаў.

**1924 г.** Дата нараджэння Уладзіміра Смірнова, удзельніка баёў на тэрыторыі Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, Героя Савецкага Саюза. Камандзір аддзялення старшы сяржант Смірноў вызначыўся пры вызваленні

Лёзненскага раёна. 14 лістападзе 1943 года ў баі за вышыню каля вёскі Шумшчына закрыў сваім целам кулямёт праціўніка.

**Сусветны дзень снегу (Міжнародны дзень зімовых відаў спорту)**

*У 2012 годзе ў свеце з'явілася яшчэ адна добрая традыцыя. Пачынаючы з зімы 2012 года, у перадапошняе нядзелю студзеня па ініцыятыве Міжнароднай федэрацыі лыжнага спорту (FIS) адзначаецца новае свята - Сусветны дзень снегу (Сусветны дзень снегу) . Іншае яго назва - Міжнародны дзень зімовых відаў спорту.*

*Мэта свята - павысіць цікавасць да зімовых відах спорту і ўцягнуць моладзь у актыўны лад жыцця. Паводле задумы FIS , у гэты дзень павінны праходзіць «снежныя фестывалі» , падчас якіх дзеці і дарослыя змогуць прыняць удзел у спаборніцтвах на каньках, лыжах або сноўбордах . Як задумваюць арганізатары, «гэты дзень дасць усім магчымасць атрымаць асалоду ад снегу, пазнаёміцца з кімсьці і акунуцца ў светлую будучыню зімовых відаў спорту, якія будуць успрымацца не толькі як спаборніцтва , але і як забаўка» .*

*Калі ў першы год правядзення свята ўдзел у ім прынялі больш за 20 краін свету, сярод якіх ЗША, Канада, Аўстралія, Швейцарыя, Фінляндыя, Германія, Вялікабрытанія, Нарвегія, Польшча, Турцыя, Казахстан, Украіна і іншыя, то да другога года гатоўнасць падтрымаць міжнародны фестываль выказалі ўжо каля 40 дзяржаў. Што цікава, у іх ліку не толькі традыцыйныя «горналыжныя» краіны (Швейцарыя, Фінляндыя або Нарвегія), але і менш вядомыя ў гэтым сэнсе Венгрыя, Японія, Эстонія і нават Пакістан.*

*Дарэчы, менавіта ў гэты дзень у 2012 годзе жыхары Магнітагорска пастараліся трапіць у кнігу рэкордаў Гінеса, скатаўшы самы вялікі ў свеце снежны ком.*

**Задачы:**

забяспечыць арганізацыю абароны конкурсных праектаў у намінацыі “Мы гэту вайну будзем помніць заўсёды”;

пашырыць выхаваўчую прастору, якая садзейнічае рэалізацыі творчага патэнцыялу і дзіцячых ініцыятыў;

стварыць умовы для развіцця фізічных якасцей падлеткаў;

прапагандаваць беларускую мову сродкамі сучаснага мастацтва.

**У гэты дзень праводзіцца:**

абарона конкурсных праектаў у намінацыі “Мы гэту вайну будзем помніць заўсёды”;

старт другога гульнявога перыяду “Музея археалогіі”;

мультыпарк “Навучы сябра”;

музыкальная гадзіна;

спартландыя;

модульны праект “Скарбы роднай мовы”;
модульны праект “Легенда на кожны дзень”;
конкурс “Новае гучанне”;
дыскатэка.

**Арганізацыйна-гульнёвы праект “Музей археалогіі”**

Пачаўся новы гульнёвы перыяд “. Вы знялі другі культурны слой, за якім зноў знайшлі фрагменты нейкіх рэліквій, якія звязаны с гісторыяй Беларусі. Ваша задача: трэба правесці даследаванне гэтых прадметаў і прадставіць у вучоны савет справаздачу і пачаць вывучаць новы слой. Памятайце, што для вывучэння гэтага слоя вы павінны зарабіць элементы не меньш як трох намінацый.

**Модульны праект “Скарбы роднай мовы”**

Карысная інфармацыя. “Паняцце білінгвізму”.

Праблема моўнага жыцця ў нашай рэспубліцы сёння адносіцца да адной з найбольш актуальных і складаных. Разам з тым гэта праблема існуе не толькі ў нашай краіне, але і ў гісторыі суіснавання іншых народаў, іх культур і моў у шматнацыянальных краінах наогул.

Паводле даных Акадэміі навук Францыі, насельніцтва зямнога шара гавbooрыць не менш чым на 2796 мовах, якія аб'ядноўваюцца ў 11 вялікіх і каля 50 малых моўных груп, а ўсе, хто гаворыць на гэтых мовах, выкарыстоўваюць ад 7 да 8 тысяч дыялектаў. Нямецкія ж вучоныя сцвярджаюць, што сучасныя народы свету гавораць на мовах, колькасць якіх перавышае 4000, а ўсяго навуцы вядома каля 6000 жывых і мёртвых моў.

Стварэнне моўнай карты свету з кожным днём становіцца справай усё больш цяжкай, бо практычна на Зямлі няма аднамоўных краін і нават буйных гарадоў. Напрыклад, Лондан англійскія вучоныя называюць “лінгвістычным Вавілонам”, бо, паводле звестак міністэрства адукацыі Вялікабрытаніі, у ім гавораць на 147 мовах, хоць, зразумела, найбольш на англійскай. Тлумачыцца гэта тым, што выхадцы з былых брытанскіх калоній прывезлі з сабой і свае мовы. Іншым прыкладам можа быць Швейцарыя: краіна такая ёсць, а мовы швейцарскай няма. На захадзе гэтай рэспублікі гавораць па-французску, на поўдні – па-італьянску, а ў большасці кантонаў – па-нямецку, прычым у кожным “нямецкім” кантоне свой дыялект.

Зразумела, што зберажэнне сваёй спрадвечнай мовы і спрадвечнай культуры - факт пазітыўны, але ў рэальнай гісторыі чалавецтва ён хутчэй выключэнне, чым правіла. Народы свету знаходзяцца ў пастаянным кантакце адзін з адным, асабліва этнасы суседнія, якія часта маюць адну тэрыторыю пражывання або знаходзяцца ў складзе адной дзяржавы. Моўныя кантакты, якія дыктуюцца эканамічнымі, культурнымі і іншымі сувязямі, патрабуюць вывучэння і выкарыстання ў моўнай практыцы дзвюх і больш моў.

Існуюць і іншыя матывы авалодвання дзвюма ці некалькімі мовамі (атрыманне адукацыі, патрэбы навуковай дзейнасці і г.д.). Не з'яўляецца выключэннем і Рэспубліка Беларусь, таму што яна таксама ўяўляе сабой шматнацыянальную дзяржаву з шырока распаўсюджаным двухмоўем (білінгвізмам).

***Білінгвізм*** (лац. bilinguis – двухмоўны) – валоданне і папераменнае карыстанне асобай або калектывам дзвюма мовамі.

**Заданне: перакладзіце на беларускую мову:**

*увянувшая трава;*
*разбушевавшееся море;*
*работающий мотор;*
*купающиеся;*
*зреющая рожь;*
*будущая жизнь.*

## Модульны праект “Легенда на кожны дзень”

Вам неабходна прыдумаць цікавую легенду аб узнікненні назваў карпусоў НДЦ “Зубронак” – для кожнага корпуса сваю легенду.

## Палажэнне аб творчым конкурсе “Новае гучанне”

**Мэта:** стварэнне ўмоў для развіцця творчых здольнасцей падлеткаў.

**Задачы:**

ствараць умовы для згуртавання атрадаў;
развіваць крэатыўнае мысленне;
ствараць сітуацыю поспеху.

**Заданне.** Атрады-ўдзельнікі выбіраюць урывак з мультфільма або фільма. Ім неабходна, грунтуючыся на дзеяннях герояў, скласці новы варыянт агучвання ўрыўка на **беларускай мове**.

**Умовы правядзення:**

1. У конкурсе прымаюць удзел усе атрады.
2. Выбіраецца ўрывак працягласцю ад 2,5 да 3 хвілін.
3. Урывак павінен мець лагічныя пачатак і заканчэнне.
4. Тэкст новага варыянту агучвання павінен адпавядаць нормам цэнзуры.
5. Агучванне павінна адбывацца па ролях.

**Крытэрыі ацэнкі:**

гумар;
акцёрская гульня;
адпаведнасць накладання галасоў на ігру акцёраў (мультыплікацыйных герояў) у фільме;
удалы падбор сюжэта агучкі ў адпаведнасці з сюжэтам фільма.

**Узнагароджанне.** Пераможцы ўзнагароджваюцца дыпломамі НДЦ «Зубронак».

## ДЗЕНЬ ДЗЯСЯТЫ (19 студзеня)

**Гэты дзень у календары**

**1904 г.** Нарадзіўся Валынец Андрэй Іванавіч (Вілейс. р-н – 1904-1965), удзельнік нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў патрыятычнага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Вілейшчыны ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1944 г.).

**Дзень выратавальніка Беларусі -** гэта прафесійнае свята супрацоўнікаў МНС, усіх спецыялістаў па ліквідацыі надзвычайных сітуацый.

**1939 г.** Нарадзілася Мархель Таццяна Рыгораўна (Смаляв. р-н), актрыса, заслужаная артыстка Беларусі;

**Задачы:**

забяспечыць арганізацыю абароны конкурсных праектаў у намінацыі “Мы гэту вайну будзем помніць заўсёды”;

пашырыць веды ўдзельнікаў змены па краязнаўству і музеязнаўству;

садзейнічаць папулярызацыі водных відаў спорту;

стварыць умовы для рэалізацыі творчага патэнцыялу падлеткаў;

актывізаваць работу падлеткаў па вывучэнню гісторыі цэнтра;

пашырыць веды ўдзельнікаў змены аб лексічных асаблівасцях беларускай мовы.

**У гэты дзень праводзіцца:**

Абарона конкурсных праектаў у намінацыі “Мы гэту вайну будзем помніць заўсёды”;

“Акадэмія музеязнаўства”;

спартыўныя спаборніцтвы па плаванні;

метад асобаснага развіцця “Акіян жаданняў”;

модульны праект “Скарбы роднай мовы”;

модульны праект “Легенда на кожны дзень”;

шоу-праграма “Фестываль мастацтваў”.

### Метад асобаснага развіцця “Акіян жаданняў”

**Задачы метаду:**

фіксаваць меркаванні падлеткаў па наступных тэмах: “Хачу, каб нашы важатыя…”; “Хачу, каб я…”; “Хачу, каб наш атрад…”; “Хачу, каб “Зубронак”…”;

выяўляць накіраванасць атрада (што падлеткам цікавей: узаемаадносіны ў атрадзе, паміж атрадам і выхавальнікам, у цэнтры, падлетку цікавы ён сам);

своечасова даведвацца аб канфліктах і праблемах, якія існуюць у атрадзе.

Матэрыялы: чатыры аркушы паперы фармата А4, афармленых згодна з марской тэматыкай назвы метаду.

**Алгарытм рэалізацыі метаду:**

***ўвядзенне ў метад (легенда)***

- Дарагія сябры , у кожнага з нас ёсць свае жаданні і надзеі. Хто з вас аб чым марыць? (Падлеткі дзеляцца сваімі марамі) . А ці ёсць у вас мары, звязаныя з «Зубронкам»? Назавіце іх. Уявіце , што ўсе вашыя мары зліліся ў адзін вялікі акіян жаданняў. Але сярод усіх гэтых жаданняў ёсць 4 асаблівых жаданні. Ад гэтых жаданняў залежыць дабрабыт нашага атрада ў цэнтры. А для таго каб яны споўніліся, трэба ўсяго толькі загадаць гэтыя жаданні на гэтых 4 лістах (педагог прапануе дзецям запоўніць 4 аркушы фармату А4 з наступнымі фразамі: хачу, каб нашы важатыя; хачу, каб я; хачу каб наш атрад, хачу каб «Зубронак» ).

***запаўненне***

На працягу бліжэйшых 3 дзён "Акіян жаданняў" вывешваецца на атрадным месцы. Дзеці могуць уносіць свае новыя жаданні ў адпаведнасці з вышэй адзначанымі рубрыкамі.

**аналіз запісаў - жаданняў**

Педагог разам з выхаванцамі аналізуюць пажаданні: якога характару пераважаюць (пазітыўнага , негатыўнага); каму адрасаваны станоўчыя пажаданні, чаму; каму адрасаваны негатыўныя пажаданні, у чым прычына; што мы ўсе разам можам зрабіць для таго, каб зрабіць жыццё ў атрадзе лепш.

**Метадычныя рэкамендацыі:** Асаблівую ўвагу звярніце на жаданні, якія адлюстроўваюць негатыўнае стаўленне дзяцей да чаго-небудзь. Такія жаданні неабходна разабраць асабліва старанна. У чым прычына негатыўных эмоцый , як пазбавіцца ад іх і г.д.

## Модульны праект "Скарбы роднай мовы"

Вялікая колькасць слоў на рускай мове ў «Русско-белорусском словаре» мае два перакладныя варыянты: адзін з'яўляецца калькай з рускай мовы, а другі – уласнабеларускі. Прычым, часта калькаваны варыянт падаецца ў слоўніку першым, г.з. асноўным перакладам. І тым не менш, здаецца мэтазгодным выкарыстоўваць менавіта беларускамоўны варыянт пры перакладзе (ён выдзелены чорным шрыфтам), што з'яўляецца лагічным для мовы тытульнай нацыі.

**Заданне:** перакладзіце на рускую мовы наступныя уласнабеларускія словы: *дыямент, альяс, вэрхал, гаротны, бель, выгольваць, выкленчыць, задок*

## Легенда "Адкуль сяляне і паны"

*(модульны праект "Легенда на кожны дзень")*

*Бог зляпіў пана з пшанічнага цеста, а мужыка — з гліны ды, паклаўшы, каб сохлі, пайшоў абедаць. А пад той час — дзе ён узяўся! — прыбег сабака, просты мужыцкі падваротнік, панюхаў мужыка, шкрабануў усімі лапамі і, дабраўшыся да пана, чыста яго з'еў.*

*Толькі стаў аблізвацца, калі вось прыходзіць Бог. Як пабачыў ён, што зрабілася, то, ухапіўшы сабаку за хвост, давай трусіць. З сабакі і пасыпаліся паны, і пабеглі куды папала, а дзе які спыняўся, так Бог яго і называў. Спыніўся пад бярозаю — пан Беразоўскі, пад дубам — пан Дубінскі, пад сасною — Сасноўскі, пад елкаю — Ельскі, пад алешынаю — Альшынскі, пад гарою — пан Падгорскі, а як каторы ачуўся за балотам або за ракою, то пан Заблоцкі і пан Зарэцкі.*

*Дык вось адкуль сяляне і паны.*

## ДЗЕНЬ АДЗІНАЦЦАТЫ (20 студзеня)

**Гэты дзень у календары**

**1919 г.** У Мінску быў адкрыты **Беларускі дзяржаўны музей**. Дзейнічаў да чэрвеня 1941 года. Аснову калекцыі склалі матэрыялы Мінскага царкоўна-археалагічнага музея і Таварыства аматараў прыродазнаўства, этнаграфіі і археалогіі. Папаўняўся матэрыяламі археалагічных раскопак, этнаграфічных экспедыцый і экспанатамі, якія перададзены іншымі музеямі. Пры музеі існавалі архіў рукапісных дакументаў 16-18 стагоддзяў і навуковая бібліятэка. Найбольш каштоўныя - рукапісныя і друкаваныя кнігі 15-18 стагоддзяў, дароўныя граматы 16-17 стагоддзяў, іконы беларускіх іканапісных школ 15-19 стагоддзяў, карціны беларускіх мастакоў, беларускае нацыянальнае адзенне, прылады працы і прадметы хатняга ўжытку, слуцкія паясы і іншыя ўзоры беларускага прыкладнога мастацтва 19-20 стагоддзяў, ключы ад варот Бабруйскай крэпасці. У гады Вялікай Айчыннай вайны музей быў разрабаваны нямецка-фашысцкімі акупантамі, большасць калекцый прапала. Ацалелыя экспанаты захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі.

**1924 г.** Нарадзілася Петрачэнка Галіна Гаўрылаўна, беларускі вучоны ў галіне педагогікі, кандыдат педагагічных навук (1954), прафесар (1983). Аўтар навуковых прац па псіхолага-педагагічным асновах дашкольнай выхавання і праблемах адукацыі дашкольнікаў. Памерла ў 1993 годзе.

**1934 г.** Нарадзіўся Кандыбовіч Леў Аляксандравіч, беларускі вучоны, доктар псіхалагічных навук (1982), прафесар (1984). Аўтар навуковых прац па гісторыі псіхалогіі, ваеннай псіхалогіі і псіхалогіі вышэйшай школы ў Беларусі. Памёр у 2011 годзе.

**1944 г.** 70 гадоў таму ў ходзе Калінкавіцка-Мазырскай аперацыі савецкіх войскаў ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў быў вызвалены гарадскі пасёлак Азарычы ў Калінкавіцкім раёне.

**Задачы:**

забяспечыць арганізацыю абароны конкурсных праектаў у намінацыі “Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася спадчына”;

стварыць умовы для рэалізацыі творчага патэнцыялу падлеткаў; пашырыць веды падлеткаў па гісторыі беларускай дзяржавы;

садзейнічаць пашырэнню выкарыстання беларускай мовы пры арганізацыі выхаваўчага працэсу;

пашырыць веды ўдзельнікаў змены аб вуснай народнай творчасці беларусаў.

**У гэты дзень праводзіцца:**

абарона конкурсных праектаў у намінацыі “Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася спадчына”;

экскурсія ў Музей Вялікай Айчыннай вайны;

модульны праект “Скарбы роднай мовы”;

модульны праект “Легенда на кожны дзень”.

**Модульны праект “Скарбы роднай мовы”**

Вам трэба перакласці на беларускую мову назвы органаў дзіцячага самакіравання “Асацыяцыі дзіцячых ініцыятыў”. Асноўнае патрабаванне: пераклад (пры неабходнасці) павінен быць творчы – у выпадку адсутнасці ўдалага эквіваленту можна прыдумаць свае назвы, якія адлюстроўваюць напрамкі дзейнасці.

**Легенда “Хто выдумаў грошы”**

*(модульны праект “Легенда на кожны дзень”)*

*Жыў адзін чалавек. І быў ён такі скупы, што нават шкадаваў людзям вады напіцца. Хлявы поўныя жывёлы, а ён трасецца, як здохне паршывае парасятка; свіран ломіцца ад збожжа, а яму ўсё мала — крукам вісіць над кожным зярняткам, скарыначкі хлеба нікому не дасць. Сваё жыта гніе ў засеках, а ён зайздросціць, калі ўбачыць у суседа палоску пшаніцы. Ад хцівасці высах, як дубец стаў. І не дзіва, бо еў адзін раз на дзень. Намесіць бульбы з мякінай, спячэ на вуголлі і запівае халоднай вадой. А каб смачней было, пасыпае попелам.*

*Смяюцца людзі з дурнога чалавека, які перабіваецца на мякіне. І празвалі яго за гэта Мякіннікам. Трасецца Мякіннік над сваім дабром, выжыльваецца, каб яшчэ больш багацця займець. Але ў гаспадарцы адно прыбывае, а другое ўбывае, акурат як вада ў рацэ. Скупы збірае, трасецца, а чорт з яго смяецца.*

*Дачуўся Мякіннік пра папараць-кветку, ад чараў якой дабро само плыве ў рукі. Пачаў распытваць у людзей пра дзівосную кветку і даведаўся, што папараць цвіце адзін раз у год — на Купалле, але вельмі цяжка яе здабыць, бо сцерагуць нікім нябачаныя скарбы чэрці і ўсялякая нечысць. А Мякінніку — абы дабра больш займець, нічога ён не баіцца — так апанавала чалавекам прагнасць і хцівасць.*

*Нарэшце надышло Купалле. Мякіннік схапіў вялікі мех і пабег у лес. Схавалася, каб адпачыць, сонейка. На небе заблішчалі зоркі. І столькі іх*

*высыпала, што не злічыць. «Шмат на свеце багацця, — думае Мякіннік, — і вельмі шкада, што нельга ім усім завалодаць…»*

*Зусім, быццам у мяху, сцямнела ў лесе, толькі дзе-нідзе перамігваюцца зоркі. «Мо так блішчыць і кветка папараці?» — мяркуе Мякіннік, блукаючы па лясных нетрах.*

*Лазіў ён лазіў у гушчары, ледзь сабе вочы не павыдзіраў. Заблукаў у такі глухі лес, што выбрацца не можа. Пачаў прыслухоўвацца, ці не забрэша дзе-небудзь сабака. Нічуткі не чуваць. Прысеў на пень і не ведае, куды далей кіравацца. Аж раптам у лесе як загуло, як затрашчала! Зірнуў вакол сябе — скачуць чэрці, абняўшыся з ведзьмамі. Вочы блішчаць, быццам жар. Зубы ляскочуць. Спалохаўся Мякіннік, трасецца, як сабака на марозе. Потым бачыць: непадалёку ў папараці штосьці блішчыць, як зорачка. Адразу здагадаўся, што гэта папараць-кветка, кінуўся, каб хутчэй схапіць яе.*

*Але куды там! Не паспеў і два крокі ступіць, як з крыкам і піскам наляцела нечысць, засланіла дарогу. Спыніўся Мякіннік, не варушыцца, трасе яго трасца. Хацеў перахрысціцца, але збаяўся, што дзівосная кветка знікне.*

*«Ліха з ім, — думае сам сабе, — усё роўна прападаць… Прадаў бы чорту душу, каб толькі было за што…» І толькі ён так падумаў — тут як тут з'явіўся чорцік. Падскочыў да чалавека і пытаецца:*

*— Ты клікаў мяне? Я тут. Будзеш самым багатым у свеце, але прадай мне сваю душу. Непатрэбна яна табе. З-за яе сэрца баліць…*

*Здагадзіўся Мякіннік прадаць душу. Толькі спытаўся ці доўга будзе спажываць незлічонае багацце.*

*— Яно заўсёды будзе тваё,- кажа чорт. — І людзі цябе не забудуць. Пакуль свет будзе стаяць, будуць помніць, што ўсё багацце — тваё…*

*Узяў нячысцік ад Мякінніка пісульку, напісаную чалавечай крывёю, а яму за гэта даў папараць-кветку і навучыў, як ёю карыстацца.*

*Паплыло з таго дня Мякінніку ў рукі багацце. Неўзабаве столькі дабра ён займеў, што самому ў хаце месца няма. Бачыць, што не сабраць багацце з усяго свету, кліча да сябе чорта.*

*— Добра, дам я табе зелле, — кажа нячысцік, — што дапаможа тваёй бядзе.*

*Назбіраў чорт поту, крыві і слёз людскіх, наліў поўны кацёл, потым варыў, варыў і зварыў золата.*

*— Давай яго хутчэй сюды! — просіць Мякіннік. — У мяне няма такога бліскучага скарбу!*

*— Не, мы яго спачатку пусцім па людзях, — смяецца нячысты. — Яно збярэ ўсё іхняе багацце і вернецца да цябе.*

*Затым чорт выдумаў папяровыя грошы. І таксама пусціў па свеце людзей абіраць. Праз некалькі гадоў сабралася ў Мякінніка гэтулькі багацця, што ўвесь свет ён мог купіць. Але не рады багацей, бачыць, што хутка паміраць трэба. Хацеў падкупіць смерць, а яна толькі зарагатала з дурня. Паклікаў знаёмых знахараў і дактароў, каб ад смерці збавіцца, а яны ў адзін голас: "Усе на свеце*

*паміраюць!” Бачыць Мякіннік, што не адкруціцца яму ад кашчавай, пусціўся на хітрыкі. Ссыпаў усё сваё золата ў глыбокі склеп, набраў стравы мо на сто гадоў і сядзіць там, хаваецца ад чорта.*

*Але аднойчы прыходзіць смерць і кажа:*

*— Няхай тым стане, чым было!*

*Толькі яна так прамовіла — разлілося золата потам, крывёю і слязьмі людскімі. Утапіўся ў сваім пограбе Мякіннік. Тут як тут з’явіўся чорт, схапіў Мякіннікаву душу і рагоча:*

*— Пакуль будзе свет стаяць, датуль будуць людзі цябе ўспамінаць! Бо ўсіх ты дурыў: на поце, слязах і крыві людской жыў!( http://skarby.in)*

## ДЗЕНЬ ДВАНАЦЦАТЫ (21 студзеня)

**Гэты дзень у календары**

**1934 г.** Нарадзіўся Стаховіч Алег Аляксандравіч (в. Горкі-Абчак, Мін. р-н), архітэктар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1970 г.). Асноўныя працы (у аўтарскім калектыве): Курган Славы Савецкай Арміі - вызваліцельніцы Беларусі, галоўны ўваход у выглядзе зоркі ў мемарыяльным комплексе “Брэсцкая крэпасць-герой” і іншыя

**1919 г.** Створаны надзвычайны орган улады - Ваенна-рэвалюцыйны Савет рэспублікі (ВРС Беларускай ССР).

**1919 г.** У вёсцы Марозавічы цяперашняга Буда-Кашалёўскага раёна нарадзіўся Васіль Старавойтаў, навуковец, інжынер-канструктар ў галіне танкабудавання, доктар тэхнічных навук, прафесар. Пад яго кіраўніцтвам створаны самаходны шасі «Месяцаход-1». Лаўрэат Ленінскай прэміі.

**1924 г.** У вёсцы Бардзілоўка Мінскага раёна нарадзіўся Фёдар Бачыла, удзельнік партызанскага руху ў Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, журналіст «Чырвонай змены». З 1943 года камандзір дыверсійнай групы ў партызанскім атрадзе ім. С.Лазо 3-й Мінскай партызанскай брыгады ім. Будзёнага, якая падарвала 28 чыгуначных эшалонаў ворага. Памёр у 1992 годзе.

**1939 г.** У Мінску заснавана Дзяржаўная карцінная галерэя БССР (з 1957 года Дзяржаўны мастацкі музей, з 1993-га - Нацыянальны мастацкі музей).

**Міжнародны дзень абдымкаў.**

*21 студзеня ва ўсім свеце адзначаецца адно з самых незвычайных святаў - Міжнародны дзень абдымкаў (International Hug Day) . Ён быў заснаваны ў ЗША ў 1986 годзе пад назвай Нацыянальнага дня абдымкаў (National Hugging Day), а затым імкліва распаўсюдзіўся па ўсім свеце. Згодна з традыцыяй свята, заключыць у сяброўскія абдымкі у гэты дзень можна нават незнаёмага чалавека.*

*Нягледзячы на малады ўзрост гэтага свята, сёння цяжка знайсці яго аўтара: невядома , каму ўпершыню ў галаву прыйшла такая ідэя «цеснага»*

*святкавання 21 студзеня, і чаму абрана менавіта гэтая дата. Лічыцца , што ініцыятарамі свята з'яўляюцца студэнты.*

*Менавіта ў гэты дзень хлопцы і дзяўчаты заключалі ў свае абдымкі адзін аднаго без усялякай інтымнай падаплёкі. Па своеасаблівай легендзе, падчас сяброўскіх абдымкаў людзі абменьваюцца душэўным цяплом.*

*Прыемна тое , што святкаванне 21 студзеня не запатрабуе ніякіх матэрыяльных выдаткаў. Вам варта толькі шчодра ўзнагародзіць сваім цяплом усіх, каго палічыце патрэбным. Віншуючы са святам, падарыце сваім блізкім і каханым людзям абдымкі ў знак цёплага стаўлення да іх, нагадаўшы тым самым аб сваіх шчырых цёплых пачуццях.*

**Задачы:**

пашырыць веды па музеязнаўству і краязнаўству;

забяспечыць арганізацыю абароны конкурсных праектаў у намінацы “Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася спадчына”;

фарміраваць у падлеткаў паважлівыя адносіны да беларускай мовы;

стварыць умовы для творчай самарэалізацыі падлеткаў.

**У гэты дзень праводзіцца:**

абарона конкурсных праектаў у намінацыі “Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася спадчына”;

“Акадэмія музеязнаўства”;

спартыўныя спаборніцтвы па валейболе;

конкурс “Дойлідства”;

модульны праект “Скарбы роднай мовы”;

модульны праект “Легенда на кожны дзень”;

кінафільм.

## Конкурс “Дойлідства”

**Задача:** На працягу дня кожны атрад павінен пабудаваць або змайстраваць макет вядомага будынка Беларусі (пры спрыяльным надвор’і– са снегу, пры неспрыяльным – з падручных матэрыялаў).

Конкурс праводзіцца ў адпаведнасці з палажэннем *(будзе выдадзена на кожны атрад)*.

## Модульны праект “Скарбы роднай мовы”

Працягваем знаёміца з уласнабеларускімі словамі.

**Заданне:** перакладзіце на рускую мову: *стрыечны, дзятва, літаральна, назаляць, дабрукоўваць, далітаваны, гагавіца, пэцкацца.*

## Модульны праект “Легенда на кожны дзень”

Сённяшняя легенда – ад вас. Вы павінны скласці легенду аб гісторыі той мясцовасці, дзе размешчаны НДЦ “Зубронак” (але толькі не пра возера Нарач).

## ДЗЕНЬ ТРЫНАЦЦАТЫ (22 студеня)

**Гэты дзень у календары**

**1904 г.** Нарадзіўся Міхаіл Барысаў, удзельнік вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Герой Савецкага Саюза. Камандзір 212-га гвардзейскага стралковага палка палкоўнік Барысаў вызначыўся ў 1943 годзе пры фарсіраванні Дняпра. Полк пад яго камандаваннем пераправіўся праз Дзясну і Днепр, захапіў і утрымліваў плацдарм, адбіў некалькі контратак праціўніка, што забяспечыла пераправу астатніх войскаў. Загінуў у баі ў 1944 годзе.

**1924 г.** Дата нараджэння Івана Мяльнова, удзельніка вызвалення Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Герой Савецкага Саюза. Камандзір стралковай роты лейтэнант Мяльноў вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра каля Магілёва ў 1944 годзе. З групай з шасці чалавек пад моцным агнём праціўніка фарсіраваў раку ў раёне вёскі Буйнічы, захапіў плацдарм на правым беразе, агнём з аўтамата і гранатамі знішчыў агнявыя кропкі праціўніка, што спрыяла поспеху ў пераправе батальёна. Загінуў у баі ў 1944 годзе пры вызваленні г.п. Свіслач Гродзенскай вобласці.

**1969 г.** У Мінску нарадзіўся Веніямін Захараў, артыст балета, заслужаны артыст. У 1987 - 2001 гадах саліст Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі.

**Задачы:**

забяспечыць правядзенне фіналу конкурсу “Я родным краем ганаруся”;

прадтрымаць актыў навучэнцаў, здольных ажыццяўляць сістэматычную даследчую дзейнасць;

фарміраваць паважлівыя адносіны да гісторыі НДЦ “Зубронак”;

паказаць магчымасці выкарыстання беларускай мовы ў паўсядзённым жыцці;

стварыць умовы для творчай самарэалізацыі падлеткаў.

**У гэты дзень праводзіцца:**

фінал конкурсу “Я родным краем ганаруся”;

творчыя сустрэчы з супрацоўнікамі Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, газеты “Переходный возраст”, Нацыянальнага парка “Нарачанскі” і інш.;

<u>падвядзенне вынікаў другога гульнявога перыяду “Музея археалогіі”;</u>

модульны праект “Скарбы роднай мовы”;

модульны праект “Легенда на кожны дзень”.

### Модульны праект “Скарбы роднай мовы”

Працягваем знаёміцца з уласнабеларускімі словамі.

**Заданне:** перакладзіце на рускую мову: *дуля, кажан, пакута, уходзіны, заручацца, аблога, ёлупень, ветразь, ліст, пасаг, прайдзісвет, жвавасць, рэшта.*

**Легенда "Два браты"**

*(модульны праект "Легенда за легендай")*

*Жылі ў сярэднявечным Мінску два браты-прыгажуны. І трэба было такому здарыцца - пакахалі яны адну і тую ж дзяўчыну - маладую паненку. Яна "... прыгажэй усіх была, нібы лебедзь статная, як снег бялявая...". Але нікому з братоў не аддавала перавагі. З абодвума паводзіла сябе ветліва, ласкава ўсміхалася, падлашчвалася. Кожны з братоў стаў падазраваць, што ў яго ёсць супернік. У абодвух знікла радасць у жыцці, паўстала рэўнасць, злосць. У гарачых галовах нарадзіліся праклёны і грахоўныя думкі аб помсце.*

*Неяк адзін з братоў ішоў да дзяўчыны на спатканне. І калі падышоў да яе хаты, то ўбачыў у акне чыйсці цень. Абамлела сэрца - супернік. Ён падкраўся бліжэй - пачуў гутарку і смех. Ашалеўшы ад рэўнасці, хлопец кінуўся ў хату і аслупянеў... Супернікам апынуўся яго родны брат. Не доўга думаючы, браты вырашылі біцца - хто пераможа, таму і дастанецца прыгажуня-паненка.*

*«Б'юцца два браты*
*За каханне і прыгажосць,*
*На вуснах праклёны,*
*А у сэрцы – злосць...»*

*А прыгажуня весялілася, смяялася, гледзячы на бойку братоў. Яна падбадзёрвала і абнадзейвала кожнага з іх.*

*"Хто мацнейшым будзе*
*За брата свайго -*
*Больш уласнага жыцця*
*Пакахаю я таго."*

*Так здарылася - ніхто не перамог. Абодва браты зваліліся як нежывы, пранізаўшы адзін аднаго шпагамі. А паненка не на жарт спалохалася. Забава абярнулася трагедыяй. Крык затрымаўся ў горле, перахапіла дыханне. Яна ў жаху кінулася бегчы. Па дарозе зняла падораны пярсцёнак з пальца і кінула яго ў Свіслач. А ўначы разгулялася навальніца. Моцны вецер хіліў да зямлі дрэвы, ліў дождж, велізарныя хвалі баразнілі Свіслач. Галіны дрэваў з сілаю грукалі ў акно. Усю ноч дзяўчыну мучылі жахі. Абодва забітыя браты, бледныя, у крыві стаялі перад ёй і прасілі аб літасці і аб каханні...*

*На месцы бітвы братоў гараджане склалі з каменных пліт высокі помнік. Шмат вады сплыло з тых часоў. Але яшчэ ў XIX стагоддзі гэты помнік стаяў на тагачаснай Маскоўскай вуліцы, недалёка ад кута з Нова-Раманаўскай, амаль насупраць школы рамесных вучняў.*

*Зараз тут - раён вул. Нямігі, яе ўчастак ад вул. Калектарнай да Караля. І дагэтуль на гэтым месцы, калі надыходзіць непагадзь, вецер вые неяк злавесна і дрэвы енчаць з асаблівым жалем. (http://minsk-old-new.com)*

## ДЗЕНЬ ЧАТЫРНАЦЦАТЫ (23 студзеня)

**Гэты дзень у календары**

**1919 г.** У вёсцы Якімаўка Рэчыцкага раёна нарадзіўся Анатоль Каваленка, Герой Савецкага Саюза. У Вялікую Айчынную вайну лётчык разведвальнага авіяпалка. Удзельнік абароны Севастопаля, Ленінграда, Керчы. Старэйшы лейтэнант Каваленка здзейсніў 173 баявых вылетаў, выявіў 23 аэрадромы, сфатаграфаваў 900 эшалонаў ворага, у паветраных баях збіў 7 самалётаў праціўніка, 16 знішчыў на зямлі

**1959 г.** Нарадзіўся Каплякоў Сяргей Віктаравіч (г.Орша) спартсмен (плаванне) міжнароднага класа, заслужаны майстра спорту СССР, чэмпіён XXII Алімпійскіх гульняў (1980 г.), сярэбраны прызёр XXI Алімпійскіх гульняў (1976 г.).

**Дзень ручного пісьма (Дзень почырку).**

*Папулярнасць камп'ютараў, электроннай пошты і электронных нататнікаў, СМС, якая расце з кожным годам, наборы стыкераў з надрукаванымі фразамі-падказкамі, а таксама іншыя сродкі хуткіх зносін паступова адвучваюць сучаснага чалавека ад магчымасці выказаць свае думкі, напісаўшы іх уласнаручна. Магчыма, у недалёкай будучыні ліст ці паштоўка, напісаныя «ад рукі», стануць жаданым набыццём.*

*Сёння ў свеце адзначаецца Дзень почырку або, кажучы больш элегантна, Дзень ручнога пісьма (National Handwriting Day), які заснаваны з мэтай нагадаць усім нам пра ўнікальнасць ручнога пісьма, аб неабходнасці практыкавацца ў ім, аб непаўторнасці почырку кожнага чалавека.*

*Сучасныя навукоўцы называюць сем асноўных характарыстык, па якіх можна стварыць партрэт чалавека - памер літар, іх нахіл і форма, напрамак почырку, інтэнсіўнасць націску, характар напісання слоў, агульная адзнака почырку. Графолагі мяркуюць, што паміж асаблівасцямі почырку і рысамі характару абавязкова павінна існаваць сувязь, таму што чалавечы мозг падсвядома «водзіць» рукой пішучага. Працай мозгу, дарэчы, яны тлумачаць і тое, што пры сталенні і змене характару почырк чалавека таксама мяняецца.*

**Задачы:**

пашырыць веды выхаванцаў па музеязнаўству і краязнаўству;

рэфлексія эмацыйнага фону атраду;

вучыць дзяцей разуменню глыбокай духоўнай сутнасці народнай культуры;

стварэнне ўмоў для разнастайнага адпачынку дзяцей.

**У гэты дзень праводзіцца:**

майдадыр;

<u>старт трэцяга гульнявога перыяду “Музея археалогіі”;</u>

“Акадэмія музеязнаўства”;
метад асобаснага развіцця “Прабач за… Дзякуй за…”;
конкурс “Легенда за легендай”.
модульны праект “Скарбы роднай мовы”;
модульны праект “Мы – маладыя”
модульны праект “Легенда на кожны дзень”.

**Арганізацыйна-гульнёвы праект “Музей археалогіі”**

Пачаўся новы гульнёвы перыяд. Вы знялі другі культурны слой, за якім зноў знайшлі фрагменты нейкіх рэліквій, якія звязаны с гісторыяй або сучаснасцю Беларусі. Ваша задача: трэба правесці даследаванне гэтых прадметаў, прадставіць у Вучоны савет справаздачу і пачаць вывучаць новы слой. Памятайце, што для вывучэння гэтага слоя вы павінны зарабіць элементы не менш як трох намінацый.

**Палажэнне аб правядзенні конкурсу**
**“Легенда за легендай”**

**Мэты конкурсу**

Заахвочванне цікавасці да культуры беларускага народа.

Выяўленне і заахвочванне таленавітых падлеткаў.

**Удзельнікі конкурсу**

У конкурсе прымаюць удзел усе атрады корпуса “Сонечны горад”.

**Умовы правядзення**

На конкурс прадстаўляюцца інсцэніроўкі легенд на **беларускай мове**. Рэгламент выступлення – 4 - 5 хвілін. За парушэнне рэгламенту здымаюцца балы. У інсцэніроўцы павінна быць задзейнічана не менш як 2/3 атрада. Пры меньшай колькасці здымаюцца балы.

**Крытэрыі ацэнкі:**

артыстычнасць, сцэнічная культура;
мастацкі ўзровень выканання;
культура сцэнічнай мовы і сцэнічнай пластыкі;
акцёрскае майстэрства.

**Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджанне**

Пераможцы вызначаюцца па найбольшай колькасці балаў і ўзнагароджваюцца дыпломамі НДЦ “Зубронак”.

**Методыка асобаснага развіцця “Прабач за… Дзякуй за…”**

**Задачы метаду:**

своечасовае выяўленне пазітыўных і негатыўных перажыванняў дзяцей;
развіваць камунікатыўныя невербальныя здольнасці.

**Матэрыялы:** 2 артыкулы фармату А4, падпісаных “Прабач за ...”, “Дзякуй за ...”, эстэтычна аформленыя.

**Алгарытм рэалізацыі метаду:**

***увядзенне ў метад "Прабач за ..., Дзякуй за ..."***

Педагог праводзіць гутарку з дзецьмі «Прабач за ..., Дзякуй за ...".

Пытанні для гутаркі:

*Калі, у якой сітуацыі просяць прабачэння?*

*Чаму так цяжка бывае папрасіць прабачэння?*

*Ці важна прасіць прабачэння і чаму?*

*Калі, у якой сітуацыі кажуць "дзякуй"?*

*Ці лёгка казаць "дзякуй"?*

*Ці неабходна казаць "дзякуй"? Чаму?*

***запаўненне рубрык "Дзякуй за ...", "Прабач за ..."***

На атрадны стэнд вывешваюцца рубрыкі "Прабач за ...", "Дзякуй за ...". Педагог прапануе дзецям запоўніць дадзеныя рубрыкі па меры неабходнасці на працягу бліжэйшых 3 дзён.

***аналіз вынікаў запаўнення рубрык***

Педагог разам з дзецьмі на вячэрніх агеньчыках аналізуе, якія ўсё ж надпісы з'явіліся ў рубрыках (пазітыўныя, негатыўныя), да каго яны звернутыя, як ставяцца падлеткі да таго, што напісана ў рубрыках і г.д.

***рэфлексія***

Педагог абмяркоўвае з дзецьмі метад «Прабач за ...», «Дзякуй за ...".

Пытанні для абмеркавання.

*Ці спадабаліся гэтыя рубрык, ці не, і чым?*

*Якія станоўчыя якасці ёсць у гэтых рубрыках? Чым яны карысныя?*

*Ці ёсць адмоўныя бакі ў гэтых рубрыках, якія?*

*Хто з вас можа цяпер папрасіць прабачэння ці падзякаваць каму-небудзь?*

**Метадычныя рэкамендацыі:** Пры аналізе рубрык старанна адбірайце надпісы для агульнага абмеркавання. Якія-небудзь з іх могуць насіць вельмі глыбокі і асабісты характар. Арыентуйцеся на тое, падпісаўся аўтар ці не (калі аўтар саромеецца называць сябе, то, хутчэй за ўсё, надпіс носіць канфідэнцыйны характар).

### Модульны праект "Скарбы роднай мовы"

Большасць з вас наведвае аб'яднанні па інтарэсах у Палацы дзіцячай творчасці. А як бы загучалі гэтыя назвы на беларускай мове?

**Ваша заданне:** перакласці на беларускую мову назвы гурткоў у НДЦ "Зубронак" і прыдумаць для кожнага гуртка прыгожую іншую назву, якая б адлюстроўвала напрамак дзейнасці.

### Модульны праект "Мы - маладыя"

*2015 год – Год моладзі*

На змену адышоўшага Года гасціннасці паўнапраўна ўступіў у свае правы Год моладзі. Самы прыдатны час для юных беларусаў, каб праявіць сябе ў яшчэ большай ступені і паказаць свае магчымасці.

*16 кастрычніка Прэзідэнт Беларусі падпісаў указ аб абвяшчэнні 2015 Годам моладзі. Дакумент прыняты ў мэтах развіцця творчага, навуковага і прафесійнага патэнцыялу моладзі, яе актыўнага прыцягнення да правядзення сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў у Беларусі, выхавання пачуцця патрыятызму і грамадзянскай адказнасці ў маладых грамадзян.*

*На пачатак 2014 колькасць моладзі ва ўзросце ад 14 гадоў да 31 года ў Беларусі складала 2.185.000 чалавек, або 23,08% агульнай колькасці насельніцтва краіны.*

Урад Беларусі зацвердзіў план мерапрыемстваў па правядзенні ў 2015 годзе Года моладзі. Адпаведны план зацверджаны пастановай Савета Міністраў №1228 ад 23 снежня 2014 года.

План уключае больш за 70 пунктаў. Тут і мерапрыемствы, прысвечаныя патрыятычнаму выхаванню моладзі, і прапагандзе здаровага ладу жыцця, развіццю масавага спорту, фарміраванні культуры бяспечнай жыццядзейнасці, падтрымцы маладых людзей, якія трапілі ў цяжкую жыццёвую сітуацыю.

Частка мерапрыемстваў будзе таксама накіравана на падтрымку творчай актыўнасці, выяўленне таленавітай і адоранай моладзі. Так, у прыватнасці, на будучы год запланавана правядзенне цэлага шэрагу рэспубліканскіх конкурсаў, фестываляў, турніраў, дзе маладыя людзі змогуць праявіць сябе.

Асобная ўвага будзе нададзена арганізацыі занятасці, падтрымцы прадпрымальніцкай актыўнасці моладзі, фарміраванні кадравага рэзерву, а таксама працы з маладымі спецыялістамі. Акрамя таго, будзе працягнута і развіццё міжнароднага маладзёжнага супрацоўніцтва.

Згодна з пастановай, адказным за каардынацыю працы па выкананні рэспубліканскага плана мерапрыемстваў па правядзенні ў 2015 годзе Года моладзі, вызначана Міністэрства адукацыі.

Заданне: прыдумайце, выканайце і размясціце на атрадным месцы лагатып Года моладзі (дарэчы, у адпаведнасці з рэспубліканскім планам мерапрыемстваў па правядзенні Года моладзі на студзень 2015 года запланаваны Рэспубліканскі конкурс на лепшы лагатып Года моладзі).

**Легенда пра возера Свіцязь**

*(модульны праект "Легенда на кожны дзень")*

*Жыхары горада Свіцязя мелі такую негасцінную завядзёнку, што ніколі не дазвалялі начаваць у ім падарожнікам. Раз прыйшоў туды стары калека-прахожы і папрасіўся да беднай жанчыны-ўдавы з дзіцем пераначаваць. Яна не хацела пускаць яго, наракаючы на сваю беднасць, і яшчэ баялася суда суседзяў. Але стары расчуліў яе, даў ёй тры зярняткі жыта, і калі яна іх змалола, дык выйшла тры чвэрці мукі. Здзіўленая цудам жанчына нарэшце пусціла яго ў хату. Стары пераначаваў, а на другі дзень жанчыну за непаслушэнства закону*

*жыхары хацелі пакараць. Стары заступіўся за яе, але, разам з тым, за такі нядобры звычай вырашыў пакараць усіх жыхароў Свіцязя. Загадаў жанчыне ўзяць на рукі сваё дзіця і ісці не аглядаючыся з горада, які зараз жа, сказаў, затопіцца вадой. Толькі яны выйшлі за браму, як горад пачало заліваць. Жыхары ўзнялі плач, енк, а жанчына, што выйшла з горада, з цікаўнасці азірнулася. За тое, што не паслухалася старога, яна ператварылася ў камень.*

*І цяпер гэты камень стаіць у возеры недалёка ад берага, нагадваючы жанчыну з дзіцем на руках. Кажуць, што калі хто даплыве да каменя і дакранецца да яго рукой, то з каменя выступае кроў.*

## ДЗЕНЬ ПЯТНАЦЦАТЫ (24 студзеня)

**Гэты дзень у календары**

**1904 г.** У вёсцы Шутавічы (цяпер Смаргонскі раён) нарадзіўся Іван Шутавіч, літаратуразнаўца, кнігавыдавец. У 1935 - 1939 гадах быў выдаўцом і рэдактарам літаратурна-навуковага часопіса “Каласы”, у якім друкаваліся творы М.Танка, В.Тавлая, Я.Драздовіча. Пісаў артыкулы па пытаннях беларускай мовы, захавання помнікаў беларускай культуры.

**1919 г.** Дата нараджэння Івана Кузняцова, кампазітара, заслужанага дзеяча мастацтваў. У 1953 - 1970 гадах працаваў у Міністэрстве культуры, выдавецтве “Беларусь”. Сярод твораў: аперэта “Новая прыстань”, уверцюра “Святочная Беларусь”. Шырокую вядомасць атрымалі яго песні “Вітальная аб Волзе”, “Песня пра Мінск”, “Ходзяць песні над ракою”.

**2004 г.** Адбыўся пуск першай чаргі новага гарналыжнага спартыўна-аздараўленчага комплексу «Лагойск» ў 30 кіламетрах ад Мінска.

**Задачы:**

садзейнічаць інтэлектуальнаму развіццю падлеткаў;
садзейнічаць асэнсаванню сваёй нацыянальна-культурнай прыналежнасці;
стварэнне ўмоў для разнастайнага адпачынку дзяцей.

**У гэты дзень праводзіцца:**

шосты школьны дзень;
экскурсія “Старажытны Полацк”;
міні-даследаванне “Знакамітыя вучоныя – ураджэнцы Беларусі” (1-2 этапы);
модульны праект “Скарбы роднай мовы”;
модульны праект “Легенда на кожны дзень”;
дыскатэка.

**Міні-даследаванне “Знакамітыя вучоныя – ураджэнцы Беларусі”**
*(прысвечана Дню беларускай навукі 25 студзеня)*

**Мэта:** прывіццё павагі да гісторыка-культурнай спадчыны беларускага народа.

**Задачы:**

знаёміць навучэнцаў з жыццём і дзейнасцю выдатных навукоўцаў свету - ураджэнцаў Беларусі;

фарміраваць асновы інфармацыйнай культуры: уменне вылучаць неабходную інфармацыю, якасны адбор інфармацыі і адраснасць інфармацыйнага ўздзеяння;

выхоўваць пачуццё гонару за сваю краіну.

**Правядзенне даследавання**

Праект рэалізуецца 24 – 25 студзеня. Для арганізацыі работы атрад раздзяляецца на 7 груп (па колькасці рэгіёнаў Беларусі). Кожная группа будзе вывучаць адзін рэгіён.

Работа арганізуецца ў некалькі этапаў:

**1 этап “Вучоныя - ураджэнцы Беларусі”**

Кожная група збірае інфармацыю аб адным-двух вучоных, ураджэнцах Беларусі, а таксама пра тыя месцы, дзе нарадзіліся дадзеныя вучоныя (вобласць, раён, установы адукацыі).

Вынікі дадзенага этапу афармляюцца ў выглядзе наступнай табліцы (па кожнаму вучонаму):

| | |
|---|---|
| Прозвішча, імя, імя па бацьку, гады жыцця | |
| Месца нараджэння | |
| Навуковая дзейнасць | |
| Месца работы | |
| Вучоная ступень, вучонае званне | |
| Узнагароды і прэміі | |
| Выдадзеныя кнігі, артыкулы | |
| Інфармацыя аб месцы нараджэння (вобласць, раён, установа адукацыі) | |

**2 этап “Сацыялагічнае даследаванне”**

На дадзеным этапе даследчай групай праводзіцца сацыялагічнае даследаванне сярод выхаваўцаў цэнтра па наступных напрамках:

1. Пазнавальнасць вучоных са спісу , атрыманага на 1 этапе даследавання, выхаваўцамі цэнтра.

2. Прысутнасць на змене навучэнцаў з тых месцаў , дзе нарадзіліся навукоўцы.

Атрыманыя дадзеныя прадстаўляюцца ў выглядзе зводнай табліцы :

| Прозвішча, імя, імя па бацьку вучонага | Колькасць апытаных | Колькасць выхаванцаў, знаёмых з імем вучонага | Колькасць выхаванцаў, якія з’яўляюцца землякамі вучонага |
|---|---|---|---|
| | | | |

**3 этап “Каб ведалі і памяталі”**

Кожная міні-група рыхтуе інфармацыйны лісток на беларускай мове пра вучоных, ураджэнцаў Беларусі і прадстаўляе яго 25 студзеня для ўсіх выхаванцаў атрада. Інфармацыйныя лісткі размяшчаюцца на атрадным месцы, а лепшыя работы – на інфармацыйным стэндзе корпуса.

**Праект “Скарбы роднай мовы”**

**Заданне:** Знайдзіце эквівалент у рускай мове для наступных прыказак і прымавак

*Адзін пень гарэў, а другі спіну грэў.*
*Умеў узяць — умей і аддаць.*
*За высокім частаколам слівы смачнейшыя*
*І ў цесце можна палец вывіхнуць.*
*Хто ў плот, а хто ў агарод.*
*Дзе чубы трашчаць, там і пэйсы ляцяць.*

**Модульны праект “Легенда на кожны дзень”**

Сёння вам неабходна прыдумаць легенду, у якой бы знайшлі адлюстраванне законы і традыцыі нашага цэнтра.

## ДЗЕНЬ ШАСНАЦЦАТЫ (25 студзеня)

**Гэты дзень у календары**

**Дзень беларускай навукі**

*У апошнюю нядзелю студзеня ў Беларусі адзначаецца Дзень беларускай навукі. Вядучым даследчым і навуковым цэнтрам краіны з’яўляецца Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, заснаваная ў 1928 годзе. Сёння яна аб’ядноўвае высокакваліфікаваных вучоных розных спецыяльнасцяў і дзесяткі навукова-даследчых, навукова-вытворчых, канструктарскіх і ўкараняльных арганізацый. У Нацыянальнай акадэміі навук працуе больш за 18 тысяч даследчыкаў, тэхнікаў, дапаможнага і абслугоўваючага персаналу, сярод якіх нямала дактароў і кандыдатаў навук. За апошні час у навуковай сферы*

*рэспубліці быў праведзены шэраг рэформаў, галоўная ідэя якіх - стварэнне з боку навукі так званай паралельнай эканомікі. Але праблема ў тым, што, нягледзячы на наяўнасць неабходнай нарматыўнай базы, умовы для з'яўлення і эфектыўнага развіцця невялікіх інавацыйных прадпрыемстваў (менавіта яны павінны б стаць асновай паралельнай эканомікі) сёння не самыя спрыяльныя. Буйныя ж прадпрыемствы не заўсёды маюць дастаткова сродкаў для ўкаранення новых распрацовак*

**1869 г.** Дата нараджэння Адама Гурыновіча, беларускага паэта-дэмакрата, фалькларыста, перакладчыка, кіраўніка нелегальнага «Гуртка моладзі польска-літоўскай, беларускай і маларасейскай». Звяртаўся да жанраў балады, байкі, пейзажнай лірыкі. Пераклаў на беларускую мову творы А.Пушкіна, І.Крылова, Н.Някрасава.

**1929 г.** У вёсцы Лобзава цяперашняга Зэльвенскага раёна нарадзіўся Міхал Ян Генрык Гедройц, англійскі гісторык. З 1947 г. жыў у Англіі. Працаваў у авіяцыйнай прамысловасці, чытаў лекцыі па аэрадынаміцы. Адначасова даследаваў гісторыю ВКЛ. Аўтар работ аб увядзенні хрысціянства ў Беларусі і Літве, каментарыяў да англійскага перакладу "Хронікі Быхаўца".

**1954 г.** Нарадзіўся Астапковіч Мікалай Іванавіч (Жодзіна, 1954 - 1999), спартсмен і трэнер (веславанне на байдарках і каноэ), заслужаны майстра спорту, заслужаны трэнер Беларусі.

**Дзень студэнтаў** (Таццянін дзень).

**Задачы:**

заахвочваць навукова-даследчую дзейнасць выхаванцаў;
развіваць актыўную грамадзянскую пазіцыю;
стымуляванне станоўчай матывацыі да фізічнай культуры;
развіваць цікавасць да культуры беларускага народа;
стварэнне ўмоў для разнастайнага адпачынку дзяцей.

**У гэты дзень праводзіцца:**

дыскусійны мультыпарк;
музычная гадзіна;
спартыўныя спаборніцтвы па баскетболе;
міні-даследаванне "Знакамітыя вучоныя – ураджэнцы Беларусі" (3 этап);
модульны праект "Скарбы роднай мовы";
модульны праект "Мы - маладыя";
модульны праект "Легенда на кожны дзень";
дыскатэка.

### Модульны праект "Скарбы роднай мовы"

Інфармацыйны лісток аб знакамітых-вучоных, ураджэнцах Беларусі, павінен быць падрыхтаваны на беларускай мове.

**Модульны праект “Мы - маладыя”**

*Дзяржаўная палітыка па падтрымцы дзіцячых і маладзёжных грамадскіх аб’яднанняў.*

У цяперашні час **прававая падтрымка моладзі ажыццяўляецца ў рамках 9 кодэксаў, 20 законаў, 40 указаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, больш за 100 пастаноў урада**.

У Рэспубліцы Беларусь зарэгістравана **234 маладзёжныя і дзіцячыя грамадскія аб’яднанні**, якія ахопліваюць сваёй дзейнасцю больш за палову навучэнскай і працоўнай моладзі.

З 234 зарэгістраваных маладзёжных і дзіцячых грамадскіх аб’яднанняў:

**58 рэспубліканскіх і міжнародных аб’яднанняў** (у тым ліку 10 дзіцячых);

**176 рэгіянальных (мясцовых) аб’яднанняў** (у тым ліку 23 дзіцячых).

У Брэсцкай вобласці зарэгістравана 28 аб’яднанняў (у тым ліку 5 дзіцячых);

у Віцебскай вобласці - 21 аб’яднанне;

у Гомельскай вобласці - 16 аб’яднанняў (у тым ліку 2 дзіцячых);

у Гродзенскай вобласці - 11 аб’яднанняў (у тым ліку 2 дзіцячых);

у Мінскай вобласці - 14 аб’яднанняў (у тым ліку 8 дзіцячых);

у Магілёўскай вобласці - 7 аб’яднанняў (у тым ліку 2 дзіцячых);

ў г. Мінску - 79 аб’яднанняў (у тым ліку 4 дзіцячых).

У Беларусі існуе **Рэспубліканскі рэестр маладзёжных і дзіцячых аб’яднанняў, якія карыстаюцца дзяржаўнай падтрымкай**. У цяперашні час у яго ўключаны **16** арганізацый:

1) Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя - www.brsm.by/ru/pioneer

2) Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі -www.brsm.by (Інтэрнэт-партал “Моладзь Беларусі”)

3) Ліга добраахвотнай працы моладзі - www.lyvs.bn.by

4) Беларускі КВЗ - www.kvn.by

5) Беларуская ліга інтэлектуальных каманд -www.blik.by

6) Беларуская Асацыяцыя клубаў ЮНЕСКА - www.belau.info

7) Асацыяцыя беларускіх гайдаў - www.belguides.com

8) Беларуская маладзёжная грамадская арганізацыя выратавальнікаў-пажарных - www.bmoosp.by

9) Беларуская рэспубліканская скаўцкая Асацыяцыя - www.scout-belarus.org

10) Рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне «Беларуская федэрацыя Шатакан каратэ-да» - www.bfsk.ucoz.ru

11) Рэспубліканскі саюз грамадскіх аб’яднанняў «Беларускі камітэт маладзёжных арганізацый» - E-mail: bkmo@tut.by

12) Беларуская федэрацыя старадаўняй аўтатэхнікі «Барэтра» - E-mail: baretro@rambler.ru.

13) Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам - www.belapdi.org

14) Беларуская арганізацыя сацыяльнай падтрымкі дзяцей і падлеткаў «Мы - дзецям» - E-mail: evland@mail.ru; http://children.iatp.by

15) Міжнародная асацыяцыя маладзёжных грамадскіх арганізацый пажарных-выратавальнікаў -us_spasatel@mail.ru

16) Грамадскае аб'яднанне «Беларускі камітэт Спешыал Алімпікс» - http://by-specialolympics.deal.by

*Заданне: Правесці сярод выхаванцаў атрада апытанне, аформіць і размясціць вынікі на атрадным месцы.*

*Пытанні для даследавання:*

*1. Якія з названых арганізацый і аб'яднанняў табе:*

*а) добра знаёмы;*

*б) чуў назву;*

*в) першы раз пачуў.*

*2. Членам якой з вышэйпералічаных арганізацый ты з'яўляешся?*

*3. Калі б у цябе была магчымасць выбару, то членам якой арганізацыі (аб'яднання) ты хацеў бы стаць?*

## Легенда "Чорная дама Нясвіжскага замка"

*(модульны праект "Легенда за легендай")*

*Чатыры з паловай стагоддзі жыве легенда аб Чорнай даме. І ў нашы дні вераць у прывід Нясвіжскага замка: сцвярджаюць, што роўна ў 15 хвілін а першай гадзіне ночы таямнічая жаночая постаць пачынае абыход пакояў. Яна стогне, усхліпвае, плача па сваім рана загубленым жыцці і вялікім каханні, а ў 15 хвілін а пятай гадзіне раніцы вяртаецца ў схове шча - вялізныя падзямеллі са шматлікімі хадамі, якімі карысталіся ў часы сярэдневякоўя.*

***Нясвіжскі замак** - месца гістарычнае, і гераіня нашага падання таксама існавала рэальна. Вось што расказваюць у Нясвіжы пра тыя часы, дзе-нідзе адхіляючыся ад сапраўдных падзей.*

*...У сярэдзіне XVI стагоддзя ў Вялікім княстве Літоўскім жыў усемагутны ўладар - слаўны і багаты Мікалай Радзівіл па мянушцы Чорны. Праз сваю стрыечную сястру Барбару Радзівіл, якая жыла ў Вільні, ён параднiўся з будучым польскім каралём Жыгімонтам Аўгустам. Вядома, што яна рана страціла бацьку, а ў хуткім часе і мужа. Палацы-замкі маладой удавы і каралевіча Жыгімонта Аўгуста знаходзіліся побач і ён не застаўся абыякавым да прыгажосці Барбары. Яны пачалі сустракацца і пакахалі адзін аднаго, аб чым хутка даведаліся сваякі. Асабліва расхвалявауся нясвіжскі Радзівіл - Мікалай Чорны. Ён вельмі клапаціўся аб гонару сястры і вырашыў прыняць неабходныя захады, каб захаваць імя яе і свайго роду ад непажаданых плётак. Да таго ж тут узнікаў шанс, які мог здзейсніць яго тайныя імкненні, што сягалі даволі далёка, і перашкодай у выкананні якіх была маці каралевіча - Бона Сфорца. Яна люта ненавідзела "выскачак" Радзівілаў.*

*І таму Мікалай сам паехаў у Вільню, каб на месцы прыняць адпаведнае рашэнне: з сабою ён узяў роднага брата Барбары - Мікалая Рудога і накіраваўся ў замак да каралевіча. У рыцарскім адзенні браты выглядалі вельмі грозна. Пры сустрэчы яны сталі патрабаваць ад Жыгімонта, каб той альбо ажаніўся з Барбарай, альбо больш з ёй не сустракаўся. Каралевіч, які добра ведаў сваё хісткае становішча, адносіны каралевы-маці да прадстаўнікоў рода Радзівілаў, а таксама розныя інтрыгі пры каралеўскім двары, паабяцаў, што ён пакіне горача каханую Барбару.*

*Радзівілы зрабілі выгляд, што ад'язджаюць з Вільні. Жыгімонт, не ведаючы аб гэтым, захацеў зноў сустрэцца са сваей любай. Жаданне было такім моцным, што ён вырашыў парушыць дадзенае слова. І вось у час сустрэчы закаханых раптоўна з'явіліся браты і запатрабавалі ад Жыгімонта ажаніцца з іх сястрою, таму што ён не стрымаў слова. Каралевіч згадзіўся, але папрасіў, каб шлюб заставаўся ў тайне да таго часу, пакуль ён не стане каралём (стары кароль дажываў апошнія дні), інакш яму будзе цяжка абараніць не толькі Барбару, але і сябе.*

*Хронікі аб гэтым пісалі так: "Кароль абяцаў Радзівілам не хадзіць да яе і доўга трымаў сваё слова. Потым ён не змог супраціўляцца гарачаму прыроднаму поклічу крыві і пайшоў да яе ноччу. А паны Радзівілы гэта падпільнавалі, з'явіліся перад ім і сказалі: "Міласцівы кароль! Кляўся ніколі не прыходзіць да нашай сястры, чаму ж цяпер ты тут знаходзішся?" А кароль на гэта: "А хто ведае, ці не прынясе мой прыход да вашай сястры павелічэнне вашай славы, шанавання і маёмасці вашай?," Яны адказалі: "Дай гэта Бог!" У гэты момант паклікалі плябана, які быў на ўсякі выпадак падрыхтаваны, і павянчалі караля і Барбару патаемна, так што ніхто з членаў Рады, духавенства і свецкіх, ніхто з каралеўскага двара не ведаў аб гэтым саюзе, за выключэннем Радзівілаў, Кежкайлы і ксяндза."*

*Праз некаторы час Жыгімонт Стары памёр, і каралевіча тэрмінова выклікалі ў Кракаў. Тым часам Бона Сфорца актыўна шукае для маладога караля нявесту (першая жонка Жыгімонта заўчасна памерла). Шлюб павінен быў умацаваць трон і павялічыць прэстыж Рэчы Паспалітай у Еўропе. І таму ўдарам грому з'явілася вестка пра тое, што ў караля ўжо ёсць жонка.*

*Бона Сфорца пачынае рабіць усё, каб сейм не каранаваў яе нявестку. Радзівілам трэба было не дапусціць такога рашэння і Мікалай Чорны спецыяльна едзе ў Рым да папы. Сейм усё ж быў вымушаны каранаваць Барбару, і каралева-маці ў знак пратэсту пакідае Кракаў і выязджае на радзіму - у Італію. Яна забрала з сабой усю світу, усіх сваіх прыхільнікаў, але патаемна пакінула агентаў з заданнем атруціць ненавісную маладую каралеву. Да нашых дзён дайшло яго прозвішча - Монці. Гэта ён замест патрэбнага лякарства прыгатаваў яд, які павольна звёў квітнеючую прыгажуню ў магілу. Барбара была каранавана ў снежні 1550 года, а праз шэсць месяцаў яе не стала.*

*Кароль пасля смерці сваёй каханай так сумаваў, што вырашыў вызваць яе душу пры дапамозе алхімікаў. Зрабіць гэта ўзяліся Твардоўскі і Мнішак - гіста-*

*рычныя асобы. У змрочнай зале было ўсё падрыхтавана, каб з дапамогай люстраў, на адным з якіх была выгравіравана постаць Барбары ва ўвесь рост у белым адзенні, разыграць сцэну сустрэчы караля і душы яго каханай. Караля пасадзілі ў крэсла і хацелі прывязаць рукі да падлакотнікаў, каб ён незнарок не дакрануўся да прывіду. Жыгімонт даў слова, што будзе сядзець спакойна і толькі на адлегласці запытае ў каханай, як яму жыць далей. Але, калі з'явілася здань, ён ад хвалявання забыўся на сваю клятву. Ускочыўшы з крэсла, кінуўся да прывіду са словамі: "Басенька мая!"- і хацеў яго абняць. Пачуўся выбух, пайшоў трупны пах - цяпер душа Барбары не магла знайсці дарогу ў магілу, вечна ёй блукаць па зямлі.*

*Вось з таго часу і ходзіць яна сярод людзей, а пасля смерці караля пасялілася ў Нясвіжскім замку. У знак жалобы па сваім загубленым каханні перад жывымі яна заўсёды з'яўляецца ў чорным адзенні. З часам у замку пачалі лічыць, што прывід папярэджвае гаспадароў, калі ім пагражае якая-небудзь небяспека, вайна, хвароба.*

## ДЗЕНЬ СЯМНАЦЦАТЫ (26 студзеня)

**Гэты дзень у календары**

**Міжнародны дзень мытніка**.

*У лістападзе 1952 ўступіла ў сілу Канвенцыя аб стварэнні Савета мытнага супрацоўніцтва. 26 студзеня 1953 ў Брусэлі адбылася першая сесія Савета мытнага супрацоўніцтва, у 1994 годзе ён атрымаў сваю цяперашнюю назву - Сусветная мытная арганізацыя (World Customs Organization). На ёй былі прадстаўлены кіраўнікамі сваіх мытных службаў 17 краін Еўропы. Праз 30 гадоў, у 1983 годзе, менавіта гэты дзень быў выбраны ў якасці штогадовага свята Міжнароднага дня мытніка (International Customs Day).*

*Ідэі мытнай супольнасці атрымалі вялікі водгук. Досыць хутка са сціплай арганізацыі, якая аб'ядноўвае абмежаваную колькасць еўрапейскіх дзяржаў, Савет мытнага супрацоўніцтваператварыўся ў аўтарытэтную арганізацыю міжнароднага маштабу. У цяперашні час Сусветная мытная арганізацыя аб'ядноўвае 162 дзяржавы. Міжнародны дзень мытніка з'яўляецца падставай не толькі для праявы міжнароднай салідарнасці мытных службаў усяго свету, але і для прыцягнення ўвагі грамадскасці да значнасці ролі мытні ў эканамічным і сацыяльным развіцці грамадства. Сёння сваё прафесійнае свята адзначаюць больш за 800 тысяч чалавек - такая агульная колькасць мытнікаў ва ўсім свеце.*

**Міжнародны дзень без інтэрнэту**. Сваю гісторыю гэтае свята вядзе з пачатку 2000-х гадоў, а ініцыятарам яго ўстановы, па адных дадзеных, з'яўляецца "Брытанскі Інстытут сацыяльных вынаходак", а па іншых - брытанскі некамерцыйны онлайн-праект «DoBe.org».

**Задачы:**

стварыць умовы для фарміраванне актыўнай, самастойнай асобы падлетка;

садзейнічаць развіццю ініцыятывы падлеткаў;

пашырыць веды выхаванцаў па краязнаўству і музеязнаўству;

фарміраваць навыкі калектыўнага аналізу.

**У гэты дзень праводзіцца:**

дзень самакіравання;

“Акадэмія музеязнаўства”;

спартыўныя спаборніцтвы па дартсу;

модульны праект “Скарбы роднай мовы”;

модульны праект “Легенда на кожны дзень”;

дыскатэка.

**Модульны праект “Скарбы роднай мовы”**

Многа песен прысвечана нашаму цэнтру. Паспрабуйце зрабіць пераклад адной з іх на беларускую мову.

**Легенда “Адкуль зязюла ўзялася”**

*(модульны праект “Легенда на кожны дзен)*

*Калісь праз вякі, у нашым краі, жыў багаты селянін,— Властам яго звалі, і меў ён тры дачкі: Мляву, Здану і Зязюлю, як кветкі красныя, ладныя, як птушкі, але прыгажэйшая за ўсіх, то Зязюля была. За гэта завідная Млява проціў Зязюлі зло мела.*

*Раз, пад вечар, пасля спякоты, прыбягае Млява да сясцёр і кажа:*

*— Сястрычкі, кветачкі, пойдзема на возера купацца!*

*Тыя, вядома, як дзяўчаты,— рады падурэць, кінуліся навыперадкі. Зязюля апярэдзіла ўсіх, бо спраўнейшая была; за ёю і Здана пабегла.*

*Кінуўшы вопраткі на беразе, паскакалі ў ваду і давай плёскацца, а Млява тым часам спраўна ўвільнулася: вопратку Зязюльчыну скраўшы, патапіла ў возера і сама, як бы нічога не ведаючы, палезла купацца.*

*Купаюцца гэта яны, ажно загрымела — зірк! — бура, навальніца надходзіць.*

*— Сястрыцы, уцякайма! — крычыць Млява і, не чакаючы другіх, схапіўшы вопратку, духам дамоў. За ёю і Здана пабегла. А Зязюля ходзіць па беразе, рукі ломіць, усё вопратку шукае, шукае ды глядзіць. А вецер свішча, а на неба аж страх глянуць: хмары з рэхам адна на другую пруцца, барукаюцца, варочаюцца,— няйначай як у гаршку. Ходзіць Зязюля, галосячы,— зірк! — з-за куста паніч выходзіць — красен, што прыгажэйшага ў свеце не знайсці, і вопратку Зязюльчыну ў руках трымае. Зязюлька хацела ўцякаці, але, глянуўшы яму ў вочы, стала як прыкована і глядзіць, вачэй адвесці не можа; штось да яго цягне, а сэрца як бы чым цёплым аблілося, а яшчэ як загаварыў, дык Зязюля не*

*вытрымала — кінулася яму на шыю. І забраў той закляты княжыч Зязюлю да сябе ў крыштальныя палацы, у возера.*

*Жывуць яны ў шчасці, што лепшага і не згадаць, год, другі і трэці, а далей — згадала Зязюля бацькоў, і захацелася ёй праведаць іх, і просіць мужа:*

*— Саколе мой ясны, пусці мяне дадому збегаць, бацьку ды маці пацешыць!*

*Той хоць нехаця, але дазволіў і кажа:*

*— Глядзі, Зязюля, не баўся, перад ноччу назад вяртайся, і як прыйдзеш на бераг, то клікні тройчы: «Якуб!» — і выплыве вуж вялізны, а ты не бойся яго, бо то я буду і забяру цябе!*

*Прыйшла гэта Зязюля да бацькоў, а тыя радыя — не знаюць, як яе прымаці: на кут пасадзілі, белым пірагом ды салодкім мёдам частавалі. А Мляву, гледзячы на тое, яшчэ горш зло бярэ. Як толькі маці з Зязюляю засталіся самі ўдзвюх, стала маці пытацца, дзе яна жыве, як і з кім, як яго зваці. Тая, бедная, вядома, як матцы, і выказала ўсё, а таго не ведала, што Млява пад дзвярыма ўсё чуе. Прагаварылі так да вечара і не агледзеліся, як стала цямнець.*

*Тады бачыць Млява, што Зязюля да мужа збіраецца, сама, узяўшы тапор, чым хутчэй пабегла на бераг і кліча:*

*— Якуб! Якуб! Якуб!*

*Ён, небарака, не распазнаўшы голасу, выплыў, а яна як трэсне тапаром яго па галаве, так напалам і рассекла, а сама наўцёкі. Счакаўшы крыху, прыбягае і Зязюля, але, знаць, сэрцам чуе нядолю, бо і губы пабялелі, і ручкі чагось трасуцца, а сэрца аж здалёк чуваць, як калоціцца. Стала на беразе і кліча:*

*— Якуб! Якуб! Якуб!*

*І жаласць бярэ яе вялікая... З той вялікай жаласці зрабілася яна птушачкай, і ляціць Зязюля на вярбу, з вярбы ў лес, і так з дрэва на дрэва ляціць і кліча:*

*— Якуб! Якуб! Якуб! (http://bellib.org)*

## ДЗЕНЬ ВАСЯМНАЦЦАТЫ (27 студзеня)

**Гэты дзень у календары**

***Дзень зняцця блакады Ленінграда (1944 год)***

Блакада Ленінграда - ваенная блакада нямецкімі, фінскімі і іспанскімі (Блакітная дывізія) войскамі з удзелам добраахвотнікаў з Паўночнай Афрыкі, Еўропы і ваенна-марскіх сіл Італіі ў час Вялікай Айчыннай вайны Ленінграда (цяпер Санкт -Пецярбург). Доўжылася з 8 верасня 1941 года па 27 студзеня 1944 (блакаднае кальцо было прарвана 18 студзеня 1943 г. ) - 872 дні.

Да пачатку блакады ў горадзе не мелася дастатковых па аб’ёме запасаў прадуктаў харчавання і паліва. Наяўнасць асноўных прадуктаў харчавання на 12 верасні 1941года:

Хлебнае зерне і мука - 35 сутак;
Крупы і макароны - на 30 сутак;
Мяса і мясапрадукты - на 33 дні;
Тлушчы - 45 сутак;
Цукар і кандытарскія вырабы - на 60 сутак.

Адзіным шляхам сувязі з Ленінградам заставалася Ладажскае возера , якое знаходзілася ў межах дасяжнасці артылерыі і авіяцыі абложнікаў, на возеры таксама дзейнічала аб'яднаная ваенна-марская флатылія праціўніка. Прапускная здольнасць гэтай транспартнай артэрыі не адпавядала патрэбам горада. У выніку распачаўся ў Ленінградзе масавы голад, узмоцнены асабліва суровай першай блакаднай зімой, праблемамі з ацяпленнем і транспартам, прывёў да сотні тысяч смерцяў сярод жыхароў.

У студзені-лютым 1942 года ў горадзе паміралі штомесяц прыблізна 130 000 чалавек, у сакавіку памерла 100 000 чалавек, у маі - 50 000 чалавек, у ліпені - 25 000 чалавек, у верасні - 7000 чалавек.

**Міжнародны дзень памяці ахвяр Халакосту**

Абвешчаны рэзалюцыяй Генеральнай Асамблеі ААН ад 1 лістапада 2005 года. У сучасным разуменні халакост - гэта наўмыснае і сістэматычнае праследванне і знішчэнне ў гады Другой сусветнай вайны нямецкімі нацыстамі і калабарантамі з іншых краін прадстаўнікоў яўрэйскага народа, славян, цыган, людзей з разумовымі і фізічнымі адхіленнямі. Ахвярамі халакоста сталі 6 млн яўрэяў. Толькі на тэрыторыі Беларусі ў 260 гета былі знішчаны больш за 800 тыс. чалавек. Акрамя таго, у гады Другой сусветнай вайны было планамерна знішчана трэцяя частка цыганскага народу, у лагерах смерці загінулі мільёны савецкіх ваеннапалонных і мірных грамадзян, прадстаўнікоў еўрапейскіх народаў

**1964 г.** Нарадзіўся Сакалоўскі Алег Анатольевіч, беларускі вучоны ў галіне траўматалогіі і артапедыі, доктар медыцынскіх навук (2004). Аўтар навуковых прац па лячэнні паталогіі тазасцегнавога сустава ў дзяцей і дарослых. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2011).

**Задачы:**

фарміраваць патрыятычныя адносіны да сваёй малой радзімы;
выхоўваць культуры гледача.

**У гэты дзень праводзіцца:**

спартыўныя спаборніцтвы па настольным тэнісе;
падвядзенне вынікаў трэцяга гульнявога перыяду “Музея археалогіі”;
модульны праект “Мы - маладыя”;
модульны праект “Легенда на кожны дзень”;
шоу-праграма ”Міс “Зубронак”.

## Модульны праект “Мы - маладыя”

*Сродкі масавай інфармацыі - моладзі.*

**“Знамя юности”** Галоўнае маладзёжнае грамадска-палітычнае выданне Рэспублікі Беларусь. Падзеі, факты. Самыя свежыя навіны грамадскага жыцця ў Беларусі. Жыццё моладзі і маладзёжных арганізацый краіны. Прыярытэтным накірункам у рабоце рэдакцыі было і застаецца асвятленне пытанняў, звязаных з рашэннем надзённых праблем моладзі краіны - адукацыя, занятасць, прафарыентацыя, паляпшэнне жыллёвых умоў маладых сем’яў, здароўе, сацыяльныя льготы, падтрымка сельскай моладзі, выхаванне патрыятызму, павышэнне прэстыжнасці працы моладзі, фарміраванне духоўна багатага грамадзяніна нашай краіны. Перыядычнасць выхаду: 1 раз на тыдзень (пятніца) на 32 палосах (колер.).

**“Переходный возраст”** Газета «Переходный возраст» - адзінае спецыялізаванае дзяржаўнае выданне для падлеткаў, заснавальнікамі якога з’яўляюцца Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і ГА «БРСМ». Узрост чытачоў газеты складае 12-18 гадоў - гэта складаны і вельмі важны перыяд жыцця чалавека, калі адбываецца не толькі фізічнае сталенне, але і станаўленне асобы ў цэлым. Больш за 50 рубрык, якія змяшчаюць самую разнастайную інфармацыю пра падлеткаў і для падлеткаў і якія дазваляюць выказацца чытачам (больш за 1/3 газеты прадастаўлена для публікацый юных аўтараў), рэгулярна з'яўляюцца на 16-ці старонках 4 разы ў месяц.

**“Зорька”** Займальная і пазнавальная па змесце, яркая і маляўнічая, арыгінальная па дызайне, газета, як яснае сонейка, радуе па пятніцах сваіх падпісчыкаў. Адрасавана выданне школьнікам 8-14 гадоў, але яго з задавальненнем чытаюць старшакласнікі, моладзь, бабулі і дзядулі, якія выхоўваюць унукаў. Разам з ”Зорькой” вырасла не адно пакаленне дастойных грамадзян краіны. І зараз сімвалічна: што дзякуючы стваральнай пазіцыі газеты эстафету слаўных спраў бацькоў працягваюць дзеці.

**Радыёстанцыя “Пілот FM”** Заснавальнікі: ГА «БРСМ» Дата выхаду ў эфір: 27 чэрвеня 2003 г. Час вяшчання: 24 гадзіны ў суткі.

<u>Заданне:</u> трэба скласці спіс сродкаў масавай інфармацыі, праграм на радыё і тэлебачанні (рэспубліканскіх і рэгіянальных), якія можна аднесці да маладзёжных (з указаннем рэгіёну). Інфармацыю размясціць на атрадным месцы.

## Модульны праект “Легенда на кожны дзень”

Вам патрэбна скласці легенду пра супрацоўнікаў НДЦ “Зубронак”, напрыклад, пра вашых выхавацеляў, педагога-арганізатара, начальніка лагера і г.д.

## ДЗЕНЬ ДЗЕВЯТНАЦЦАТЫ (28 студзеня)

**Гэты дзень у календары**

**1829 г.** Нарадзіўся Спасовіч Уладзімір Данілавіча (г.Рэчыца 1829 – 1906, Варшава), юрыст, публіцыст, літаратуразнаўца, гісторык, грамадскі дзеяч.

**1919 г.** Маркам Шагалам заснавана Віцебскае народнае мастацкае вучылішча, адзіная мастацкая ўстанова ў Беларусі ў даваенны час.

**1919 г.** Нарадзіўся Павел Кармунін, акцёр, народны артыст. На сцэне Нацыянальнага акадэмічнага тэатра ім. Я.Купалы стварыў больш за 200 яркіх, глыбока жыццёвых вобразаў. Зняўся ў кінафільмах "Красная плошча", "Рудабельская рэспубліка", "Доўгія вёрсты вайны", "Дзяржаўная граніца". Памёр у 2002 годзе.

**1944 г**. У вёсцы Навасады Чашніцкага раёна нарадзіўся Міхаіл Вінаградаў, архітэктар. Асноўныя працы: у Брэсце - археалагічны музей "Бярэсце", у Мінску - кінатэатр "Масква", будынак Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і іншыя. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2004, 2008 гг.).

**Задачы:**

падвесці вынікі вучэбна-даследчай дзейнасці ўдзельнікаў змены;

стварыць умовы для праяўлення ініцыятывы і творчасці падлеткаў;

вызначыць лідараў органаў дзіцячага самакіравання;

падвесці вынікі рэалізацыі праектаў "Скарбы роднай мовы", "Легенда на кожны дзень";

развіваць рэфлексійныя здольнасці падлеткаў.

**У гэты дзень праводзіцца:**

"Акадэмія музеязнаўства";

адукацыйны форум "Вектар на будучыню";

модульны праект "Легенда на кожны дзень";

атрадны касцёр.

### Легенда "Вось як даўней старых бацькоў кідалі"

*(модульны праект "Легенда на кожны дзень")*

*Даўней у нас, старажылы расказваюць, была такая пастанова: як чалавек пастарэе, то сын вывезе яго ў пушчу і кіне звярам.*

*Ну, аднаго разу вязе сын свайго бацьку (а ён яго, гэта, надта любіў, толькі што рабіць, калі такая пастанова).*

*Аж бацька кажа:*

*— Няўжо ты, сынку, мяне пакінеш?*

*— Я вас, татку, не пакіну, але вязу наўмысна, каб мяне не каралі, а ўночы вас забяру дамоў, і будзеце жыць у каморачцы.*

*Ну, ноч надышла, сын у лес паехаў зноў, узяў бацьку і прывёз дахаты.*

*Праз год здарылася, што град жыта выбіў і не было чым нават пасеяць.*

*Сын і кажа бацьку:*

*— Так і так, як мы жыць будзем?*

*— Не бядуй,— адказвае той,— сынку, як ты яшчэ быў малы, я гумно ставіў, а быў тады надта вялікі ўраджай, і я немалочаным жытам гумно крыў, цяпер абдзяры і будзеш насенне мець.*

*Прайшоў якісь час, адно ж хлеба няма.*

*І зноў кажа сын бацьку:*

*— Так і так...*

*— Не бядуй,— адказвае той,— сыночку, у хаце пад катухом шмат грошай я закапаў, дастань, то будзеш найбагацейшы за ўсіх гаспадароў.*

*І праўда, усе з голаду памiралі, а ён пірагі пёк. Людзі дзівіліся, адкуль гэта ён іх бярэ.*

*Тады няма куды дзявацца — прызнаўся.*

*З тае пары ўжо не кідалі дзеці старых бацькоў.*

## ДЗЕНЬ ДВАЦЦАТЫ (29 студзеня)

**Гэты дзень у календары**

**1829 г.** Створана Беларуская навучальная акруга, якая кіравала ўсімі сярэднімі навучальнымі ўстановамі ў Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Гродзенскай, Віленскай губернях і Беластоцкай вобласці (цэнтр - Віцебск, 14 мая 1850 года ператвораны ў Віленскую навучальную акругу).

**1884 г.** Дата нараджэння палітычнага і грамадскага дзеяча, гісторыка, публіцыста, літаратурнага крытыка Антона Луцкевіча. Выдаваў у Вільні газеты “Наша доля”, “Наша ніва”. У друку выступаў пад псеўданімам Антон Навіна. Заснаваў Беларускую школьную раду, яго стараннямі адкрыты Беларускі музей імя І.І.Луцкевіча. У 1939 годзе рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны ў 1989 годзе.

**1904 г.** Нарадзіўся Міхаіл Баршч, архітэктар, педагог. Асноўныя працы ў Мінску: планіроўка і забудова плошчаў Перамогі і Якуба Коласа, жылыя дамы на Ленінскім праспекце. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі.

**1924 г.** У вёсцы Саламір’е Полацкага раёна нарадзіўся Арцём Баханькоў, мовазнаўца, доктар філалагічных навук, прафесар. Даследаваў лексіку, дыялекталогію, гісторыю беларускай мовы. Сааўтар навуковых прац “Гістарычная лексікалогія беларускай мовы”, “Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы”, тлумачальных слоўнікаў беларускай і рускай моў для сярэдняй школы. Памёр у 2001 годзе.

**1939 г.** У Мінску нарадзіўся Аляксандр Астапеня, вучоны ў галіне гідрагеалогіі, член-карэспандэнт НАН, доктар біялагічных навук, прафесар. З яго ўдзелам распрацавана і рэалізавана сістэма экалагічнага маніторынгу азёр Нарачанскай групы.

**Задачы:**
падвесці вынікі змены;
адзначыць самых актыўных удзельнікаў змены;
зняць эмацыйна-псіхалагічнае напружанне, звязанае з раз’ездам.

**У гэты дзень праводзіцца:**
класныя гадзіны;
урачыстае закрыццё змен;
аперацыі “Утульнасць”, “Чамадан”;
метад асобаснага развіцця “Ліст самому сабе”;
дыскатэка.

**Метад асобаснага развіцця “Ліст самому сабе”**

**Задачы метаду:**
перспектыўная актуалізацыя эмацыйнага вопыту;
развіццё ў дзяцей умення самааналізу;
развіццё мыслення.

**Матэрыялы:** канверты па Рэспубліцы Беларусь (па колькасці дзяцей), папера для лістоў.

**Алгарытм рэалізацыі метаду:**

***увядзенне ў метад***

Педагог абмяркоўвае з падлеткамі, што адбылося з імі на працягу змены . Пытанні для абмеркавання:

*Што добрага было ў змене ?*
*Што асабліва запомнілася? Чаму?*
*Ці знайшлі вы сабе сяброў? Каго?*
*Ці спадабалася вам у «Зубронку»? Чаму?*

***рэалізацыя метаду***

Педагог прапануе падлеткам напісаць ліст самому сабе пра адпачынак у «Зубронку» . Яны пішуць ліст, афармляюць яго, а затым кладуць у канверт. На канверце падлеткі пішуць свой адрас. Праз месяц, пасля таго як выхаваўцы раз’едуцца па дамах, педагог высылае ім лісты .

**Метадычныя рэкамендацыі**: у лістах прапануйце падлеткам адлюстраваць усе самыя лепшыя і цёплыя перажыванні аб цэнтры, пра атрад і выхавацеляў.

# МАТЭРЫЯЛЫ ДА ЗАНЯТКАЎ АБ'ЯДНАННЯ ПА ІНТАРЭСАХ "АКАДЭМІЯ МУЗЕЯЗНАЎСТВА"

## ТЭМА 1 "МУЗЕЯЗНАЎСТВА. МУЗЕЙ ЯК САЦЫЯКУЛЬТУРНЫ ІНСТЫТУТ"

**Мэта:**пашырэнне ведаў выхаванцаў па асновах музеязнаўства

**Задачы:** пазнаёміць навучэнцаў з асноўнымі паняццямі музеязнаўства;

выхоўваць музейную культурув і беражлівыя адносіны да гістарычных помнікаў як часткі агульнай культуры чалавека.

**1. Паняцце музеязнаўства**

***Для выхавацеля:****можна пачаць занятак з размовы з падлеткамі аб тым, што такое музей, музеязнаўства; што яны ведаюць пра развіцце музейнай справы ў Беларусі; як класіфіцыруюць музеі – па ўсіх тых пытаннях, якія стаяць у праграме першага занятку. Пасля абмеркавання падаць неабходную інфармацыю (можна азначэнні папрасіць запісаць, а на наступным занятку – праверыць).*

***Інфармацыя па тэме:***

**Музей** (ад грэч μουσεον - Дом Муз) - установа, якая займаецца збіраннем, вывучэннем, захоўваннем і экспанаваннем прадметаў - помнікаў натуральнай гісторыі, матэрыяльнай і духоўнай культуры, а таксама асветніцкай і папулярызатарскай дзейнасцю.

**Музеязнаўства** (музеялогія) - навуковая дысцыпліна, якая вывучае гісторыю музеяў, іх грамадскія функцыі, тэорыю і методыку музейнай справы.

**Класіфікацыя музеяў**- гэта іх групоўка па прыкметах, істотных для арганізацыі і развіцця музейнай сеткі і для ажыццяўлення музейнай дзейнасці.

Сучаснае музеязнаўства ведае некалькі **сістэм класіфікацыі музеяў**:

***па маштабах дзейнасці*** - музеі цэнтральныя, рэгіянальныя , мясцовыя;

***па форме ўласнасці*** - дзяржаўныя, ведамасныя, грамадскія, прыватныя;

***па адміністрацыйна - тэрытарыяльнай прыкмеце*** - рэспубліканскія , абласныя, гарадскія, раённыя і т . п.;

***па тыпах*** (у залежнасці ад выканання музеем сваіх сацыяльных функцый і іх прыярытэту ў яго дзейнасці) - даследчыя, навучальныя, асветніцкія;

*Даследчыя музеі (акадэмічныя музеі) часцей за ўсё ствараюцца пры навуковых установах. Такі музей мае патрэбу , перш за ўсё, у калекцыях, якія служаць базай для арганізацыі навуковых даследаванняў. Фарміраванне фондаў і іх вывучэнне - галоўнае ў яго рабоце. Такі музей*

*можа зусім не мець экспазіцыйна-выставачных плошчаў, не арганізоўваць экспазіцый, не праводзіць выстаў.*

*Навучальныя музеі накіраваны на рашэнне, перш за ўсё, адукацыйнай функцыі . Як правіла, яны ствараюцца пры школах, ВНУ і інш навучальных установах, часам пры ведамствах (асабліва ваенізаваных: мытня , МУС і да т.п. , дзе ёсць неабходнасць выпрацоўкі ў супрацоўнікаў асаблівых навыкаў ) . Школьныя , вузаўскія і інш музеі фармуюць калекцыі , якія дапамагаюць набыць неабходныя навыкі ў працэсе адукацыі, а таксама дапамагаюць у рэалізацыі навучальных праграм і педагагічных методык.*

*Асветніцкія музеі (масавыя музеі) арыентаваны на наведвальніка ўсіх узростаў, сацыяльных груп і г.д. Галоўнае ў яго дзейнасці - арганізацыя працы з наведвальнікам (праз экспазіцыі, арганізацыю доступу даследчыкам да калекцыях музея , правядзенне рэкрэацыйнай працы і да т.п.). Сярод асветніцкіх музеяў ёсць арыентаваныя на спецыфічную аўдыторыю дзіцячыя музеі. У калекцыі такіх музеяў, разам з рэдкімі ( унікальнымі ) прадметамі, уключаюць і тыя, з якімі дзіця сутыкаецца ў паўсядзённым жыцці, гэта спецыяльна сканструяваныя мадэлі з навучальнымі мэтамі.*

***па прыкмеце ажыццяўлення музеем сваёй навукова-дакументацыйнай функцыі*** - музеі калекцыйнага і ансамблевых тыпаў. У аснове музея *калекцыйнага* тыпу ляжыць калекцыя прадметаў, якія адпавядаюць профілю музея (асноўныя намаганні накіраваны на яе фарміраванне). Дакументаванне такія музеі ажыццяўляюць з дапамогай захавання, камплектавання, вывучэння фондаў музея. Музеі *ансамблевых* тыпаў ажыццяўляюць функцыю дакументавання з дапамогай захавання нерухомых помнікаў, інтэр’ераў, ландшафтаў (асноўныя намаганні накіраваны на захаванне сітуацыі, якая характэрна для прыроднага і культурна - гістарычнага асяроддзя) .

## 2.Музейны фонд Рэспублікі Беларусь

**Музейны фонд Рэспублікі Беларусь** уяўляе сабой сукупнасць рухомых і асобных нерухомых гісторыка–культурных каштоўнасцяў Беларусі, а таксама замежнай гісторыі і культуры , якія маюць гістарычную, мастацкую, навуковую або іншую культурную значнасць і захоўваюцца ў музеях Рэспублікі Беларусь усіх формаў уласнасці.

*Задачамі* Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца найбольш поўнае выяўленне, цэнтралізаваны ўлік, камплектаванне, вывучэнне, забеспячэнне належнай захаванасці і належнага выкарыстання рухомых і асобных нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцяў у мэтах развіцця культуры, навукі, ведаў аб прыродзе і навакольнага асяроддзя, мастацтва, літаратуры, маральнага і эстэтычнага выхавання.

У **склад** Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь уваходзяць:

калекцыі і асобныя музейныя рэчы, звязаныя з найважнейшымі з'явамі і падзеямі ў жыцці беларускага і іншых народаў, дзяржавы і грамадства, з развіццём культуры і побыту, навукі і тэхнікі, мастацтва і літаратуры, з жыццём і дзейнасцю дзяржаўных, палітычных, грамадскіх і ваенных дзеячаў, дзеячаў навукі, літаратуры, культуры і мастацтва, актыўных удзельнікаў гістарычных падзей;

творы манументальнага, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога (у тым ліку народнага), музычнага, тэатральнага і іншых відаў мастацтваў;

калекцыі і асобныя прадметы геалогіі, палеанталогіі, мінералогіі, фауны і флоры, якія характарызуюць прыродазнаўчую гісторыю;

рукапісы ўсіх відаў , уключаючы рукапісныя і старадрукаваныя кнігі, антыкварныя , рэдкія і асабліва каштоўныя выданні;

нумізматычныя, геральдычныя калекцыі і асобныя прадметы;

калекцыі зброі і вайсковай атрыбутыкі, а таксама асобныя прадметы ваеннай тэматыкі;

калекцыі прадметаў з каштоўных металаў і камянёў, а таксама асобныя прадметы , якія змяшчаюць у сваім складзе каштоўныя металы і камяні і якія прадстаўляюць гістарычную , мастацкую ці іншую культурную каштоўнасць;

іншыя прадметы, якія прадстаўляюць гістарычную, навуковую, мастацкую і культурную каштоўнасць.

## 3. Гульня-практыкум “Музей аднаго экспаната”

**Для выхаваццеля:** для правядзенне гульні атрад разбіваецца на некалькі груп (па 5-6 чалавек). Кожная група атрымлівае заданне: стварыць за 5 хвілін музей аднаго экспаната.

Назва выставы – “Паўсядзённы касцюм пачатку XXI стагоддзя”. У якасці манекенаў выступаюць самі падлеткі (улічваецца ўсё аддзенне, якое ёсць на ўдзельніках групы).

**Прыклад:**

Выстава ўтрымлівае ў сабе аддзяленні мужчынскага і жаночага дзелавых касцюмаў. У аддзяленні мужчынскага штодзённага дзелавога касцюма будуць прадстаўлены наступныя экспанаты (у кампазіцыях) Адзенне:1 ) Штаны мужчынскія , класічныя - 2 шт.

2) Джынсы мужчынскія - 3 шт.
3) Пінжак класічны - 2 шт.
4) Джэмпер - 1 шт.
5) Кашуля мужчынская - 3 шт.
6) Тонкі світар з высокім горлам (вадалазка)

Абутак:1 ) Чаравікі мужчынскія , зімовыя - 2 шт.
2) Паўботікі мужчынскія , зімовыя - 1 шт.
3) Паўчаравікі мужчынскія , зімовыя - 1 шт.

Аксэсуары:1 ) Гадзіннік электронны , металічны - 1 шт.
2) Гадзіннік электронны , пластыкавы - 1 шт.

3) Гадзіннік механічны , металічны - 2 шт.
4) Рэмень мужчынскі , са спражкай храмаванай - 2 шт.
5) Акуляры, аправа сталёвая - 1 шт.

*Этыкетаж* (каля кожнага манікена)

1. **“Касцюм мужчынскі, строгі, паўсядзённы. Канец 20 стагоддзя”**. Штаны класічныя / пінжак класічны / кашуля мужчынская, аднатонная / чаравікі мужчынскія, зімовыя/ гадзіннік механічны, металічны / акуляры, аправа сталёвая.

**4. Прэзентацыя населеных пунктаў (выступленні дзяцей з дамашнімі прэзентацыямі).**

**5. Падвядзенне вынікаў, рэфлексія.**

## ТЭМА 2 “МУЗЕЙ УСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ”

**Мэта:** стварэнне ўмоў для пашырэння ведаў выхаванцаў аб асаблівасцях работы музеяў установ адукацыі.

**Задачы:** фарміраваць уяўленне дзяцей аб рабоце музеяў установ адукацыі;

пазнаёміць выхаванцаў з асновамі работы савета музея ўстановы адукацыі;

пашырыць пералік паняццяў, якія выкарыстоўваюцца ў музеязнаўстве.

**1. Тэст-гульня “Чацвёрты лішні”**

*Прапануеце дзецям тэст-гульню па тэме мінулага ўрока. Трэба ў кожным радку знайсці лішняе слова і растлумачыць, чаму так (словы звязаны з тэмай 1 акадэміі).*

**1. Цэнтральны, <u>краязнаўчы</u>, рэгіянальны, мясцовы** *(краязнаўчы не падпадае пад класіфікацыю музеяў па маштабу дзейнасці).*

2. **Дзяржаўны, прыватны, <u>піянерскі</u>, грамадскі** *(піянерскі не падпадае пад класіфікацыю музеяў па форме ўласнасці).*

3. **Рэспубліканскі, абласны, раённы, <u>даследчы</u>** *(даследчы не падпадае пад класіфікацыю музеяў па адміністратыўна-тэрытарыяльнай прыкмеце).*

**4. <u>Гарадскія</u>, даследчыя, навучальныя, асветніцкія** *(гарадскія не падпадаюць пад класіфікацыю па тыпах).*

*Яшчэ раз, пры неабходнасці, можна напомніць класіфікацыю музеяў.*

**2. Музей установы адукацыі.**

***Для выхавацеля:*** *размову пра музеі ўстаноў адукацыі пачынаем с таго, што сярод навучальных музеяў важнае значэнне маюць музеі ўстаноў адукацыі, і асабліва школьныя музеі, як аснова арганізацыі краязнаўчай работы ва ўстановах адукацыі. Звяртаем увагу, што дзейнасць школьных музеяў рэгламентуецца рознымі дакументам (Закон Рэспублікі Беларусь «Аб музеях і*

*Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь», ПАЛАЖЭННЕ аб прысваенні музеям, якія працуюць на грамадскіх пачатках, звання «Народны музей» і інш.)і, адным з якіх з'яўляюцца* ***Метадычныя рэкамендацыі аб дзейнасці музеяў устаноў адукацыі.***

**Далей знаёмім падлеткаў з асновамі дзейнасці музеяў устаноў адукацыі**.

***Інфармацыя па тэме***

2.1. Профіль музея

Сувязь музея з той ці іншай галіной навукі, тэхнікі, грамадскай вытворчасці абумоўлівае разнастайнасць музеяў. Музейная сетка устаноў адукацыі уключае наступныя асноўныя профільныя групоўкі музеяў:

*1.гістарычныя:*

а) ваенна-гістарычныя;

б) баявой славы;

в) гістарычныя шырокай тэматыкі;

г) гістарычныя канкрэтнай тэматыкі, у тым ліку:

гісторыя населенага пункта;

гісторыя школы, вучылішча, тэхнікума;

археалагічныя;

этнаграфічныя;

мемарыяльныя (прысвечаныя жыццю і дзейнасці славутасцей або гістарычнай падзеі).

*2. літаратурныя;*

*3.навукова-тэхнічныя* (прысвечаныя якой-небудзь галіне навукі і тэхнікі);

*4. мастацкія:*

мастацтвазнаўчыя;

прыкладнога мастацтва.

*5. прыродазнаўчыя:*

батанічныя;

заалагічныя;

антрапалагічныя;

геаграфічныя;

геалагічныя;

аховы прыроды.

комплексныя краязнаўчыя (музеі, якія маюць экспазіцыі па прыродзе, гісторыі, эканоміцы, культуры роднага краю).

***Заданне для дзяцей:*** *1.Паспрабуйце вызначыць профіль свайго школьнага музея або музея, які знаходзіцца ў вашым населеным пункце.*

*2. Паспрабуйце прывесці прыклады музеяў рознага профілю.*

2.2. Савет музея і яго дзейнасць

Ступень удзелу вучняў у арганізацыі музея можа быць рознай. Асноўную частку працы ажыццяўляе актыў – **Савет музея**. Але ён не павінен быць

замкнутым. Да працы абавязкова прыцягваюцца вучні, якія не ўваходзяць у яго лік.

У савеце музея павінны быць навучэнцы, адказныя за асобныя накірункі дзейнасці. У выніку ствараюцца **сектары**, якія маюць свае абавязкі.

**Сектар пошукавай працы** займаецца камплектаваннем фондаў, распрацоўкай маршрутаў вандровак і экспедыцый, падрыхтоўкай спецыяльнага абсталявання, палявых дакументаў, арганізацыяй заняткаў па вывучэнні методыкі выяўлення і збору помнікаў гісторыі, культуры, прыроды, іх апісання, уліку і захавання ў палявых умовах, запісу ўспамінаў, апавяданняў і г.д.

**Фондавы сектар** вядзе ўліковую дакументацыю, арганізуе захаванне помнікаў гісторыі, культуры, прыроды, кантроль за рэжымамі захавання экспанатаў, правядзенне рэстаўрацыйных работ, выраб макетаў і муляжоў, пастаноўку сапраўдных помнікаў гісторыі і культуры на дзяржаўны ўлік, перадачу асабліва каштоўных помнікаў у дзяржаўныя музеі, архівы і іншыя навуковыя і культурна-асветніцкія ўстановы.

**Сектар экспазіцый і выстаў** распрацоўвае тэматыка-экспазіцыйныя планы, займаецца адборам экспанатаў, падрыхтоўкай этыкетажу, мантажом экспазіцыі для школьнага музея і выстаў.

**Сектар экскурсаводаў** распрацоўвае і праводзіць аглядныя і тэматычныя экскурсіі, вучэбныя экскурсіі па прадметах школьнай праграмы.

**Сектар масавай і прапагандысцкай працы** арганізуе масавыя мерапрыемствы на базе музея, лекцыі, конкурсы малюнкаў, летапісаў; садзейнічае выкарыстанню музейных матэрыялаў у адукацыйным працэсе.

**Сектар перапіскі** наладжвае і падтрымлівае перапіску з рознымі ўстановамі і любымі людзьмі, з іншымі музеямі устаноў адукацыі і дзяржаўнымі музеямі.

Колькасць сектараў вызначаецца асноўнымі накірункамі дзейнасці. Могуць быць таксама створаны і іншыя сектары, напрыклад**, бібліятэчны, выкарыстання тэхнічных сродкаў** і інш.

Работа савета музея грунтуецца **на прынцыпах самакіравання** і ўдзел у яго працы з боку настаўнікаў больш зводзіцца да ролі інструктараў, кансультантаў.

***Заданне для дзяцей:*** *1.Назавіце, якія сектары створаны ў вашым школьным музеі? А якія сектары, акрамя вышэйназваных, вы б яшчэ стварылі?*

**3. Прэзентацыя населеных пунктаў, з якіх прыехалі дзеці.**

**4. Падвядзенне вынікаў, рэфлексія.**

## ТЭМА 3 “СТРУКТУРА РАБОТЫ Ў МУЗЕІ. ФОНДАВАЯ РАБОТА. ЭКСПАЗІЦЫЙНА-ВЫСТАВАЧНАЯ РАБОТА”

**Мэта:** азнаямленне выхаванцаў са структурай работы ў музеі.

**Задачы:** даць уяўленне аб фондавай і экспазіцыйна-выставачнай рабоце ў музеях;

пашырыць пералік паняццяў, якія выкарыстоўваюцца ў музеязнаўстве.

**1. Структура работы ў музеі**

**Пытанне дзецям:** Як вы думаеце, ці кожнае месца, дзе знаходзяцца нейкія музейныя прадметы, можна назваць музеем? Чаму?

*Тлумачыце дзецям, што Музей павінен адказваць наступным патрабаванням (інакш гэта называецца краязнаўчым пакоем ці кутком):*

наяўнасць ізаляванага памяшкання для экспазіцыі (не менш за 25 кв.м.) і фондасховішча;

наяўнасць калекцыі (не менш за 100 сапраўдных экспанатаў);

прысутнасць музейных форм работы (збор; ўлік і апрацоўка музейных прадметаў; абнаўленне экспазіцыі і выставачная дзейнасць; асветніцкая работа і г.д.).

*Звяртаем увагу на прысутнасць музейных форм работы.*

*Далей пералічваем асноўныя напрамкі дзейнасці музеяў.*

Асноўныя напрамкі дзейнасці музеяў:

навукова-даследчая работа;

фондавая;

экспазіцыйна-выставачная работа музеяў;

культурна-асветніцкая работа.

**2. Фондавая работа**

Збор усіх музеяў складаецца з ***асноўнага фонду*** (фонду музейных прадметаў) і ***навукова-дапаможнага фонду***.

Асноўны фонд уваходзіць у склад музейнага фонду краіны і лічыцца найбольш каштоўнай часткай збору музея.

*Яшчэ раз напомніце дзецям наступныя паняцці (можаце спытаць, хто назаве адрозненні паміж прадметам музейнага значэння, музейным прадметам і музейным экспанатам):*

*прадмет музейнага значэння* - помнікі гісторыі, якія прадстаўляюць інтарэс для музея, і якія могуць увайсці ў яго збор, але знаходзяцца ў сваім асяроддзі бытавання, што функцыянуюць у жыцця або якія захоўваюцца ў уладальнікаў;

*музейны прадмет* - помнік гісторыі, забраны з асяроддзя існавання і ўключаны ў склад музейнага збору пасля яго навуковай апрацоўкі;

*музейны экспанат* - музейны прадмет, выстаўлены для агляду.

*Звяртаем увагу дзяцей, што асноўны фонд фарміруецца толькі з музейных прадметаў.*

Да ***навукова-дапаможнага фонду*** адносяцца прадметы, якія не валодаюць уласцівасцямі музейных прадметаў, але якія дапамагаюць іх вывучэнню і экспанавання:

*розныя ўзнаўленні* (фотакопіі, злепкі, муляжы, макеты), копіі, рэканструкцыі, карты, дыярамы, схемы, планы, а таксама іншыя матэрыялы,

выробленыя ці набытыя музеем падчас камплектавання фондаў, вывучэння ці экспанавання музейных прадметаў;

*узоры сельскагаспадарчых культур, якія хутка псуюцца, і іншых натуральных матэрыялаў, схільных да псавання і патрабуючых частай замены*.

Аднясенне прадметаў да асноўнага ці навукова-дапаможнага фонду ў музеях устаноў адукацыі праводзіцца пры дапамозе спецыялістаў навукова-метадычных аддзелаў дзяржаўных музеяў (адпаведнага профілю). Нярэдка ў музейнай практыцы адзін і той жа прадмет можа быць аднесены як да навукова-дапаможнага, так і да асноўнага. ***Напрыклад***, макет будынка школы ў экспазіцыі па гісторыі населенага пункта адносіцца да дапаможнага фонду, а ў раздзеле «Гісторыя нашай школы» да асноўнага.

У некаторых выпадках магчымы пераход навукова-дапаможных матэрыялаў у асноўны фонд. Напрыклад, пры страце унікальнага прадмета копія набывае значэнне музейнага прадмета.

**3. Музейны прадмет і яго ўласцівасці**

Штодня мы з вамі сустракаемся са светам рэчаў, вакол сябе мы бачым мноства прадметаў, створаных чалавекам. Гэта прадметы, якія людзі выкарыстоўваюць у паўсядзённым побыце, розныя прыстасаванні, вельмі складаныя механізмы, а таксама прадметы, створаныя для задавальнення эстэтычных запатрабаванняў чалавека (у такім выпадку мы гаворым пра творы мастацтваў).

Кожны прадмет быў створаны ў пэўны прамежак часу, і кожны прадмет гэты час якімсьці чынам адлюстроўвае. Некаторыя прадметы з’яўляюцца своеасаблівымі сімваламі пэўнай эпохі, бо існавалі менавіта ў пэўны прамежак часу. Напрыклад, каменныя сякеры існавалі ў эпоху каменнага і бронзавага вякоў, шкляныя бранзалеты насілі жанчыны на Русі ў XI - XIII стагоддзях. Такім чынам, можна сказаць, што *музейны прадмет - гэта помнік матэрыяльнай культуры, які адлюстроўвае гісторыю, культуру чалавечага грамадства, асяроддзе пражывання чалавека.*

Якія бываюць музейныя прадметы? Адрозніваюць **тыпавыя, унікальныя і мемарыяльныя музейныя прадметы**.

Музейны прадмет, які адлюстроўвае тыповую з’яву і які валодае ўласцівасцямі, характэрнымі для вялікага ліку прадметаў, якія існуюць у цяперашні час, называецца **тыпавым музейным прадметам**. Прыкладам тыпавых прадметаў могуць служыць вырабы, зробленыя ў масавай колькасці на прадпрыемстве. Такі прадмет, які захоўваецца ў музеі нават у адзіным экзэмпляры, будзе тыпавым, так як у паўсядзённым жыцці існуюць ідэнтычныя яму прадметы. Тыпавымі будуць таксама прадметы, якія ўжо зніклі з паўсядзённага жыцця і ўяўляюць сабой тыповыя з’явы і захаваліся ў дастаткова вялікай колькасці. Напрыклад, такія прадметы, як духавыя прасы, драўляныя ступы, бязмены, андаракі і інш.

Калі прадмет, які адлюстроўвае тыповую з’яву, захаваўся ў адным або вельмі невялікім ліку, то ён **унікальны**, так як інфармацыя, якую ён нясе,

набывае характар выключнасці. Напрыклад, штодзённае сялянская вопратка 19 стагоддзя. У свой час гэта былі распаўсюджаныя прадметы, у цяперашні час - выключная рэдкасць. Рэдкія прадметы асаблівай каштоўнасці называюць яшчэ **рарытэтамі.** Іншыя прадметы ўяўляюць самі па сабе адметныя з’явы. Гэта творы выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва высокай мастацкай каштоўнасці і прадметы, якія нясуць асабліва каштоўную інфармацыю. Напрыклад, зробленыя з натуры выявы знакамітых падзей і асоб, помнікі старажытнай пісьменнасці і таму падобнае. Такім чынам, **унікальныя музейныя прадметы** - гэта прадметы, якія існуюць у цяперашні час у адзінкавых экзэмплярах або вельмі абмежаванай колькасці, і якія валодаюць асаблівай навуковай і культурнай каштоўнасцю.

Пэўнай разнавіднасцю унікальных прадметаў з'яўляюцца прадметы **мемарыяльныя.** Гэта прадметы, звязаныя з асабліва значнымі падзеямі, знакамітымі людзьмі і якія валодаюць асаблівай сілай эмацыйнага ўздзеяння. Да такіх прадметаў можна аднесці зброю, знойдзеную на поле бітвы, асабістыя рэчы вядомых палітычных, грамадскіх дзеячаў, вучоных, пісьменнікаў, мастакоў. Сярод іх вылучаюць асобную групу - рэліквіі. **Рэліквіі** - гэта мемарыяльныя прадметы, звязаныя з асабліва адметнымі падзеямі і якія валодаюць выключнай сілай эмацыйнага ўздзеяння, асабліва каштоўныя як памяць аб гістарычнай падзеі або знакамітым чалавеку.

*Зараз давайце разгледзім ўласцівасці музейнага прадмета. Падумаем, якімі якасцямі ён павінен валодаць.*

Кожны прадмет валодае такой уласцівасцю, як ***інфарматыўнасць***. Што гэта такое? Дапусцім мы глядзім на старадаўнюю газавую лямпу (можна выкарыстоўваць любы іншы прадмет). Якія пытанні ў нас узнікаюць? Хто і калі зрабіў гэты прадмет? У якой абстаноўцы ён знаходзіўся? З чаго ён зроблены? Каму ён належаў? Як яго выкарыстоўвалі і ці можна ім карыстацца зараз? Адказваючы на ўсе гэтыя пытанні, мы атрымліваем каштоўную інфармацыю пра мінулае, а сам прадмет становіцца рэчавай гістарычнай крыніцай. Бо кожны прадмет узяты не з якой-небудзь ізаляванай замкнёнай прасторы, а быў выраблены і існаваў у пэўным гістарычным працэсе. З гэтай уласцівасцю звязана вельмі важная і аб’ёмная работа, якая праводзіцца ў любым музеі. Перш чым прадмет будзе ўключаны ў музейны збор, трэба старанна яго вывучыць, скласці яснае ўяўленне пра яго.

Кожны прадмет мае пэўную форму, колер, будову, матэрыял, вагу, памер, фактуру. Усе гэтыя прыкметы ўласцівыя любому прадмету, але ў першую чаргу прыцягваюць нашу ўвагу такія прадметы, якія па сваіх прыкметах адрозніваюцца ад прадметаў, акружаючых нас кожны дзень. Здольнасць прыцягваць да сябе ўвагу - гэта адно з уласцівасцяў музейнага прадмета і называецца гэта ўласцівасць - **атрактыўнасць.**

Яшчэ адной з найважнейшых уласцівасцяў прадмета з'яўляецца яго **сапраўднасць.** Сапраўдны прадмет мае гістарычную каштоўнасць, з'яўляецца гістарычнай крыніцай. Рэч - гэта не толькі тое, што мы бачым, але і тое, што адчуваем да яе. Гэта пачуццё глыбокай павагі перад сведкам эпохі. Арыгінал заўсёды выклікае больш глыбокія пачуцці і перажыванні, чым яго дакладная копія. Вы толькі ўявіце, што тысячу гадоў таму хтосьці ляпіў гэты гаршчочак, выводзіў немудрагелісты ўзор на яго паверхні, потым абпальваў, затым у ім захоўвалі ежу, а потым разам з памерлым чалавекам апусцілі ў магілу, мяркуючы, што на тым свеце гэты прадмет будзе гэтак жа служыць гаспадару. Копіі не хапае такой праўдзівасці. **Копія** - гэта дакладнае прайграванне прадмета, але не сам прадмет.

Навошта патрэбныя копіі? Чым адрозніваецца копія ад падробкі? <u>Варыянты адказаў хлопчыкаў і дзяўчынак.</u> (Падробка - гэта копія, якая свядома выдаецца за арыгінал).

І тут мы ўжо закранулі яшчэ адну ўласцівасць музейнага прадмета- яго здольнасць выклікаць хваляванне, пэўныя эмоцыі. Гэта ўласцівасць называецца **экспрэсіўнасць**. Уласцівасць звязана з нашымі разумовымі здольнасцямі, нашым уяўленнем і светам эмоцый.

Давайце разам успомнім, што з прадметаў, якія вы ўжо бачылі ў музеях, вам запомнілася, і якое яны зрабілі на вас уражанне. (Выхаваўцы прыводзяць свае прыклады).

**4. Экспазіцыйна-выставачная работа музеяў**

На падставе музейных фондаў будуюцца пастаянныя экспазіцыі і выставы (часовы паказ).

***Экспазіцыя*** - размяшчэнне ў музейных і выставачных залах або на адкрытым паветры па пэўнай сістэме помнікаў гісторыі, мастацкіх твораў і розных дапаможных матэрыялаў.

Існуюць розныя метады пабудовы музейнай экспазіцыі. Найбольш распаўсюджанымі лічацца ***тэматычны, сістэматычны, ансамблевы.*** Выкарыстанне іх залежыць ад профілю музея, яго мэтаў, задач, зместу, экспазіцыі.

У <u>*тэматычнай*</u> экспазіцыі ўсе з'явы і працэсы падпарадкоўваюцца храналагічнаму ці праблемнаму прынцыпу і адлюстроўваюцца ў дыялектычным развіцці. Пры такой будове экспазіцыі экспазіцыйныя комплексы аб'ядноўваюцца ў падтэмы, тэмы, раздзелы. Найбольш прымальна менавіта такое размяшчэнне ў прыродазнаўчых, літаратурных, краязнаўчых і іншых музеях.

<u>*Сістэматычная*</u> экспазіцыя дазваляе дэманстраваць калекцыю аднародных прадметаў. Гэты метад часцей выкарыстоўваецца ў прыродазнаўчых музеях. Напрыклад, калекцыя мінералаў ці раслін (гербарый) дэманструецца ў адпаведнасці з навуковай сістэматыкай, прынятай у мінералогіі ці батаніцы. Магчыма выкарыстанне сістэматычнага метаду пры

пабудове тэматычных выстаў ці раздзелаў нумізматыкі, баністыкі, керамічных вырабаў, дзе прасочваецца змяненне іх стыляў і г.д.

У _ансамблевай_ экспазіцыі захоўваюцца ці ўзнаўляюцца на дакументальнай падставе абставіны, звязаныя з гістарычнымі падзеямі, культурай, побытам народа, жыццём і дзейнасцю выдатнай асобы (напрыклад, інтэр’ер). Найбольш прымальны гэты метад для гістарычных і мемарыяльных музеяў.

***У стварэнні экспазіцыі музея можна вылучыць некалькі этапаў:***

_распрацоўка тэмы_ - вызначэнне асноўных задач экспазіцыі, стрыжнёвых вядучых тэм, апорных экспанатаў;

фарміраваць уменні даваць эканоміка-геаграфічную характарыстыку краю.

### 1. Гаспадарчая дзейнасць як аб'ект краязнаўства.

Пры вывучэнні гаспадаркі разглядаецца ўся сістэма галін, уваходзячых у сферу матэрыяльнай і нематэрыяльнай вытворчасці, якія атрымалі развіццё ў краі (сяле, горадзе, раёне, вобласці).

Галіны народнай гаспадаркі аб'ядноўваюцца ў міжгаліновыя комплексы – аб'яднанні галін гаспадаркі, звязаных адзінай мэтай развіцця (паліўна-энергетычны, машынабудаўнічы, хімічны, лясны, аграпрамысловы, будаўніча-прамысловы, сацыяльны, транспартны).

Краязнаўчае вывучэнне гаспадаркі прадугледжвае высвятленне і характарыстыку міжгаліновых комплексаў і галін, якія ўваходзяць у яго, узроўню іх развіцця і значэння ў эканоміцы краю.

Узровень развіцця галіны ***прамысловасці*** характарызуецца якасна-колькаснымі паказчыкамі (аб'ём, асартымент выпускаемай прадукцыі, паказчыкі асноўных фондаў, прадукцыйнасць працы, выкарыстанне сыравінных, водных энергетычных рэсурсаў, сабекошт, знешнія эканамічныя сувязі і інш.).

Для ***сельскагаспадарчай вытворчасці*** асноўнымі колькаснымі паказчыкамі з'яўляюцца плошчы, занятыя пад раллю, сенажаці, пашы, балоты і асобныя сельскагаспадарчыя культуры; пагалоўе жывёлы, колькасць сельскагаспадарчай тэхнікі, паказчыкі выкарыстання ўгнаенняў (якаснымі паказчыкамі з'яўляюцца: ураджайнасць сельскагаспадарчых культур, лугоў, надоі малака на адну карову, сутачнае прыбаўленне, сабекошт прадукцыі і інш.).

Развіццё ***транспарту*** ў раёне вызначаецца працягласцю чыгуначных, аўтамабільных, суднаходных водных шляхоў зносін, іх шчыльнасцю на адзінку плошчы, аб'ёмам і складам перавозімых грузаў і пасажыраабароту, колькасцю выкарыстоўваемых транспартных сродкаў і інш.

Для галін **невытворчай сферы** асноўнымі паказчыкамі з'яўляюцца: склад і памер сеткі ўстаноў (лік школ і спецыяльных навучальных устаноў, клубаў, кінатэатраў, бібліятэк, крам, сталовых, бальніц, паліклінік, аддзяленняў сувязі); аб'ём выконваемых імі работ.

Важным паказчыкам для ўсіх галін народнай гаспадаркі з'яўляецца *колькасць занятых у іх працаўнікоў* (усяго; доля да ўсіх якія працуюць у гаспадарцы і г.д.).

Значэнне галіны ў эканоміцы краю вызначаецца ўстанаўленнем яе *ўдзельнай вагі ў агульным аб'ёме вытворчасці* краю і кошту выпускаемай прадукцыі або радыусу абслугоўвання (санаторый, курорт, турысцкі цэнтр і інш.).

Галіны народнай гаспадаркі цесна звязаныя паміж сабой. Так, сельская гаспадарка забяспечвае галіны прамысловасці сыравінай, а прамысловасць пастаўляе сельскай гаспадарцы хімічныя ўгнаенні, сродкі абароны раслін, сельскагаспадарчую тэхніку, абсталяванне для ферм і г.д. Многія прадпрыемствы пастаўляюць сваю прадукцыю не толькі ў межах краю, рэгіёну, краіны, але і ў іншыя краіны. **Выяўленне сувязяў і характару размяшчэння гаспадаркі з'яўляецца важнай задачай яго краязнаўчага вывучэння.**

Пры вывучэнні эканомікі краю неабходны **гістарычны** падыход. Вывучаецца не толькі сучасны стан гаспадаркі, але і прычыны ўзнікнення прадпрыемстваў, іх рост, змена, перспектывы развіцця і інш.

У **эканоміка-геаграфічную характарыстыку краю** мэтазгодна ўключыць наступныя пытанні:

*эканоміка-геаграфічнае становішча краю* (у адносінах да іншых тэрыторый, прамысловых цэнтраў, вузлоў, выкарыстоўваемых прыродных рэсурсаў, транспартных шляхоў);

*развіццё гаспадаркі*, вядучыя галіны, якія вызначаюць спецыялізацыю, структурныя зрухі ў эканоміцы краю, новыя формы гаспадарання;

*прамысловасць*, яе склад і развіццё; важнейшыя прамысловыя прадпрыемствы, іх сыравінная і энергетычная база, тэхналогія вытворчасці, тэхніка-эканамічныя паказчыкі, энергазабеспячэнне краю, размяшчэнне прамысловасці;

*сельская гаспадарка*, яго развіццё і спецыялізацыя, склад АПК, сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, маштабы іх вытворчасці, спецыялізацыя, ураджайнасць, якасныя паказчыкі жывёлагадоўлі, тэхнічнае забеспячэнне сельскай гаспадаркі, меліярацыя;

*транспарт,* яго віды, транспартная сетка і яе канфігурацыя, асноўныя напрамкі грузавых і пасажырскіх патокаў;

*развіццё сувязі*, тэлефанізацыя, радыёвяшчанне і тэлебачанне;

*гандлёвая сетка* і рознічны тавараабарот, мясцовыя нарыхтоўкі, сетка грамадскага харчавання;

*жыллёвае будаўніцтва, газазабеспячэнне і добраўпарадкаванне*;

*развіццё мясцовага пасажырскага транспарту;*

*медыцынскае абслугоўванне насельніцтва і сетка медыцынскіх устаноў;*

*развіццё ўстаноў адпачынку і турызму, іх размяшчэнне;*

адукацыя, сетка навучальных устаноў, іх профіль;

*развіццё ўстаноў культуры* - клубаў, бібліятэк, музеяў, тэатраў, кінатэатраў;

*развіццё фізічнай культуры і спорту*, спартыўных збудаванняў;

*перспектывы развіцця краю, новыя формы гаспадарання.*

2. **Выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій у краязнаўчай рабоце**

***Інфармацыйныя тэхналогіі*** (ІТ, ад англ. Information technology, IT) - шырокі клас дысцыплін і абласцей дзейнасці, якія адносяцца да тэхналогій стварэння, захавання, кіравання і апрацоўкі дадзеных, у тым ліку з прымяненнем вылічальнай тэхнікі. У апошні час пад інфармацыйнымі тэхналогіямі часцей за ўсё разумеюць камп’ютарныя тэхналогіі. У прыватнасці, ІТ маюць справу з выкарыстаннем камп’ютараў і праграмнага забеспячэння для стварэння, захоўвання, апрацоўкі, абмежаванні да перадачы і атрымання інфармацыі.

У цяперашні час назіраецца тэндэнцыя павелічэння цікавасці да краязнаўства не толькі ў асяроддзі спецыялістаў дадзенай вобласці дзейнасці, але і прадстаўнікоў сумежных прафесій, а таксама насельніцтва ў цэлым. Але, нягледзячы на гэта, асноўнымі сацыяльнымі інстытутамі, уключанымі ў краязнаўчую дзейнасць, застаюцца музеі, бібліятэкі, школа.

Дзейнасць сучасных школ, музеяў і бібліятэк ужо не ўяўляецца без выкарыстання новых інфармацыйных тэхналогій, якія дазваляюць палегчыць доступ да неабходнай краязнаўчай інфармацыі. Інфармацыйныя тэхналогіі дазваляюць ажыццяўляць доступ да краязнаўчай інфармацыі большай колькасці абанентаў, выкарыстоўваць краязнаўчыя інфармацыйныя рэсурсы з найбольшай паўнатой і выгодамі.

Асноўнымі ***краязнаўчымі электроннымі рэсурсамі*** з'яўляюцца:

*краязнаўчыя электронныя каталогі;*

*краязнаўчыя базы дадзеных (бібліяграфічныя і паўнатэкставыя);*

*краязнаўчыя электронныя бібліяграфічныя і даведачныя выданні;*

*электронныя версіі друкаваных краязнаўчых дакументаў;*

*электронныя фактаграфічныя краязнаўчыя звесткі;*

*спасылкі на краязнаўчыя рэсурсы ў Інтэрнэт.*

Галоўным краязнаўчым электронным рэсурсам бібліятэк з'яўляецца ***электронны каталог.*** У ім адлюстроўваюцца ўсе віды дакументаў, якія паступаюць у бібліятэчную сістэму:

кнігі, у тым ліку рэтраспектыўны фонд краязнаўчай тэматыкі бібліятэк сістэмы;

артыкулы з усіх мясцовых перыядычных выданняў за апошнія гады; карты, паштоўкі, відэафільмы, аўдыёкасеты, кампакт-дыскі, поўныя тэксты дакументаў.

Электронны каталог бібліятэкі - гэта аснова для далейшага стварэння ўсіх краязнаўчых электронных рэсурсаў.

На аснове файлаў поўных тэкстаў краязнаўчых дакументаў у інфармацыйных службах бібліятэк падрыхтаваны новы від інфармацыйнай прадукцыі - дайджэсты. **Дайджэст** - гэта «сплаў» фрагментаў тэкстаў з розных крыніц інфармацыі па пэўнай тэме, што дае магчымасць карыстальніку з мінімальнымі выдаткамі часу, задаволіць свой запыт. Асноўная задача дайджэста заключаецца ў абагульненні і сістэматызацыі ўжо апублікаваных у іншых выданнях матэрыялаў. Стварэнне дайджэстаў дае магчымасць пашырыць і папоўніць свае краязнаўчыя рэсурсы актуальнай, патрэбнай карыстальніку інфармацыяй.

Не рэдкія ў практыцы выпадкі, калі патрэбная інфармацыя знаходзіцца ў розных крыніцах, звесткі адрывачныя або дапаўняюць адзін аднаго. У такой сітуацыі дайджэст незаменны: карыстацца ім будзе зручна і бібліятэкару і чытачу.

Электронныя рэсурсы па краязнаўстве на ***Web-старонках*** прадстаўлены шматаспектна, перш за ўсё праз электронныя каталогі. Поўныя тэксты краязнаўчых дакументаў і поўныя тэксты дайджэстаў даступныя ў розных раздзелах сайтаў бібліятэк. Юныя краязнаўцы пры выкананні пошукавай і даследчай працы могуць выкарыстоўваць Інтэрнэт як крыніцу інфармацыі па тэме, якая распрацоўваецца.

Пры *афармленні* краязнаўчых прац таксама можна выкарыстоўваць ІТ: афармленне мультымедыйных справаздач, дакументальных фільмаў і г.д.

**3. Прэзентацыя населеных пунктаў і школ.**

**4. Падвядзенне вынікаў, рэфлексія.**

ДАДАТАК 3

# СЦЭНАРЫІ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ
# У РАМКАХ ЗМЕНЫ

## СЦЭНАРЫЙ СВЯТА АДКРЫЦЦЯ ЗМЕНЫ
## “Я РОДНЫМ КРАЕМ ГАНАРУСЯ!”

**Мэта:** стварэнне ўмоў для эмацыянальнага знаёмства выхаванцаў з ідэяй і асноўнымі мерапрыемствамі змены.

**Месца правядзення:** кінаканцэртная зала

Ход мерапрыемства

*Прыглушаны свет. Зачынены чырвоны занавес.*
*Гучыць музыка, адчыняецца занавес, на сцэне стаяць чатыры хлопцы, апранутыя ў касцюмы розных эпох*

Хлопец 1
Я — беларус, я нарадзіўся
На гэтай казачнай зямлі,
Дзе між лясоў і пушчаў дзікіх
Адвеку прашчуры жылі.
Хлопец 2
Я — беларус, я ганаруся,
Што маю гэтае імя:
Аб добрай славе Беларусі
У свеце знаюць нездарма!
Хлопец 3
Я — беларус, і я шчаслівы,
Што маці мову мне дала,
Што родных песень пералівы
І зблізку чую, і здаля.
Хлопец 4
Я — беларус, і хоць сягоння
Яшчэ малы, але скажу:
Я родам з племя непакорных
І прад бядой не задрыжу!..

*(хлопцы выходзяць*
*Музычны нумар (“Ладушки” – “Мая Беларусь”)*
*Выходзяць вядучыя (хлопчык і дзяўчынка)*

**Вядучы1.**Добры вечар, паважаныя сябры!

**Вядучы2.**Добры вечар, новыя жыхары цудоўнай краіны дзяцінства “Зубронак”!

**Вядучы1.** Мы рады вітаць у гэтай зале ўдзельнікаў змены “Я родным краем ганаруся”.

**Вядучы-2.** Змены, якая сабрала разам актывістаў музеяў устаноў адукацыі.

**Вядучы -1.** Усіх тых, хто стаў фіналістам конкурсу дзіцячых навукова-даследчых праектаў “Я родным краем ганаруся”.

**Вядучы-2.** Мы вітаем усіх прысутных на ўрачыстым адкрыцці змены!

*(Музычны нумар “Экшн” – “Бульба”)*

*(Выходзяць “князь” і “княгіня” са світай)*

**Князь.** На працягу ўжо вось як тысячагоддзя жыве наш народ на сваёй зямлі. За гэтыя стагоддзі, што пранесліся над ёю, народ наш здолеў вытрымаць шматлікія выпрабаванні, выжыць, захаваць і данесці да сваіх нашчадкаў нашу спадчыну – зямлю, яе багацце і непаўторную прыгажосць, веліч і мілагучнасць нашай мовы, разнастайнасць і своеасаблівасць духоўнай культуры.

**Княгіня.** Мы – продкі беларусаў, тыя пакаленні, якія стваралі нацыю, яе славу і добрае імя, пакідаем Вам свой вялікі і мудры запавет – берагчы і захоўваць гэтую спадчыну, якую выпакутавалі шматлікія пакаленні беларусаў, і перадаць яе вашым нашчадкам.

**Князь.** Трэба спазнаваць сваю краіну, сваю зямлю, мову нашых продкаў, іх традыцыі і звычаі. І тады род наш беларускі на зямлі не перарвецца, і будзе наша зямля і мова, і народ наш. І ў тым вялікі і сакральны сэнс жыцця.

*(“князь” і “княгіня” выходзяць)*
*(выходзяць вядучыя)*
*(на экране слайд “Я родным краем ганаруся”)*

**Вядучы-1.** Сёння ў «Зубронак» завіталі тыя, хто любіць свой родны край, пазнае яго дзівосныя па хараству куткі прыроды, даследуе яго гісторыю і культуру.Тыя, хто вандруе паміж блакітнымі азёрамі і стужкамі рэк, хто заглядвае ў дрымучыя лясы, каму неабыякавы бязмежныя прасторы палёў і лугоў.

**Вядучы-2.** Усяго на конкурс “Я родным краем ганаруся” было прадстаўлена больш за 500 работ у дзесяці намінацыях:

”Прыродная спадчына“;
”Невычэрпныя крыніцы гісторыі“;
”Знакамітыя землякі“;
”Маўклівыя сведкі гісторыі“;
”Родныя даты“;

”Тапаніміка родных мясцін“;
”Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася спадчына“;
”Скарбы мовы нашай“;
”Табе, Беларусь, нашы праца і талент“;
”Мы гэту вайну будзем помніць заўсёды“

*(пайшла музыка К.Слука “Белоруссия”,выхад з праектамі конкурсу (20 чалавек), на кожным праекце з адваротнага боку прымацаваны літары з выразу “Я родным краем ганаруся”, удзельнікі выстройваюцца на краі сцэны і пераварочваюць свае работы – атрымліваецца надпіс “Я родным краем ганаруся”*)

**Вядучы -1.** Удзельнікамі конкурсу сталі навучэнцы з усіх рэгіёнаў нашай краіны.

Лідарамі па колькасці дасланых работ сталі **Гомельская вобласць** і **Гродненская вобласць**.

**Вядучы-2.** На фінал запрошаны аўтары 135 работ. На працягу змены пройдзе абарона праектаў і вызначацца пераможцы ў кожнай намінацыі. Пераможцы конкурса будуць узнагароджаны дыпломамі цэнтра.

**Вядучы-1.** І кожны пераможца ўпэўнена можа сказаць **“Я родным краем ганаруся”**

*(Дзеці спускаюцца ў залу, Выходзяць вядучыя)*

**Вядучы-3.** З легендаў і казак былых пакаленняў,
З калосся цяжкога жытоў і пшаніц,
З сузор’яў і сонечных цёплых праменняў
З грымучага ззяння бурлівых крыніц,
**Вядучы-4.** З птушынага шчэбету, шум дубровы,
І з гора і з радасці і з усяго
Таго, што лягло назаўсёды ў аснову
Святыні народа, бяссмерця яго, -
Ты выткана, дзіўная родная мова.

**Вядучы-3.** Перадача жыццёвага вопыту ад пакалення да пакалення, стварэнне маральна-практычнай філасофіі, вобраза маральных якасцяў, уласцівых беларусу – ўсё гэта адбываецца праз нашу родную мову.

**Вядучы-4.** Мова гэта найвялікшы скарб, які пакінулі нам былыя пакаленні. Вывучаючы нашу мову мы з вамі дакранаемся да самых крыніц народнай мудрасці, яднаемся з нашым мінулым і нашымі продкамі.

**Вядучы-3.** На працягу змены яе удзельнікі прымуць удзел у рэалізацыі модульнага праекта “Скарбы роднай мовы”, які дазволіць ім пашырыць свае веды па роднай мове.

**Вядучы-4.** А таксама паказаць практычнае валоданне ёй праз удзел у конкурсе агучкі “Новае гучанне.

**Вядучы-3.** Я прапаную паглядзець, як гэта зрабілі іншыя.

*(дэманстрацыя відэароліка "У лукоморья дуб зелёный" на беларускай мове)*

*(выходзяць вядучыя)*

**Вядучы-1.** 2015 год – з'яуляецца адметным. Мы адзначаем 70-годдзе Перамогі у Вялікай Айчыннай вайне, і каму як ні нам трэба захаваць памяць аб гэтай вайне і людзях, якія сваім жыццём заплацілі за мірнае неба ў нас над галавой.

**Вядучы-2.** Нам – гэта моладзі Беларусі, тым больш што 2015 год у нашай краіне указам Прэзідэнта аб'яўлены Годам моладзі.

**Вядучы-1.** Наша дзяржава удзяляе вялікую ўвагу падтрымцы моладзі.

*(пошел фоном видеоролик "Мы молодыя", реприза – "Мы - молодые")*

**Вядучы-2.** У цяперашні час прававая падтрымка моладзі ажыццяўляецца ў рамках 9 кодэксаў, 20 законаў, 40 указаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, больш за 100 пастаноў урада.

**Вядучы-1.** У Рэспубліцы Беларусь зарэгістравана **234 маладзёжныя і дзіцячыя грамадскія аб'яднанні**, якія ахопліваюць сваёй дзейнасцю больш за палову навучэнскай і працоўнай моладзі.

**Вядучы-2.** Для падтрымкі маладзёжнага грамадскага руху створаны **Рэспубліканскі рэестр маладзёжных і дзіцячых аб'яднанняў, якія карыстаюцца дзяржаўнай падтрымкай**, які налічвае цяпер **16** арганізацый і аб'яднанняў.

**Вядучы-1.** Самымі масавымі і вядомымі з'яўляюцца: Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі.

**Вядучы-2.** Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя.

**Вядучы-1.** Беларуская маладзёжная грамадская арганізацыя выратавальнікаў-пажарных.

**Вядучы-2.** Беларуская Асацыяцыя клубаў ЮНЕСКА.

**Вядучы-1.** Беларуская ліга інтэлектуальных каманд.

**Вядучы-2.** Ліга добраахвотнай працы моладзі.

**Вядучы-1.** Беларускі КВЗ.

**Вядучы-2.** Асацыяцыя беларускіх гайдаў.

**Вядучы-1.** Беларуская рэспубліканская скаўцкая асацыяцыя.

**Вядучы-2.** Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам.

**Вядучы-1.** І усё гэта - *(разам)* **моладзь Беларусі**.

*(музычны нумар "Ладушкі" – "Чаму ж мне не пець")*

**Вядучы-3.** История Беларуси богата на разные события.

**Вядучы-4.** Одним из признков европейскости белорусского государства многие считают наличие Магдебурского права.

**Вядучы-3.** Оно давало право городу на самоуправление и другие привелегии.

**Вядучы-4.** Участники смены "Я родным краем ганаруся" тоже могут реализовать своё право на самоуправление и попробовать силы в работе Ассоциации детских инициатив.

**Вядучы-3.** Они имеют на это полное право.

*( Реприза «Органы детского самоуправления)*
*(в соответствии со словами ведущих на сцену выходят дети в разноцветных майках и строят из кубиков домик)*

**Вядучы -1.** В таком случае, как ты считаешь, что объединяет друзей игры в «Зубренке»?

**Вядучы -2.** Ну, конечно же, **ПАЗЛ**–Позитивные Активные Заводные Лидеры.

**Вядучы-1.** А кто в центре научит многому, разнообразит наш досуг?

**Вядучы -2.** Совет «**СаЛюТ**» -самообъединение любителей творчества.
**Вядучы -1.** Девиз **ЕЖиК**ов - Единство жизни и креатива.

**Вядучы -2.** Самые смелые, самые стойкие, ходят на лыжах, ходят на лодках.

**Вядучы -1.** А это Глобусик или наши юные туристы.

**Вядучы -2.** Возьмемся за руки, друзья! И пусть нашим девизом будут слова:

К делам на благо Родины, к добру и справедливости, будь готов!

**Вядучы -1.ПЛАМЯ** - пионерский лидер активный, мыслящий, яркий. Временное объединение ОО «БРПО» в «Зубренке».

**Вядучы -2.** Самый популярный вид деятельности для сохранения здоровья пропагандируют **СОЮЗ** - спортивное объединение юных зубрят ?

**Вядучы -1.** Умников и умниц центра «Зубренок» чаще всего можно в встретить В Мэрии Города Познания?

**Вядучы -2.** Если ты танцуешь, если ты поёшь, сцены не боишься и хочешь научиться искусству мастерства, приходи, **БИС** ждет тебя?

**Вядучы -1.** СОЗВЕЗДИЕ - детское самоуправление лагеря "Звёздный".

**Вядучы -2.** Те, кто хочет сделать окружающий мир ярче, те, кто умеет мечтать и хочет быть полезным, ждет **АЛМАЗ** –временное объединение членов «БРСМ».

**Вядучы -1. Юпитер – Д** – Юные Психологи Исследуют Территорию Детства - наблюдают за настроением в отряде, проводят анкетирование, организовывают опрос общественного мнения участников смены

**Вядучы -2. Пресс-центр** – обеспечивает информационную связь между отрядами.

**Вядучы -1.** Все они разные, но всех объединяет одно – они представляют Ассоциацию детских инициатив! Их объединил наш дом – Национальный детский образовательно-оздоровительный центр «Зубренок!»

*(закрываецца зялёны занавес)*

*(музычны нумар песня "Сэрца Беларусі")*

**Вядучы-3.** Многа слаўных імён дала свету Беларусь.

**Вядучы-4.** Мы ганарымся тым, што нашымі землякамі з'яўляюцца.

**Вядучы-3.** Францыск Скарына і Еўфрасіньня Полацкая.

**Вядучы-4.** Кастусь Каліноўскі і Ігнат Дамейка.

**Вядучы-3.** Янка Купала і Якуб Колас.

**Вядучы-4.** Пётр Клімук і Уладзімір Кавалёнак.

**Вядучы-3**. Аляксандр Мядзведзь і Віталь Шчэрба.

**Вядучы-4.** А давай спытаем у залы, каго яны ведаюць з знакамітых сучаснікаў, якія сваімі поспехамі праславілі нашу краіну

**Вядучы-3.** (звяртаючыся ў залу) Назавіце, калі ласка!

*(слухаюць адказы, паўтараючы іх у мікрафон).*

**Вольга Корбут, Юлія Несцярэнка, Максім Мірны, Вікторыя Азаранка, Дар'я Домрачава, Аляксей Грышын, Сяргей Мартынаў, Руслан Салей, Жарэс Алфёраў, Аляксандр Рыбак, Ксенія Сітнік, Дмітрый Калдун і іншыя**

**Вядучы-4.** Пералічваць можна бясконца.

**Вядучы-3.** Канешне, гэта і чэмпіёны спорту, і вядомыя вучоныя, і знакамітыя дзеячы культуры, акцёры.

**Вядучы-4.** А як ты думаеш, хто будзе праслаўляць нашу Беларусь у будучым?

**Вядучы-3.** Мне здаецца, что удзельнікі конкурсу "Звонкая раніца" – абавязкова.

(*музычны нумар "Звонкай раніцы"*)

**Вядучы-1.** А што яшчэ цікавага чакае ўдзельнікаў змены?

**Вядучы-2.** Юныя музеязнаўцы будуць займацца ў Акадэмі музеязнаўства і на факультатыўных занятках "Краязнаўства", праводзіць даследчыя работы, наведаюць музеі, сустрэнуцца з знакамітымі краязнаўцамі і супрацоўнікамі музеяў і многае іншае.

**Вядучы-1.**Так… шмат цікавага чакаецца ў гэтай змене… Не давядзецца смуткаваць… Наадварот, ім давядзецца сумленна навучацца, каб пашырыць свае веды, шмат працаваць…

**Вядучы-2.** Будзе і магчымасць для творчай рэалізацыі – пройдуць конкурсы: конкурс агучкі "Новае гучанне", конкурс інсцэніроўкі "Легенда за легендай", конкурс "Дойлідства", "Фестываль мастацтваў", шоу-праграма "Міс Зубронак"

**Вядучы-1.** А пачнём мы з конкурсу карпусных слоганаў. Падрыхтаваліся?

**Вядучы-2.** Корпус "Сонечны горад"

**Вядучы-1.** Корпус "Зорны свет".

**Вядучы-2.** Малайцы!

**Вядучы-1.** Так, мне ўсё ясна! Змена будзе проста незвычайная, і на ёй прысутнічаюць такія энергічныя хлопчыкі і дзяўчынкі!

**Вядучы-2.** Але ж і прысутныя дарослыя таксама не ўступаюць сваім выхаванцам! А яшчэ - на працягу змены адважныя важатыя будуць ва ўсім дапамагаць хлопчыкам і дзяўчатам і рабіць іх жыццё разнастайным і цікавым!

**Вядучы-1.** Вясёлыя, яскравыя,
Як сонечны прамень,
Задорныя, рухавыя
Як сакавіцкі дзень,
Шаноўныя, сур'ёзныя,
Глядзяць на нас з табой -
Ужо амаль дарослыя,
З дзіцячаю душой,
Нібыта з казкі ўзятыя,
Чароўныя, як сны,
Ідуць, ідуць важатыя
Па сцежачках зямлі.

*(Выхад важацкага атраду)*

**Голас за кадрам:**«Зубронак» - сталіца дзяцінства,
«Зубронак» - край, дзе спаўняюцца самыя запаветныя жаданні!
«Зубронак» - месца, дзе становяцца яваю вясёлкавыя мары!

Па нотным стане музыка гуляе:
Без песні не пражыць нам аніяк!
І гальштук, нібы вогнішча, палае,
І танчыць над зямлёй Зубрацкі сцяг!
Гары, як зорка, і спявай аб міры,
Сваім святлом дзяцінства барані!
Хай не згасае вечны, верны, шчыры,
Надзейны сімвал шчасця й дабрыні! (А.Беланожка)

*(Зубрацкі сцяг)*

**Голас за кадрам:** Слова прадастаўляецца дырэктару нацыянальнага дзіцячага адукацыйна-аздараўленчага цэнтра "Зубронак" Ануфрыевай Надзеі Генадзьеўне.

**Прывітальнае слова дырэктара Нацыянальнага дзіцячага цэнтра "Зубронак" Надзеі Генадзьеўны Ануфрыевай.**

**Адбываецца ўрачысты вынас Флага Рэспублікі Беларусь.**

**Гучыць фінальная песня – "Белая Русь".**

**Рытуал "Калідор дружбы"**

# СЦЭНАРЫЙ ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ “НОВАЕ ГУЧАННЕ”

**Мэта:** ствараць ўмовы для згуртавання атрадаў і развіцця творчых здольнасцяў падлеткаў.

**Ход мерапрыемства.**

*Дэманструецца відэаролік (фрагмент фільма на беларускай мове).*

*Пасля яго заканчэння на сцэну падымаюцца 2 вядучыя.*

**В.1:** Добры вечар, дарагія сябры!

**В.2:** Добры вечар корпус “Сонечны горад”!

**В.1:** Сёння мы сабраліся ў гэтай зале для таго, каб паказаць свае творчыя здольнасці і крэатыў, сваё акцёрскае майстэрства і гумар.

**В.2:** А таксама і для таго, каб паказаць як мы можам аб’ядноўвацца для вырашэння розных задач.

**В.1:** А задача на сёння была наступная – скласці і прадэманстраваць новы варыянт агучвання фільмаў або мультфільмаў. Галоўная умова – яны павінны загучаць па-беларуску.

**В.2:** Акрамя гэтага будзе улічвацца:

**В.1:** Гумар.

**В.2:** Акцёрская гульня.

**В.1:** Адпаведнасць накладання галасоў на ігру акцёраў.

**В.2:** Удалы падбор сюжэту агучкі ў адпаведнасці з сюжэтам фільма.

**В.1:** Ацэньваць конкурс будзе журы, у склад якога ўвайшлі:

**В.2:** Аляксандр Віктаравіч Здановіч, педагог-арганізатар корпуса “Сонечны горад”

**В.1:** Валерый Мікалаевіч Шчамель, метадыст змены “Я родным краем ганаруся”.

**В.2:** А таксама дзіцячае журы, у склад якога ўвайшлі прадстаўнікі ўсіх атрадаў.

**В.1:** Журы прадстаўлена –можым пачынаць сам конкурс.

**В-2:** Як гаварыў Пауло Куэльо – шанец не бывае адзіным, жыццё абавязкова дасць яшчэ адзін.

**В-1:** Скажам так, для некаторых гэта шанец выступіць на нашай сцэне.

**В-1:** А для 2 сонечнага – магчымасць паехаць у “Зубронак”.

**В-2:** Сустракайце – 2 сонечны з агучкай фрагмента “Я паеду ў “Зубронак”.

*Выступленне 2 сонечнага*

**В-1:** Вядомы акцёр мінулага Дэйл Клоуз трапна заўважыў, што ў ваенным фільме трэба пазбягаць знаходжання ў адным акопе з персанажам, які не растаецца з фота сваёй дзяўчыны.

**В-2:** А што трэба рабіць, калі вы апынуліся Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры "Зубронак".

**В-1:** Магчыма адказ на гэта пытанне нам дасць 1 сонечны.

**В-2:** Вітаем іх на сцэне.

*Выступленне 1 сонечнага*

**В-1:** Знакаміты публіцыст Дэйв Бары пісаў, што якасць фільма адваротна прапарцыянальна колькасці верталетаў, якія ў ім задзейнічаны.

**В-2:** У фрагменце, які нам прадставіць 3 сонечны, вы не ўбачыце ні аднаго верталёта, таму якасць – гарантавана.

**В-1:** Вашай увазе "Першы дзень у "Зубронку".

*Выступленне 3 сонечнага*

**В-2:** Ведаеш, што у мастацкім творы ўсе дэталі павінны працаваць на яго галоўную ідэю, у ім не павінна быць нічога выпадковага.

**В-1:** Яшчэ Антон Чэхаў у адным з сваіх лістоў пісаў, што калі ў пачатку п'есы на сцяне вісіць стрэльба, то ў канцы п'есы яна павінна стрэліць.

**В-2:** А калі гэта індыйскі фільм, то ў фінале яно пачне танцаваць і спяваць.

**В-1:** А на сцэне 4 сонечны з фрагментам "Вячэрні агеньчык 4 сонечнага".

*Выступленне 4 сонечнага*

**В-1:** Мне здаецца, што нашы ўдзельнікі добра падрыхтаваліся і яны амаль не хвалююцца.

**В-2:** Вядомы акцёр Роберт Дэ Ніра выказаў думку, што зрабіць дрэнны фільм не лягчэй, чым зрабіць добры фільм.

**В-1:** 5 сонечнага гэта не датычыцца – бо ў іх усе атрымаецца добра.

**В-2:** Вашай увазе "Мадагаскар па-беларуску" ад 5 сонечнага.

*Выступленне 5 сонечнага*

**В-1:** Для знакамітага рэжысёра Альфрэда Хічкока адзіным спосабам пазбавіцца ад сваіх страхаў было зняць пра іх фільм.

**В-2:** 6 сонечны таксама хоча спаць спакойна.

**В-1:** І прадстаўляе вашай увазе фрагмент "Дзень за днём на шостым сонцы".

**В-2:** Сустракайце.

*Выступленне 6 сонечнага*

**В-1:** Кіно павінна прымушаць гледача забыцца пра тое, што ён сядзіць у кіно.

**В-2:** На маю думку ў 7 сонечнага гэта павінна атрымацца.

**В-1:** Тым больш, калі сюжэт апавядае пра "Зубронак".

**В-2:** Сустракайце 7 сонечны з урыўкам "Вяселае жыццё зубранят".

*Выступленне 7 сонечнага*

**В-1:** Вось і выступілі ўсе атрады – самы час даведацца пра тое, хто стаў пераможцам.

**В-2:** Гэта хутка стане вядома, а пакуль што вашай увазе невялікі відэаролік.

*Відэаролік "Прыказкі і прымаўкі"*

**В-1:** Мы запрашаем на гэтую сцэну журы для ўзнагароджвання пераможцаў.

*Узнагароджанне пераможцаў*

**В-1:** Вынікі падведзены, пераможцы ўзнагароджаны.

**В-2:** Самы час пачынаць падрыхтоўку да конкурса "Легенда за легендай".

**В-1:** Таму жадаем усім творчага натхнення.

**В-2:** І да сустрэчы.

## СЦЭНАРЫЙ ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ "ЛЕГЕНДА ЗА ЛЕГЕНДАЙ"

**Мэта:** ствараць ўмовы для згуртавання атрадаў і развіцця творчых здольнасцяў падлеткаў.

**Ход мерапрыемства.**

**В.1:** Добры вечар, дарагія сябры!

**В.2:** Добры вечар корпус "Сонечны горад"!

**В.1:** Мы рады ўсіх вітаць на конкурсе інсцэніраваных легенд "Легенда за легендай".

**В.2:** А чаму менавіта легенды абраны для інсцэніроўкі?

**В.1:** Яшчэ задоўга да таго, як мастацкае слова было зафіксавана ў помніках пісьменнасці, народ выяўляў свае настроі і думы ў песнях, казках, легендах і паданнях, якія былі першымі праявамі яго мастацкай творчасці.

**В.2:** Яны на працягу многіх гадоў і стагоддзяў свайго бытавання перадаваліся, станавіліся выдатнымі творамі мастацтва.

**В.1:** У іх адлюстроўваліся ўсе найважнейшыя асаблівасці народнага жыцця з самых далёкіх часоў: барацьба чалавека з прыроднай стыхіяй, яго мары, меркаванні, любоў да радзімы і нянавісць да ворагаў, глыбокі аптымізм.

**В.2:** І я думаю, што сённяшні конкурс дасць магчымасць нам убачыць усё гэта сваімі вачамі.

**В.1:** Вашай увазе будуць прадстаўлены легенды ў выкананні жыхароў корпуса "Сонечны горад".

**В.2:** А паколькі гэта конкурс, то выступленні будуць ацэньвацца па наступных крытэрыях.

**В.1:** Сцэнічная культура.

**В.2:** Мастацкі узровень выканання.

**В.1:** Акцёрскае майстэрства.

**В.2:** І колькасць акцёраў на сцэне.

**В.1:** А ацэньваць наш конкурс будзе журы, у склад якога ўвайшлі.

**В.2:** Аляксандр Віктаравіч Здановіч, педагог-арганізатар корпуса "Сонечны горад"

**В.1:** Валерый Мікалаевіч Шчамель, метадыст змены "Я родным краем ганаруся".

**В.2:** А таксама дзіцячае журы, у склад якога увайшлі прадстаўнікі кожнага атраду.

**В.1:** Журы прадстаўлена –можым пачынаць сам конкурс.

**В-2:** І мы сустракаем на сцэне 1 сонечны атрад з "Легендай аб люстэрку".

*Выступленне 1 сонечнага*

**В-1:** Нашы продкі падзялялі на добрых і злых не толькі жывыя істоты, але і прыродныя з'явы, дрэвы, расліны.

**В-2:** Не маглі яны нешта правільна растлумачыць, вось і баяліся яго, імкнуліся задобрыць паднашэннямі-ахвяраваннямі і "свядомым увядзеннем у ранг боствау".

**В-1:** Таму ў беларускіх легендах удзельнікамі падзей з'ўляюцца і камені, і дрэвы, і рачулкі.

**В-2:** А мы сустракаем нашых наступных удзельнікаў – 2 сонечны з легендай "Дуб і сасна".

*Выступленне 2 сонечнага*

**В-2:** Вусная народная творчасць – важнейшая частка духоўнай культуры народа – надзвычай добра захавалася не толькі ў памяці беларусаў, але і ў актыўным побыце, адыграла вялікую ролю ў нацыянальнай самасвядомасці, у развіцці літаратуры і мастацтва; яна плённа ўплывае і сёння на працэсы нацыянальнага адраджэння.

**В-1:** Многія з легенд і паданняў папулярныя і да гэтай пары.

**В-2:** Як, напрыклад, легенды пра Купалле.

**В-1:** І мы сустракаем на сцэне 3 сонечны з легендай "У ноч на Купалу".

*Выступленне 3 сонечнага*

**В-1:** Героямі легенд станавіліся і рэальныя гістарычныя асобы.

**В-2:** Так у беларускіх легендах знайшлося месца для Усяслава Чарадзея, Міхаіла Клеафаса Агінскага, Кастуся Каліноўскага і іншых вядомых людзей.

**В-1:** Магчыма, у далёкім будучым, будуць існаваць легенды і пра кагонебудзь з тых, хто знаходзіцца ў гэтай зале.

**В-2:** І іх таксама будуць інсцэніраваць.

**В-1:** А мы сустракаем 4 сонечны з легендай “Чорная панна Нясвіжа”.

*Выступленне 4 сонечнага*

**В-1:** Вусная народная творчасць народа заўсёды была невычэрпнай крыніцай ідэй, вобразаў, спосабаў мастацкага адлюстравання жыцця беларускага народа.

**В-2:** Цікава, а ці складаюцца легенды ў цяперашні час?

**В-1:** Магчыма адказ на гэта пытанне нам дасць 5 сонечны.

**В-2:** Вітаем іх на сцэне з легендай “Як утварылася зубрацкае кола”.

*Выступленне 5 сонечнага*

**В-1:** Найбольш распаўсюджаныя ў беларускім фальклоры легенды гістарычныя і тапанімічныя.

**В-2:** З вуснаў у вусны перадаваліся паданні аб асілках, якія нібыта некалі жылі на тэрыторыі сучаснай Беларусі і пакінулі пасля сябе старажытныя гарадзішчы ды велізарныя камяні з адбіткамі сваіх пальцаў ці рук.

**В-1:** Вядомы шматлікія паданні аб заснавані розных населеных пунктаў, паданні аб рэках, азёрах, урочышчах і нават асобных збудаваннях.

**В-2:** Такія паданні дапамагаюць глыбей пазнаць мінулае, перадаюць адносіны народа да розных падзей, яго любоў да сваёй зямлі.

**В-1:** А вашай ўвазе 6 сонечны з “Легендай пра возера Нарач”

*Выступленне 6 сонечнага*

**В-1:** Традыцыйная народная сімволіка, разнастайныя формы, пастаянныя эпітэты, метафары, параўнанні, асаблівасці кампазіцыі надаюць вуснай легендам спецыяльны каларыт.

**В-2:** Легенды адлюстроўвалі і ўслаўлялі барацьбу супраць прыгнёту, супраць іншаземных захопнікаў.

**В-1:** Многія легенды ствараліся і бытавалі пры пэўных акалічнасцях – у час свят, працы.

**В-2:** Яны дапамагалі ў выхаванні дзяцей, перадавалі новым пакаленням жыццёвы вопыт і мудрасць.

**В-1:** А ў нас ёсць магчымасць паглядзець інсцэніроўку наступнага атрада.

**В-2:** Сустракайце 7 сонечны з легендай “Адкуль пайшоў кентаўр”.

*Выступленне 7 сонечнага*

**В-1:** Вось і выступілі ўсе атрады – самы час даведацца пра тое, хто стаў пераможцам.

**В-2:** Гэта хутка стане вядома, а пакуль што вашай увазе наступны відэафрагмент.

*Відэаролік “Дзед” (“Беларусьфільм”)*

**В-1:** Мы запрашаем на гэтую сцэну журы для ўзнагароджвання пераможцаў.

*Узнагароджанне пераможцаў*

**В-1:** Вынікі падведзены, пераможцы ўзнагароджаны.

**В-2:** Конкурс "Легенда за легендай" паказаў, што спадчына нашага народа ў надзейных руках.

**В-1:** Жадаем усім творчага натхнення.

**В-2:** І да сустрэчы.

## СЦЭНАРЫЙ СВЯТА ЗАКРЫЦЦЯ ЗМЕНЫ "Я РОДНЫМ КРАЕМ ГАНАРУСЯ!"

Ход мерапрыемства

*Адчыняецца занавес, на экране караоке "Прошальная зубрятская"*
*Пасля выканання песні выходзяць вядучыя (хлопчык і дзяўчынка)*

**Вядучы-1.**Добры вечар, паважаныя сябры!

**Вядучы-2.**Добры вечар, жыхары цудоўнай краіны дзяцінства "Зубронак"!

**Вядучы-3.** Здаецца, толькі ўчора мы прысутнічалі на святе адкрыцця змены, а ўжо трэба падводзіць вынікі.

**Вядучы-4.** Вынікі таго, што зрабілі за гэтыя дні.

**Вядучы -1.** А успомніць ёсць што, бо кожны дзень быў насычаны рознымі мерапрыемствамі і падзеямі.

**Вядучы-2.** А колькі ўсяго было і незапланаванага – новыя знаёмствы, новыя сябры, новыя ўражанні.

**Вядучы-3.** Але хопіць размоў – давайце пачынаць.

**Вядучы-4.** Трэба крыху падрыхтавацца.

**Вядучы-1.**Ну а пакуль мы рыхтуемся - для вас ўсіх творчы нумар ад узорнага харэаграфічнага ансамбля "Ладушкі".

*(Музычны нумар)*

**Вядучы-1.**Трэба пачаць з асноўнага – конкурсу "Я родным краем ганаруся".

**Вядучы-2.**Пра конкурс можна гаварыць вельмі доўга.

**Вядучы-1.**А мы нікуды не спяшаемся, тым больш што кожны з прысутных у гэтай зале стаў яго удзельнікам.

**Вядучы-2.**Абарона праектаў у рамках конкурсу праходзіла ў адпаведнасці з намінацыямі, у якіх была заяўлены работы.

**Вядучы-1.**Асноўнымі крытэрыямі пры вызначэнні пераможцаў былі:

**Вядучы-2.** Сацыяльная значнасць праекта.

**Вядучы-1.**Раскрыццё тэмы.

**Вядучы-2.** Нагляднасць прадстаўлення.

**Вядучы-1.**Творчы падыход  пры прадстаўленні.

**Вядучы-4.** Як вынік – аўтары 17 праектаў адзначаны  дыпломамі III ступені, аўтары 15 праектаў – дыпломамі II ступені, аўтары 11 праектаў – дыпломамі I ступені .

**Вядучы-3.** І мы запрашаем пераможцаў конкурсу на нашу сцэну.

*Выхад уладальнікаў дыпломаў першай, другой і трэцяй ступені*

**Голас дыктара.** У намінацыях “Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася спадчына” і  “Мы гэту вайну будзем помніць заўсёды” было абаронена 52 работы, пераможцамі сталі аўтары 18 праектаў.

**Голас дыктара.** У намінацыях “Прыродная спадчына”, “Тапаніміка родных мясцін” і “Табе, Беларусь, наша праца і талент” было абаронена 20 работ, пераможцамі сталі аўтары 11 праектаў.

**Голас дыктара.** У намінацыях “Знакамітыя землякі”, “Родныя даты” і “Скарбы мовы нашай” было абаронена 19 работ, пераможцамі сталі аўтары 9 праектаў.

**Голас дыктара.** У намінацыях “Маўклівыя сведкі гісторыі” і “Невычэрпныя крыніцы гісторыі” было абаронена 17 работ, пераможцамі сталі аўтары 5 праектаў.

**Голас дыктара.** Для узнагароджвання пераможцаў конкурса мы запрашаем на сцэну дырэктара Нацыянальнага дзіцячага адукацыйна-аздараўленчага цэнтра “Зубронак” Надзею Генадзьеўну Ануфрыеву.

*Узнагароджванне пераможцаў*

**Голас дыктара.** Узнагароджваюцца пераможцы ў намінацыях “Маўклівыя сведкі гісторыі” і “Невычэрпныя крыніцы гісторыі”

**Голас дыктара.** Узнагароджваюцца пераможцы ў намінацыях “Знакамітыя землякі”, “Родныя даты” і “Скарбы мовы нашай”

**Голас дыктара.** Узнагароджваюцца пераможцы ў намінацыі “Прыродная спадчына”, “Тапаніміка родных мясцін” і “Табе, Беларусь, наша праца і талент”.

**Голас дыктара.** Узнагароджваюцца пераможцы ў намінацыях “Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася спадчына” і “Мы гэту вайну будзем помніць заўсёды”.

**Голас дыктара.** Віншуем пераможцаў конкурсу “Я родным краем ганаруся”. Запрашаем  усіх пераможцаў для фатаграфавання.

*(фатаграфаванне)*

**Голас дыктара.** Яшчэ раз шчырыя апладысменты пераможцам конкурсу.Сустракайце іх у зале!

*Музычны нумар*

**Вядучы-3.** А што яшчэ, акрамя конкурсу, было цікавага ў змене?

**Вядучы-4.** А цябе што болей цікавіць – творчыя, спартыўныя, інтэлектуальныя або забаўляльныя мерапрыемствы?

**Вядучы-3.** Давай пачнем са спорту.

**Вядучы-4.** На працягу змены ўсе тыя, хто любіць спорт, змаглі памерацца сваімі сіламі ў спаборніцтвах па шашках і шахматах, дартсу.

**Вядучы-3.** Па настольным тэнесе, баскетболе і валейболе.

**Вядучы-4.** Прыняць удзел у спартландыі і спаборніцтвах па плаванні.

**Вядучы-3.** Карацей, паказаць свае сілу і спрыт.

**Вядучы-4.** І мы запрашаем на гэту сцэну галоўнага суддзю спартыўных спаборніцтваў Андрэя Мікалаевіча Андрэева.

*Узнагароджванне самага спартыўнага атрада*

**Вядучы-3.**Для ўсіх аматараў актыўнага ладу жыцця наступны музычны нумар.

*Музычны нумар*

**Вядучы-1.** Тыя, для каго важна паказаць свае творчыя здольнасці, таксама не былі пакрыўджаны.

**Вядучы-2.** Стартынэйджар, конкурс агучкі “Нове гучанне” .

**Вядучы-1.** Фестываль мастацтваў, конкурс “Легенда за легендай”, шоу-праграма “Міс Зубронак”.

**Вядучы-2.** Не забываем і пра творчыя конкурсы ў атрадах.

*Выхад удзельнікаў конкурса Міс Зубронак*

**Вядучы-3.** Змена была не толькі цікавай, але і пазнавальнай.

**Вядучы-4.** Так яе удзельнікі прынялі удзел у рэалізацыі модульнага праекта “Скарбы роднай мовы”, які дазволіў ім пашырыць свае веды па роднай мове *(слайд).*

**Вядучы-3.** Модульны праект “Легенда за легендай” дазволіў бліжэй пазнаёміцца з легендамі беларускага народу як адлюстраваннем найважнейшых асаблівасцей народнага жыцця з самых далёкіх часоў*(слайд).*

**Вядучы-4.** А яшчэ - падрыхтавалі вучэбна-даследчыя работы, якія прадставілі на форуме “Вектар на будучыню”*(слайд).*

**Вядучы-3.** Адбыліся экскурсіі ў Нацыянальны гістарычны музей і Музей старажытнабеларускай культуры *(слайд).*

**Вядучы-4.** Сустрэліся з супрацоўнікамі Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў і Мядзельскага краязнаўчага музея*(слайд).*

*Закрываецца зялёны занавес*

*Песня “Рождается новый день”*

*Адкрываецца занавес – на сцэне домік самакіравання*

**Голас дыктара:** Участники смены "Я родным краем ганаруся" смогли реализовать своё право на самоуправление и попробовать силы в работе Ассоциации детских инициатив.

*(Реприза «Органы детского самоуправления»)*

**Голас дыктара:**

«**Салют**». В этой смене ребята организовали и провели мультипарк «Равный обучает равного»

«**Союз**». Проведены соревнования по волейболу.

**«Пресс – центр».** Ребята знакомили всех вас с самыми интересными новостями нашего центра.

Совет по туризму «**Глобусик**». Организовали игру по станциям «Узнаем всё о «Зубрёнке»

**«Юпитер – Д».** Юные психологи проводили тренинги и социальные опросы.

«**Мэрия города Познания**». В «Зубрятской» школе была организована и проведена неделя математики и организована работа кафе.

«**ЕЖиК**». Ребята организовали креативный конкурс «Лепота»!

**«Бис».** Был проведенконкурс озвучки и инсценировки легенд.

«**Пазл**». Разучили много новых и интересных игр.

«**Алмаз**». Ребята провели акцию «Чистый лес».

«**Пламя**». Была организована акция «За Беларусь»

«**Созвездие**». В Лагере «Звездный» 27января состоялся день самоуправления.

Все мы разные, но все мы были представителями Ассоциации детских инициатив! Нас объединял наш дом - НДЦ «Зубренок!»

*відэаролік з конкурсу агучкі "Новае гучанне"*

**Вядучы-1.** А цяпер традыцыйны конкурс карпусных слоганаў.

**Вядучы-2.** Корпус "Сонечны горад".

**Вядучы-1.** Корпус "Зорны свет".

**Вядучы-2.** Малайцы! Бачна, што вы сталі яшчэ больш дружнымі.

**Вядучы-1.** Мне здаецца, што карпусныя слоганы з'яўляюцца добрым прывітаннем для педагога-арганізатара корпуса "Сонечны горад", якія зараз падвядзе вынікі карпуснога спаборніцтва.

*Падвядзенне вынікаў спаборніцтваў*

*Музычны нумар*

**Вядучы-1.** Так, змена была незвычайная, бо на ёй прысутнічалі такія энергічныя хлопчыкі і дзяўчынкі!

**Вядучы-2.** Але ж і прысутныя дарослыя таксама не ўступалі сваім выхаванцам!

**Вядучы-1.**

И каждый час, и каждую минуту
О чьих-то судьбах вечная забота.
Кусочек сердца отдавать кому-то,
Такая у вожатых, брат, работа.

*(Выхад важацкага атраду)*
*(Зубрацкі сцяг)*

**Голас за кадрам**

Па нотным стане музыка гуляе:
Без песні не пражыць нам аніяк!
І гальштук, нібы вогнішча, палае,
І танчыць над зямлёй Зубрацкі сцяг!

Гары, як зорка, і спявай аб міры,
Сваім святлом дзяцінства барані!
Хай не згасае вечны, верны, шчыры,
Надзейны сімвал шчасця й дабрыні! (А.Беланожка)

**Голас за кадрам:** Слова прадастаўляецца дырэктару нацыянальнага дзіцячага адукацыйна-аздараўленчага цэнтра “Зубронак” Ануфрыевай Надзеі Генадзьеўне.

**Заключнае слова дырэктара Нацыянальнага дзіцячага цэнтра “Зубронак” Надзеі Генадзьеўны Ануфрыевай.**
**Адбываецца ўрачысты вынас Флага Рэспублікі Беларусь.**
**Гучыць фінальная песня – “Белая Русь”.**
**Рытуал “Калідор дружбы”**

# ЗМЕСТ

| | |
|---|---|
| Уводзіны | 3 |
| Інфармацыйная карта змены | 5 |
| Агульная ідэя змены | 7 |
| Праграма факультатыўных заняткаў “Краязнаўства” для VIII–IX класаў | 8 |
| Праграма факультатыўных заняткаў “Беларуская традыцыйная культура ў люстэрку мовы” для X класаў | 13 |
| Праграма заняткаў аб’яднання па інтарэсах “Акадэмія музеязнаўства” | 16 |
| Дзіцячае самакіраванне | 22 |
| Арганізацыйна-гульнёвы праект “Музей археалогіі” | 25 |
| Сістэма індывідуальнага росту “Млын” | 27 |
| Тэхналогія эмацыянальна-сімвалічнай аналогіі “Нумізмат” | 28 |
| Модульны праект “Легенда на кожны дзень” | 28 |
| Модульны праект “Скарбы роднай мовы” | 29 |
| Модульны праект “Мы – маладыя” | 29 |
| Мерапрыемствы змены | 30 |
| Дадатак 1 “Змена дзень за днём” | 31 |
| Дадатак 2 Матэрыялы да заняткаў аб’яднання па інтарэсах “Акадэмія музеязнаўства” | 83 |
| Дадатак 3 “Сцэнарыі мерапрыемстваў у рамках змены” | 118 |